КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 23 (1253) 4 чэрвеня 2016 г.

"К" інфармуе

Яркія зоркі краіны

31 мая ў Канцэртнай зале "Верхні горад" адбылася сустрэча намесніка Прэм'ер-міністра Беларусі Наталлі Качанавай з навучэнцамі, студэнтамі — пераможцамі міжнародных прадметных алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў, лаўрэатамі і стыпендыятамі спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў, студэнтаў і таленавітай моладзі.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Як адзначыла віцэ-прэм'ер, беларуская дзяржава, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка цягам апошніх дзесяцігоддзяў праводзяць маштабную палітыку па абароне правоў дзяцей і клапоцяцца пра інтарэсы юных грамадзян.

— У краіне створаны ўмовы для рэалізацыі інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу дзяцей і моладзі, — сказала ў сваім прывітальным слове Наталля Качанава. — Асаблівая ўвага надаецца адоранай і таленавітай моладзі, пра што сведчыць дзейнасць спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі і спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

Па словах намесніка Прэм'ер-міністра Беларусі, за 20 гадоў дзейнасці названых фондаў больш як 35 тысяч маладых людзей і 300 творчых мастацкіх калектываў сталі іх лаўрэатамі і стыпендыятамі. Сёння інтэграваны банк адоранай і таленавітай моладзі налічвае больш за 8 тысяч чалавек.

— Лаўрэаты спецыяльных фондаў маюць ільготы пры паступленні ў ВНУ, валодаюць правам ільгот пры будаўніцтве жылля, правам першачарговага размеркавання пасля заканчэння ВНУ, — канстатавала Наталля Качанава. — Летась на міжнародных інтэлектуальных спаборніцтвах юныя грамадзяне Беларусі заваявалі 41 медаль рознага кшталту. Таму таленавітая моладзь — гэта сапраўдны гонар краіны.

Пасля прывітальнага слова намеснік Прэм'ер-міністра Наталля Качанава ўручыла нагрудныя знакі "Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў" і "Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі".

У цырымоніі ўзнагароджвання таксама прынялі ўдзел міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў і міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Міхаіл Жураўкоў.

Заканчэнне — **на старонцы 3.**

Традыцыйна пачатак чэрвеня — час Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур — ужо адзінаццатага па ліку. А месцам канцэнтрацыі падзей стане гасцінны Гродна.

Фота Марка ХАРЛАМАВА з архіва "К"

Форум

Платна ці бясплатна-2: галоўнае пытанне "Ночы музеяў—2016"

У мінулым нумары "К" мы разважалі пра тое, ці патрэбна айчынным установам, якія ўдзельнічаюць у міжнароднай акцыі "Ноч музеяў", рабіць платным уваход на свае мерапрыемствы. Справа ў тым, што ў Еўропе, адкуль і цягнуцца "карані" названай падзеі, усе мерапрыемствы ў гэтыя дзень і ноч — бясплатныя для наведвальнікаў. Такім чынам музеі спрабуюць прыцягнуць увагу да сябе як з боку тых, хто ўвогуле не завітвае ў музейныя ўстановы, так і пашырыць кола сваіх сяброў ды аднадумцаў.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

У Беларусі ж, як вядома, сітуацыя адваротная. Вольны ўваход практыкуецца ў Міжнародны дзень музеяў 18 мая, а вось акцыя "Ноч музеяў" зазвычай праводзіцца на платнай аснове. Гэта робіцца, па-першае, з-за плана платных паслуг устаноў культуры, а па-другое, з-за камерцыйных выстаў ды запрошаных калектываў, працу якіх, зразумела, трэба аплаціць. Акрамя таго, варта ўлічыць той факт, што бясплатны ўваход прыцягнуў бы шмат людзей, а між тым будынкі айчынных музеяў проста не разлічаны на натоўпы наведвальнікаў і турыстаў. Таму грошы за білеты — гэта, можна сказаць, пэўная засцярога музейшчыкаў ды бяспека для тых, хто завітае на імпрэзу.

Але, што ні кажы, пытанні застаюцца. Каб не быць галаслоўнымі і не спасылацца толькі на асабісты суб'ектыўны погляд журналістаў, "К" патэлефанавала некаторым кіраўнікам рэспубліканскіх і раённых музеяў наконт пытання, вынесенага ў загаловак матэрыялу, а таксама ў Міністэрства культуры краіны. Меркаванні апытаных спецыялістаў атрымаліся рознымі, з чаго вынікае, што і ў музейнай супольнасці адзінага адказу на пытанне "Платна ці бясплатна" сёння не існуе…

Уладзімір ПРАКАПЦОЎ, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі:

— Па-першае, бясплатным ніколі нічога не бывае. Па-другое, бясплатнасць параджае утрыманцаў. Таму я — за платны ўваход у нашу ўстанову падчас "Ночы музеяў". Бо мы і так адчыняем свае дзверы для наведвальнікаў на бясплатнай аснове кожны месяц, а таксама ў Міжнародны дзень музеяў. У Еўропе ў Ноч музеяў робяць тое самае: адчыняюць дзверы — і ўсё. А мы падчас названай міжнароднай акцыі ладзім канцэрты, імпрэзы, арт-праекты і гэтак далей. Гэтага, паўтаруся, на Захадзе не робяць.

Усё мае сваю цану, ды і план платных паслуг у нас таксама ёсць. Таму аддаць за ўваход у музей 75 ці 100 тысяч ды, акрамя выставы, пабываць на цікавых мерапрыемствах, — гэта слушна. Да таго ж, кожны ведае: у "Ноч музеяў" да нас ідуць, у нас стаяць чэргі ў касы і на ўваходзе ва ўстанову культуры, і бывае, што не ўсе, хто хоча да нас патрапіць, можа гэта зрабіць.

І яшчэ адно. Без платы да нас будуць ісці ўсе, хто заўгодна. Між тым на платнае мерапрыемства, перакананы, прыйдуць толькі тыя, каму гэта цікава, тыя людзі, хто сапраўды жадае атрымаць асалоду ў гэты дзень і вечар. Вось чаму плата за ўваход у Нацыянальны мастацкі музей на "Ноч музеяў", мяркую, будзе заўсёды.

Заканчэнне — **на старонцы 6.**

Экспрэс-тур з V.I.P.-земляком: Салігорск

Набор вышыні, або За высокі "культурны" заробак трэба…

На радзіму нашага чарговага "віпа", у Салігорск, мы выправіліся з ранейшай мэтай — наведаць шэраг устаноў культуры горада, якія герой рубрыкі памятае з дзяцінства, даведацца пра яго ўспаміны ды пазнаёміцца з сучасным станам спраў у гэтых кропках. Але разам са мной і Аляксеем ГРОСАМ у канцы мая выехалі яго куратар па падрыхтоўцы да Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск-2016" XXV Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" Сяргей Андрыянаў ды здымачная група Белтэлерадыёкампаніі, якая вырашыла зрабіць рэпартаж аб знаходжанні беларускага канкурсанта ва ўлюбёных ім мясцінах.

Алег КЛІМАЎ,
Мінск — Салігорск — Мінск

Адным з такіх стаў аграгарадок Краснадворцы: з візіту да бабулі выканаўцы і пачалася наша "экспедыцыя". Таццяна Канстанцінаўна паказала нам свой падворак, і мы рушылі далей — непасрэдна ў горад.

Танцы на мяжы вясны

У Салігорскі палац культуры бацькі прывялі Аляксея, калі таму было 3 гады, аддаўшы сына ва ўзорны ансамбль танца "Іскрынка", якім тады кіравала Мая Хоміч. Два гады хлопчык правёў у гэтым калектыве, а затым перайшоў у ансамбль эстраднага танца да Галіны і Ігара Цемчыных. На адной з размінак малы атрымаў траўму, і яна не дазволіла з ранейшай інтэнсіўнасцю займацца харэаграфіяй далей. Затое падчас нейкага мерапрыемства ў школе (а Грос жыўчыкам застаецца і дагэтуль) Лёша трапіў на вочы выкладчыку ўдарных інструментаў з мясцовай Дзіцячай школы мастацтваў, куды другакласнікам і паступіў. Урэшце, да ДШМ мы пазней яшчэ вернемся, а пакуль у цэнтры ўвагі Палац. Дарэчы, у 5 класе Грос зноў апынуўся ў "Іскрынцы", дзе адчуваўся недахоп хлопчыкаў-танцораў. Тут Грос час ад часу і выступаў. (А адначасова выяўляў сябе і на барцоўскім дыване ў спартыўнай секцыі.) Карацей, было з чаго выбіраць! І 14-гадовым ён спыніўся на барабанах у Валянціна Матвеева ў эстрадным ("джазавым", як называе яго Грос) аркестры "Юнацтва Палесся" Палаца культуры. Але… нядоўга палачкі мільгалі.

— У маім доме спявалі ўсе, — распавядае Аляксей. — Тата быў выдатным музыкантам, дастаткова вядомым у горадзе. Пад яго гітару на ўсіх сямейных "зборах" я і спяваў. Але зусім іншая справа выступаць на публіцы. Мой дэбют у гэтым сэнсе адбыўся ў школе, калі я праспяваў "Ой, то не вечар». Узнагародай сталі высокія ацэнкі ад настаўніка. І любоўныя запісачкі ад аднакласніц. Вось тады я і зразумеў, што спяваю ніштавата. І пачаў "свяціцца" на школьных ды гарадскіх мерапрыемствах. А неяк убачыў у Палацы аб'яву аб вакальным конкурсе "Музычны форум". За гадзіну да першага тура паспеў "упісацца" ў лік яго ўдзельнікаў, выканаў "Чистые пруды" і прайшоў далей. У другім туры мне на гітары акампанаваў тата. Так я і дайшоў да фіналу. Мяне заўважылі ды прапанавалі паступіць у Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў на эстрадны вакал.

Заканчэнне чытайце **на старонках 10 — 11.**

22 — 23 ЧЭРВЕНЯ Ў МІНСКУ — V УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД

Прафесіяналізм і інавацыі

22 — 23 чэрвеня, як "К" пісала ўжо, у Мінску пройдзе пяты Усебеларускі народны сход. На абмеркаванне будуць вынесеныя пытанні аб выніках рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2011—2015 гады і аб асноўных палажэннях Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2016—2020 гады. Чакаецца, што ўдзельнікамі мерапрыемства стане прыкладна дзве з паловай тысячы чалавек з усіх куткоў краіны.

Наталля КУЧЫНСКАЯ, дэлегат Усебеларускага народнага сходу, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы



Як адзначыла ў гутарцы з карэспандэнтам "К" Наталля Кучынская, на маштабным рэспубліканскім мерапрыемстве абавязкова будуць прааналізаваны дасягненні Беларусі за гады суверэнітэту.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

— А дасягнулі мы сапраўды многага, хоць часам і не задумваемся аб гэтым, — адзначыла Наталля Кучынская. — Галоўнае наша дасягненне — гэта грамадская згода, мір і палітычная стабільнасць. Беларусь цвёрда стаіць на нагах і нацэлена на развіццё. Створаны моцны і трывалы фундамент — палітычны, заканадаўчы, эканамічны, сацыяльны. Слова "развіццё", мяркую, будзе адным з ключавых у выступленнях дэлегатаў Усебеларускага сходу.

У першую чаргу, па перакананні дэпутата, атрымаюць развіццё тэмы, узнятыя ў Пасланні Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту. Размова пойдзе і аб выкананні праграмы мінулай пяцігодкі, і аб задачах, якія стаяць у будучыні. У сувязі з гэтым асноўным дакументам абмеркавання стане Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2016—2020 гады, у якой вызначаны стратэгічныя мэты — занятасць, экспарт і інвестыцыі. На думку суразмоўцы, гаворка пойдзе не проста аб эканамічных задачах і сацыяльных пытаннях, але і аб тым, што ў аснове іх вырашэння ляжыць здольнасць кіраўнікоў — вялікіх ці малых прадпрыемстваў, школ мастацтваў ці дамоў культуры — мысліць шырока і глыбока, інавацыйна, крэатыўна, аналітычна: спачатку ідэя, мэта як вобраз жаданай будучыні, аналіз рэсурсаў і праблем, успрыманне праблем як асаблівых шанцаў, канкрэтныя крокі і рэфлексія.

— Думай глабальна — дзейнічай лакальна — прынцып паспяховых кіраўнікоў і людзей-прафесіяналаў, — упэўнена Наталля Кучынская. — Кожны з нас павінен вучыцца мысліць па-дзяржаўнаму, пераламляючы глабальныя стратэгічныя задачы праз асабістую прафесійную дзейнасць, у тым ліку, натуральна, і ў сферы культуры краіны, глядзець на іх скрозь прызму ўласнай грамадзянскай пазіцыі і ўсведамляць, што ў агульным развіцці краіны павінна быць і частка яго добрасумленнай працы.

Акрамя гэтага, на сходзе Наталля Кучынская чакае абмеркавання пытанняў аб сучасным развіцці сфер, якія фарміруюць найбагацейшы чалавечы капітал: аб адукацыі, задача якой падрыхтаваць прафесіянала для эканомікі ведаў, які ўмее вучыцца ўсё жыццё, аб павышэнні адказнасці і ролі сям'і ў выхаванні грамадзян; аб культуры і маральнасці…

— У нас, дэлегатаў, ёсць унікальная магчымасць — удзельнічаць у фарміраванні курсу развіцця краіны, — адзначыла візаві. — Разумею, што наперадзе ў мяне сур'ёзны абавязак: данесці інфармацыю да тых, хто даверыў быць дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу, і сваім асабістым прыкладам прадэманстраваць адказнае стаўленне да працы ці грамадскай дзейнасці.

К

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 4 277. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 3.06.2016 у 19.30. Замова 2278. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

У сучасным інфармацыйным віры лёгка заблукаць, асабліва моладзі, якая яшчэ не навучылася выбіраць з плыні найбольш важнае. Асабліва тое тычыцца гісторыі краю. Зрабіць яе больш даступнай, замацаваць візуальны вобраз у звязцы з інфармацыйнай насычанасцю дапамагае манументальная пластыка — маркер нацыянальнай памяці і культуры.

"Маркеры" і грошы на іх

Якія "персанальныя" помнікі з'явяцца неўзабаве

На здымках: такімі будуць помнікі Анастасіі Слуцкай, Эфраіму Севелу ды Станіславу Манюшку і Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу.

Настасся ПАНКРАТАВА

Месца пад сонцам

Адно з самых напоўненых пластыкай месцаў у Мінску з'яўляецца Верхні горад. Да чарговага дня нараджэння сталіцы для названай прасторы народны мастак краіны Леў Гумілеўскі рыхтуе скульптурную кампазіцыю, прысвечаную пісьменніку Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу і ягонаму сябру кампазітару Станіславу Манюшку. Па задуме аўтара, хутка два творцы размесцяцца на лаўцы ў скверыку ля Ратушы, драматург будзе чытаць суседу новы твор, а кампазітар задумвае новую партытуру. Прастора для ўсталявання абрана знакавая: акурат насупраць наноў адбудаванага гатэлю "Еўропа", на месцы якога некалі быў гарадскі тэатр, там і адбылася напрыканцы XIX стагоддзя прэм'ера оперы "Сялянка" за іх аўтарствам. Задума шыкоўная: на Плошчы Свабоды шпацыруюць турысты, з пачаткам сезону опэн-эйраў іх тут у разы пабольшае. Ды і мясцовым жыхарам не зашкодзіць аднавіць у памяці (а каму і ўпершыню пачуць) гісторыю дадзенага месца. Адно што: ваколіцы Ратушы і без таго насычаныя як манументальнай, так і гарадской скульптурай. І вельмі не хацелася б, каб пра гістарычны цэнтр Мінска склалася ўражанне, што ў адным пункце густа, а ў іншым — пуста….

Тым часам першы намеснік начальніка па пытаннях культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Святлана Баранок прывяла свежы прыклад таго, як гараджане прапанавалі папулярызаваць вобраз Анастасіі Слуцкай (помнік яе ўнучцы Сафіі ўжо не першы год радуе случчан). Не так даўно пра зямлячку, якая кіравала абаронай горада ў час нападу татар, ведалі амаль адны навукоўцы. Але пасля выхаду ў свет стужкі Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" тут з цікавасцю пачалі распытваць і пра Анастасію. Летась Міністэрства культуры краіны і Слуцкі райвыканкам правялі конкурс на лепшае скульптурнае ўвасабленне гістарычнай постаці. Пераможцам стаў член Беларускага саюза мастакоў Сяргей Аганаў. На стварэнне помніка выдаткавана 500 мільёнаў беларускіх рублёў, палову з якіх накіроўвае Мінкультуры.

Уважліва вывучалася месца ўсталявання помніка. З "ваколіцамі" хутка вырашыліся: фонам для фігуры стане былы ГДК, які цягам часу перабудуюць у Палац шлюбаў. Зразумела, скульптура павінна чытацца ў гарадскім ландшафце. Тут усё сышлося: цэнтр горада, непадалёк рэчка, значыцца, ля Анастасіі заўсёды будзе шматлюдна. З адкрыццём ЗАГСу фатаграфавацца на фоне новага твора стануць не толькі турысты, але і шматлікія вясельныя працэсіі. Добра давялося паламаць галаву, каб знайсці найбольш асветленую сонцам кропку, дзе на працягу дня можна было рабіць добрыя здымкі. Як запэўніла мяне Святлана Баранок, усе асноўныя пытанні ўжо вырашаны, і Анастасія Слуцкая павінна з'явіцца перад вачыма суайчыннікаў у верасні, калі Слуцк будзе ладзіць урачыстасці да 900-х угодкаў горада.

Быў ці не быў?

Звяртацца па параду да спецыялістаў — архітэктараў, гісторыкаў і краязнаўцаў, мастацтвазнаўцаў і дызайнераў — неабходна не толькі, каб вызначыцца з мастацкім рашэннем ці дакладна вызначыць месца пастаноўкі манументу. Улічваць іх меркаванне варта яшчэ на першай стадыі, калі заказчык выбірае персанаж для будучай работы. Каб не сталася раптам, што хацелі як лепш, а атрымалася, як атрымалася… У гэтай сувязі на розум прыходзіць помнік Аляксандру Неўскаму. Яшчэ ў 2009 годзе Віцебскі гарвыканкам зладзіў конкурс на лепшую выяву гэтага дзеяча. Тады перамаглі мясцовыя скульптары Аляксандр Гвоздзікаў і Іван Казак. Пасля да тандэму далучыўся сталічны скульптар Яўген Колчаў. Віцебскія чыноўнікі палічылі, што памяць князя можна ўшанаваць у Віцебску, бо ён вянчаўся са сваёй жонкай Аляксандрай у мясцовай Дабравешчанскай царкве. Але многія гісторыкі лічаць прыведзены факт не больш за прыгожую легенду… У выніку, некалькі гадоў на Плошчы Тысячагоддзя Віцебска красаваўся адзін толькі пастамент, на якім камунальнікі высаджвалі кветкі, а праект праходзіў шматлікія ўзгадненні. (Для параўнання: замоўленая ў тым жа 2009 годзе скульптура князя Альгерда мясцовага скульптара Валерыя Магучага ўрачыста падорана Віцебску яшчэ два гады таму). І ўсё ж помніку быць: па словах спецыяліста аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама Андрэя Бялецкага, зараз ідуць работы па яго мантажы. Заказчыкам скульптуры выступіла Віцебская гарадская жыллёва-камунальная гаспадарка.

На кім пакуль эканомім?

Дарэчы, Мінская вобласць багатая на разнастайныя скульптурныя праекты. За апошнія гады, напрыклад, у Мядзеле ўстанавілі першы ў краіне помнік народнаму паэту Беларусі Максіму Танку, у Заслаўі да Дня беларускага пісьменства-2014 адкрылі помнік Ізяславу-кніжніку. У Стоўбцах мараць, каб налета ў іх з'явіўся помнік Якубу Коласу. Не адстае Магілёўшчына: летась у Шклове апладзіравалі помніку вялікаму савецкаму акцёру, выхадцу з гэтых месцаў Пятру Алейнікаву. А ў Бабруйску напрыканцы чэрвеня акурат у дзень горада ля кінатэатра "Таварыш" адбудзецца ўрачыстае адкрыццё помніка земляку — пісьменніку, сцэнарысту і кінарэжысёру Эфраіму Севелу (які прысвяціў роднаму гораду кнігу "Легенды Інваліднай вуліцы"). Фінансуюць яго ўзвядзенне былыя бабруйчане, якія даўно перабраліся ў ЗША. Аўтарам пластычнага вобразу стаў мясцовы скульптар Іван Данільчанка.

На жаль, не ва ўсіх рэгіёнах (скажам, на Брэстчыне), парадавалі навінамі пра новую манументальную пластыку. Ва ўпраўленні культуры Гомельскага аблвыканкама галоўны спецыяліст аддзела мастацтва і аховы гісторыка-культурнай спадчыны Сяргей Разанаў распавёў пра падрыхтоўку мемарыяльнай дошкі маршалу Георгію Жукаву ў Мазыры, памятнага знака на Жыткавіччыне ў памяць аб загінулых у Вялікую Айчынную жыхарах вёскі Пагост (гэты праект фінансуецца аб'яднаннем "Беларусы Масквы", у склад якога ўваходзяць і выхадцы з дадзенага раёна). На стадыі перамоў адкрыццё мемарыяльнай дошкі Уладзіміру Караткевічу ў Рагачове на Дзень беларускага пісьменства ў верасні, але пакуль усё ўпіраецца ў грашовыя сродкі… Праз тое пытанне пра з'яўленне новых манументальных кампазіцый у гонар гістарычных постацяў на Гомельшчыне нават не стаіць…

К

Яркія зоркі краіны

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

— Дзякуючы дзейнасці спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі і спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў тысячы таленавітых дзяцей і падлеткаў становяцца вядомымі як дома, так і далёка за межамі нашай краіны, — адзначыў міністр культуры. — Вы ўжо амаль "зоркі", таму жадаю вам поспехаў, жадаю, каб на вашы выставы, канцэрты, імпрэзы заўсёды завітвалі ўдзячныя слухачы і гледачы, і каб вы плённа працавалі на карысць нашай краіны.

Віншуючы прысутных, міністр адукацыі Беларусі Міхаіл Жураўкоў, у сваю чаргу, адзначыў, што з ліку стыпендыятаў у краіне ўжо некалькі соцень тых, хто абараніў кандыдацкія дысертацыі, і амаль дзясятак тых, хто стаў дактарамі навук і прафесарамі.

— Сёння на першы план выходзяць веды, інавацыі, інтэлект, і ўплыў таленавітай моладзі на развіццё краіны як ніколі значны, — сказаў Міхаіл Жураўкоў. — Вельмі важна, каб веды і талент паслужылі краіне, каб імёны адораных і таленавітых маладых людзей былі яркай зоркай у жыцці краіны.

Фота аўтара К

Удзельнікі сустрэчы з Наталляй Качанавай.

Здымак на памяць з Барысам Святловым.

Беларуска з "чырвонай зямлі"

Пра складаны шлях свайго бацькі, а потым і усёй сям'і напісала нядаўна кнігу "Мае карані" этнічная беларуска Зянона Сабчук, якая нарадзілася ў Аргенціне ў 1936 годзе. Прэзентацыя адбылася на гэтым тыдні ў будынку Беларускага таварыства сяброўства і культурных сувязей з замежнымі краінамі.

Аліна САЎЧАНКА

Зянона Сабчук (злева) і яе дачка Сільвія. / Фота аўтара

90 гадоў таму беларускі хлопец з Баранавічаў Кастусь Сабчук пакінуў сваю радзіму і выправіўся ў Амерыку. Малады чалавек нават дакладна не ведаў, што Амерыка займае два кантыненты і ўключае ў сябе безліч краін, ён проста марыў пра міфічны Новы Свет. Зразумела, што такіх авантурыстаў вярбоўшчыкі лёгка падманвалі, і замест ЗША, якія ўяўляў Канстанцін, ён апынуўся ў Аргенціне. З Буэнас-Айраса ён з суайчыннікамі пераехаў у правінцыю Місьёнас і прыпыніўся ў мястэчку пад назвай Абэра. У той час гэта былі хутчэй субтрапічныя джунглі, чым камфортная для пражывання тэрыторыя. Для апрацоўкі кожнаму селяніну прадаставілі 25 гектараў зямлі. Чырвонай, а не звыкла чорнай. Яе Кастусь асвойваў без адзінага інструмента.

Па роду дзейнасці Зянона Канстанцінаўна, яго дачка, дыпламатычны работнік і грамадскі актывіст. У 1987 годзе яна ўпершыню прыехала ў Беларусь, пра якую чула толькі з аповедаў бацькі. Дзякуючы спадарыні Сабчук, а таксама згаданаму таварыству, наладжаны кантакты паміж дыяспарай і нашай краінай. Менавіта з падачы Зяноны Канстанцінаўны горад Маладзечна знайшоў сабе пабраціма — аргенцінскі Абэра. Гэтыя адносіны былі працягнуты ў 2008 годзе. У тым ліку з дапамогай беларускай дыяспары ў правінцыі Місьёнас быў зладжаны міжнародны праект "Полацкі абярэг". Яго арганізатар Ніна Ярмух і да гэтых часоў цёпла ўспамінае гэту акцыю і спагадлівасць Зяноны Сабчук.

Першай лацінаамерыканскай спявачкай на Міжнародным фестывалі мастацтва "Славянскім базары ў Віцебску" стала дачка Зяноны Сільвія, якая прыехала сюды ў 2002 годзе ў часы жудаснага эканамічнага крызісу ў Аргенціне. Але маці знайшла грошы для гэтага ваяжу. Гэтым разам, прымеркаваным да прэзентацыі кнігі "Мае карані", жанчыны ўзялі з сабой у Беларусь Вікторыю, дачку Сільвіі. Дзяўчына прызналася, што адразу закахалася ў Мінск.

Як вядома, больш за тры мільёны беларусаў раскідана сёння па свеце. І мала хто з іх з'яўляецца гэткай жа яркай персонай, як Зянона Сабчук, якая ў чэрвені адзначае сваё 80-годдзе.

К

З сезона ў сезон

Напрыканцы мая журналістаў запрасілі на незвычайную прэс-канферэнцыю ў Віцебскую абласную філармонію, прысвечаную закрыццю 27-га канцэртнага сезону. Яе асаблівасць у тым, што мас-медыя спачатку паклікалі на рэпетыцыю "Летняга балю ў казачным каралеўстве".

Гэтай праграмай завершыцца дзіцячы канцэртны сезон (апошнія спектаклі адбудуцца 4 і 11 чэрвеня). "Летні баль…" арыгінальны тым, што ў ім "змешаныя" ўсе казкі, пастаўленыя на сцэне за сезон, а салісты цягам дзеяння пераўвасабляюцца з аднаго вобраза ў іншы. Па словах галоўнага рэжысёра філармоніі Кацярыны Дыбаль, апошнія тыдні былі насычаны цікавосткамі. Прынамсі, прайшла прэм'ера для юных слухачоў "Са свету па нотцы". На сцэну выходзіў скрыпач і амаль без слоў — толькі праз музыку — распавядаў дзецям пра свет гукаў. "Для слухача такі ход быў неспадзяваным, але карысным для выхоўвання і навучання дзяцей", — падкрэсліла прамоўца. А ў Міжнародны дзень абароны дзяцей філармонія саступіла юнаму пакаленню вялікую сцэну. Тут выступалі ўдзельнікі нацыянальных і міжнародных конкурсаў з музычных навучальных устаноў горада.

Філарманічны сезон завяршыцца канцэртам на адкрытым паветры. 15 чэрвеня сімфанічны аркестр разам з салістамі выканае, сярод іншага, музыку з кінафільмаў і мюзіклаў. І хоць філармонія афіцыйна развітаецца з публікай на лета, праца творчых калектываў працягнецца. Прынамсі, на "Славянскім базары ў Віцебску" гараджане і госці фестывалю змогуць паслухаць не толькі заезджых "зорак". "12 ліпеня актэт балалаек "Віцебскія віртуозы" выступіць з праграмай "Музыка душы", 16 ліпеня гледача парадуе ансамбль танца, музыкі і песні "Талака", — праанансавала падзеі галоўны рэжысёр. Зараз жа ідзе падрыхтоўка да невельскіх Бахцінскіх чытанняў. Як запэўніла прамоўца, канцэрты памяці Марыі Юдзінай заўсёды запатрабаваны, яны маюць свайго слухача.

Падводзячы вынікі сёлетняга сезону, Кацярына Дыбаль ахарактарызавала яго як вельмі насычаны. Акрамя традыцыйных канцэртаў, ладзіліся незвычайныя праекты. Напрыклад, упершыню абласная філармонія супрацоўнічала з віцебскай Дзіцячай мастацкай школай № 1: для пастаноўкі "Казак PRO Бармалея" навучэнцы малявалі дэкарацыі. Такі вопыт аказаўся ўдалым. "Таксама мы працягваем узяты летась курс на тэатралізацыю выступленняў, імкнемся зрабіць іх больш тэматычнымі, звяртаемся да юбілеяў. Так, канцэрт на 9 Мая быў прысвечаны 110-годдзю з дня нараджэння Клаўдзіі Шульжэнка і 105-м угодкам Марка Бернэса. Таму і канцэрт да Дня пажылых людзей вырашылі зрабіць такога ж кшталту. Гэтым разам у аснову будзе пакладзены юбілей Ганны Герман", — зазначыла Кацярына Дыбаль.

Адкрыццё новага сезону традыцыйна прызначана на 1 кастрычніка. Да яго сімфанічны аркестр рыхтуе праграму да 260-х угодкаў Моцарта.

Ірына ШАГАЛАЕВА
Віцебск

Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура" звяртайцеся па тэлефоне + 375 17 286 07 97 і па тэлефоне/факсе +375 17 334 57 41, альбо на электронны адрас kultura@tut.by!

Будзем на сувязі!

Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77 альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby**

Беларусы свету

Славянскі "Куфар"

З 23 па 29 мая ў Малдове шырока святкаваліся Дні славянскага пісьменства і культуры, якія сёлета былі прымеркаваны да 25-годдзя абвяшчэння незалежнасці гэтай рэспублікі. У падзеях брала ўдзел і беларуская дыяспара.

Урачыстасці ладзіліся ў вялікай зале Нацыянальнай філармоніі імя Сяргея Лункевіча. Тут сабраліся прадстаўнікі балгарскага, беларускага, рускага, украінскага і іншых этнасаў, што пражываюць у Малдове. Ва ўступным слове генеральны дырэктар Бюро міжэтнічных адносін Алег Бабенка адзначыў, што славянскі каларыт тут складаўся з лёсаў, намаганняў і таленту многіх людзей. Украінцы, рускія, балгары, беларусы складаюць амаль трэць насельніцтва краіны, карыстаюцца заслужанай павагай і выступаюць паўнапраўнымі ўдзельнікамі розных сфер жыцця сучаснай Малдовы.

У рамках урачыстай цырымоніі самым актыўным лідарам арганізацый дыяспар славянскіх народаў выступоўца ўручыў ганаровыя граматы за дзейнасць на ніве славянскай асветы, уклад у захаванне духоўнай спадчыны славянскіх народаў, развіццё міжкультурнага дыялогу, прасоўванне ідэалаў талерантнасці і кансалідацыю міжэтнічных адносін. Былі ўганараваны тры кіраўнікі беларускіх этнакультурных аб'яднанняў: старшыня Беларускага культурнага руху Малдовы Ганна Мазур, старшыня Беларускай грамады Юрый Статкевіч і старшыня Таварыства дружбы і супрацоўніцтва "Малдова-Беларусь" Генадзь Зяньковіч.

Святкавалі не толькі ў Нацыянальнай філармоніі: святочныя праграмы ладзіліся па ўсім Кішынёве ды рэгіянальных цэнтрах. Беларускі святочны блок прадстаўлялі этнічны тэатр "Куфар", які дзейнічае пры Беларускім культурным руху Малдовы, паказаў паэтычную замалёўку "Мая мова" на вершы Генадзя Бураўкіна і Яўгеніі Янішчыц, а таксама вакальны хор Беларускай грамады ў Малдове "Зорачка", які парадаваў гасцей шыкоўнымі беларускімі песнямі.

Цёплыя, душэўныя

Прэзентацыя фотаальбома "Зачараваны Беларуссю" на беларускай, рускай і англійскай мовах ды адкрыццё аднайменнай фотавыставы адбыліся 26 мая ў Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь. Аўтар здымкаў — намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аграрнай палітыцы Уладзіслаў Цыдзік.

Вольга РОПАТ

Альбом уключае фотаздымкі беларускіх краявідаў, архітэктуры, жывёл, птушак… Яны цёплыя і душэўныя, у іх няма надуманасці. Пасля прагляду твораў Уладзіслава Цыдзіка хочацца з'ехаць з шумнага гораду і пабыць сам-насам з прыродай. Асабліва ўразілі работы "Брыльянтавы россып", "Зімовае ўбранне", "Вясковы світанак"…

Першыя здымкі Уладзіслаў Цыдзік зрабіў у дзяцінстве, калі бацькі падарылі яму фотаапарат "Змена". З гэтага і пачалася любоў да фотамастацтва. У савецкі час будучы дэпутат удзельнічаў у міжнародных выставах. На сёння ён з'яўляецца аўтарам больш як 30 кніг і брашур.

На выставе здымкі дапаўняюць паэтычныя радкі 20 беларускіх паэтаў.

К

Фотафакт

Фота Юрыя ЧАРНЯКЕВІЧА

1 чэрвеня, у Міжнародны дзень абароны дзяцей, у Вялікай студыі Дома радыё прайшоў фінальны канцэрт інклюзіўнага праекта "Усе дзеці таленавітыя—2", арганізаваны каналам "Культура" Беларускага радыё і грамадскім аб'яднаннем "Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам". У канцэрце, які складаўся з 22 нумароў, прынялі ўдзел не толькі дзеці з абмежаванымі магчымасцямі з рэгіёнаў краіны, але і дзіцячыя музычныя калектывы сталіцы ды маладыя артысты.

"Лічбавы" падыход

Сам сабе… канкурэнт

У студэнцтве мне не раз даводзілася падрабляць на навагодніх ранішніках у дзіцячым садку ў якасці Дзеда Мароза. Што ні кажы, а гэта быў істотны дадатак да стыпендыі. Такую навагоднюю падпрацоўку многія мае сябры пакідалі за сабой нават і пасля заканчэння ўніверсітэта, апранаючыся ў строі Снягурак і Ведзьмакоў падчас калядных дзён, хоць працавалі ўжо ў школах, у газетах, у музеях.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

І вось зусім нядаўна пра такія ж падпрацоўкі артыстаў распавёў у інтэрв'ю "Вячэрняму Мінску" дырэктар Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра Аляксандр Пятровіч. Ён пажаліўся на тое, што ягоным супрацоўнікам з-за нізкіх заробкаў у 4 мільёны "з хвастом" даводзіцца займацца самай рознай працай.

— Чалавек творчы працуе 24 гадзіны ў суткі, — адзначыў у тым інтэрв'ю спадар Пятровіч. — Яму трэба пракарміць сябе і сваю сям'ю. Калі яго зарплата складае два мільёны з невялікім, тры ці нават чатыры мільёны рублёў, што ён будзе рабіць? Ён будзе шукаць, як зарабіць грошы. Таму сёння артысты многіх тэатраў шукаюць другую працу, падпрацоўку. Хтосьці працуе педагогам у навучальных установах культуры і мастацтва, хтосьці вядзе прыватныя ўрокі, хтосьці спявае ў царкоўным хоры. А хтосьці раскладвае тавары па паліцах у краме, кладзе плітку, выконвае рамонтныя работы…

Мяркую, згаданая праблема прысутнічае не толькі ў сталіцы, бо, як ужо неаднаразова згадваў, заробкі ў сферы культуры сёння адны з самых нізкіх па краіне. Гэтым разам напішу пра тое, якім чынам зарабляюць супрацоўнікі ўстаноў культуры ў блізкіх да яе кірунках. Напрыклад, у дырэктара Дома культуры ў Давыд-Гарадку Столінскага раёна Міхаіла Шыкунца, з якім я даўно знаёмы, ужо колькі гадоў ёсць пасведчанне індывідуальнага прадпрымальніка. Ён аказвае культурныя паслугі насельніцтву на карпаратывах і вяселлях, маецца нават свой асабісты камплект гукаўзмацняльнай апаратуры, які часам даводзіцца выкарыстоўваць і для правядзення агульнагарадскіх дзяржаўных мерапрыемстваў. І, натуральна, названая падпрацоўка папаўняе сямейны бюджэт.

Тое самае магу сказаць пра яшчэ аднаго свайго даўняга знаёмца — дырэктара сельскага Дома культуры Аляксандра Бабіна з вёскі Плябанаўцы на Ваўкавышчыне. Ён здаўна афіцыйна падпрацоўваў вядучым на вяселлях, а цяпер заняўся іншым кірункам дзейнасці: фатаграфіяй.

— Праз невысокі заробак многім супрацоўнікам сферы культуры больш выгадна ўзяць дзень адпачынку без захавання зарплаты і адпрацаваць у гэты дзень на карпаратыве ці вяселлі, — кажа Аляксандр Бабін. — Натуральна, аўтэнтычныя калектывы таксама падпрацоўваюць такім чынам на нейкіх святах, папаўняючы скарбонку платных паслуг, але тое зазвычай разавыя выступленні. А вось індывідуальнага прадпрымальніка і, натуральна, прафесіянала запрашаюць пастаянна.

Загадчык літаратурна-драматургічнай часткі Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача Васіль Дранько-Майсюк падпрацоўвае і Зюзяй, і Дзедам Марозам падчас калядных святаў.

— Так, я падпрацоўваю на Новы год, але магу ладзіць розныя мерапрыемствы, — сказаў "К" Васіль Дранько-Майсюк. — Займаюся гэтым даўно, і атрымліваю ад падпрацоўкі задавальненне. У гэтай справе шмат залежыць ад таго, ці падабаецца табе працаваць з дзецьмі, ці хочацца несці ім радасць і вяселле. Мне, натуральна, хочацца, ды і падпрацоўка — гэта, вядома ж, заўсёды добра…

Так што, бывае, дадатковая праца ў сферы культуры — не толькі сумны абавязак у часы нізкіх заробкаў культработнікаў, але таксама і радасць. Усё залежыць ад таго, як да гэтага ставіцца. Скажам, я з задавальненнем згадваю свой досвед Дзеда Мароза, хаця даўно гэтым не займаюся. Мяркую, гэткія ж добрыя ўспаміны ва ўсіх, хто ў свой час "шчыраваў" на каляднай ці навагодняй ніве.

І яшчэ. Як адзначыў ужо згаданы Аляксандр Бабін, сёння многія прыватныя арганізацыі ды прадпрымальнікі гатовы перахапіць у культработнікаў арганізацыю забаўляльных праграм.

— У прыватнікаў, аніматараў, ёсць і найноўшая гукаўзмацняльная ды светлавая апаратура, і свежыя праграмы, — кажа Аляксандр Бабін. — Да таго ж, яны гатовы выехаць у любую кропку краіны ў любы час. Думаю, канкурэнцыя ў гэтым кірунку будзе толькі ўзрастаць.

Галоўнае пытанне, мабыць, у тым, ці змогуць адпавядаць новым умовам супрацоўнікі дзяржаўных устаноў культуры? Ці змогуць яны быць такімі ж прывабнымі на сваёй "дзялянцы", як іхнія калегі з прыватнага сектара? Сфера культуры, на жаль ці на шчасце, сёння існуе ў рынкавых умовах, і калі пакупніку — гледачу, слухачу, наведвальніку — не спадабаецца тая ці іншая імпрэза, ён на яе наступным разам проста не пойдзе, а паедзе на прыватны фальклорны фэст, завітае на рок-н-рольны канцэрт ці запросіць Дзеда Мароза дахаты. Змаганне за месца пад сонцам у сферы культуры даўно ўжо пачалося, у тым ліку — і з-за нізкіх заробкаў у сферы культуры. Хто ж пераможа?

К

Меркаванне

"Апазнаны" феномен vs. культ карга

"Круглы стол" пад назвай "Мастацтва на стыку інтарэсаў" у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў сабраў плойму знаных прадстаўнікоў апошніх. Ды і нагода нядрэнная — падсумаванне вынікаў этапнай і шмат у чым эталоннай выставы "Усё было па-іншаму". Тым не менш, дыскусія пакінула даволі сумныя ўражанні. Увесь час здавалася, нібы нешта падобнае я недзе чуў. А калі зусім шчыра — сам казаў ці пісаў.

Ілья СВІРЫН

"Тубыльскі крыкет"

Як звычайна, гаварылася збольшага пра арт-рынак. Абмяркоўваліся сусветныя тэндэнцыі цэнаўтварэння, гучалі прозвішчы Саачы і Гагасяна, у чарговы раз выказвалася надзея на раптоўны інсайт тутэйшай буржуазіі, пасля якога тая кінецца купляць мастацкія творы. Што характэрна для падобных "круглых сталоў" (а яны ладзяцца з зайздроснай рэгулярнасцю), бадай нікога з прысутных нельга было назваць практыкам у дадзенай галіне. У зале былі мастакі, куратары, крытыкі, а зусім не галерысты, арт-дылеры і калекцыянеры, для якіх гэта тэма з'яўляецца сапраўды прафесійнай і якія кампетэнтныя нешта вырашаць. Таму зразумела, што вынікі сустрэчы, як заўсёды, не здзівілі: не ўпершыню…

Нескладана зразумець, чаму беларускія творцы так ахвотна гавораць пра рынак — часам куды ахвотней, чым, уласна, пра само мастацтва. Тут спрацоўвае стары прынцып: у каго што баліць… А баліць і сапраўды моцна, асабліва калі ўлічыць, што капіталізацыя ў дадзенай сферы блізкая да нуля, прычым гэты стан рэчаў не змяняецца дзесяцігоддзямі. Адпаведна, нават многія мэтры вымушаныя зарабляць сабе на жыццё "чым давядзецца".

Нельга не прызнаць відавочнага: арт-рынак на Беларусі па-ранейшаму застаецца свайго кшталту фантомам. Гэта з'ява, якая існуе, хутчэй, у свядомасці (а больш дакладна — у марах ды памкненнях), чым у рэчаіснасці. Што, вядома ж, сумна — але не ў навінку. Таму ўзнікае простае пытанне: навошта тады гаварыць пра тое, чаго няма?

Чаму б замест гэтага не засяродзіць увагу на тым, што ёсць — саміх творах і іх стваральніках? Чаму б не падыскутаваць пра асаблівасці візуальных практык і канцэптуальных аўтарскіх стратэгій, узаемадачыненні ідэі і яе экспазіцыйнага ўвасаблення, хісткасць межаў паміж грамадскім ды суб'ектыўным, пошукі каардынат у беларускай і сусветнай культурнай прасторы? Упэўнены: літаральна кожны з прадстаўленых на выставе куратараў і мастакоў мог бы сказаць на гэтыя тэмы шмат цікавага. З задавальненнем паслухаў бы іх.

Падазраю, справа ў нейкай падсвядомай упэўненасці, нібы з дапамогай слова фантом рынку можна чарадзейным чынам аб'ектываваць. Альбо ў памкненнях адпавядаць замежным трэндам: калі *там* усур'ёз гавораць пра арт-рынак, дык чым мы горшыя? Мастацтвазнаўца Павел Вайніцкі рэзка, але трапна параўнаў такія магічныя практыкі з "тубыльскім крыкетам": адэпты культу карга старанна імітуюць вонкавыя праявы заходняга ладу жыцця, спадзеючыся, што гэта прывядзе да паляпшэння іх уласнага жыцця.

Толькі вось магія нешта не спрацоўвае. Кракадзіл не ловіцца, не расце какос. Рынак усё ніяк не з'яўляецца.

Напачатку было мастацтва…

З непрыхаванай зайздрасцю прыводзячы замежныя прыклады, мы павінны разумець: арт-рынак у іншых краінах з'явіўся не на пустым месцы, ён мае свой генезіс. І ўзнікненню эканамічных адносінаў заўсёды папярэднічала з'яўленне "тавару" — сфармуляванай і актуалізаванай хаця б у пэўных колах грамадства культурнай з'явы.

Возьмем, напрыклад, маскоўскі канцэптуалізм. На пачатку было мастацтва — кватэрныя інсталяцыі і амаль неаддзельныя ад паўсядзённасці перфарматыўныя практыкі. Потым было мастацтвазнаўства, якое апісвала і класіфікавала гэтыя з'явы, а таксама вялікія выставачныя праекты. А ўжо потым — аўкцыёны, калекцыянеры і сямізначныя лічбы ў доларах.

Альбо згадаем леташні "Восеньскі салон", які многія крытыкавалі за празмерную "рынкавасць". Сярод вялікіх і прыгожых карцін з цэннікамі ў беларускіх рублях, у экспазіцыі вісела і пара-тройка маленькіх ды непрыкметных — без цэннікаў. Прафан моцна здзівіўся б, даведаўшыся, што рынкавы кошт некаторых з іх вымяраецца прыблізна ў тых самых лічбах, але ў іншай валюце. А ўся справа менавіта ў тым, што яны прыналежаць да "апазнанага" культурнага феномену — сусветнавядомай "Парыжскай школы".

Упэўнены, што на айчыннай глебе можна выгадаваць не адзін падобны феномен. Але мы пакуль захраслі на першым этапе: мастацтва ў нас, без сумневу, ёсць, а вось усё, што павінна яму наступнічаць… Зважаючы на хранічную неадладжанасць арт-інфраструктуры, не выпадае здзіўляцца таму, што дыялог з гледачом упарта не выбудоўваецца, а грамадскае ўспрыманне "сучарта" вось ужо якое дзесяцігоддзе вызначаецца фармулёўкай "Не бачыў, але… усё гэта лухта".

На "круглым стале" эмацыйна абмяркоўваўся сумны факт: на цудоўную выставу прыйшло вельмі мала людзей. Прычына тут не ў складаным мастацкім матэрыяле — пагатоў, і экспазіцыі традыцыйных пейзажаў зазвычай не могуць пахваліцца лепшай наведвальнасцю. Прычына — менавіта ў недапрацаванасці камунікацый паміж аўтарам і рэцыпіентам, якая характэрная бадай для ўсіх стыляў і жанраў. Альбо, калі адным словам, — у рэкламе і піяры. З першым усё зразумела: рэкламы было мала, і гэта факт. З другім — справа куды больш складаная.

Выстава "Усё было па-іншаму" стала бадай узорным пакуль крокам куратара і мастакоў у кірунку да гледача. Ні на міліметр не зніжаючы інтэлектуальнай планкі (што прынцыпова!), яны імкнуліся дасягнуць сумоўя з тымі, хто гэтага прагнуў: тлумачылі, ладзілі экскурсіі і спецмерапрыемствы для прэсы. Як вынік апошніх — пара-тройка публікацый у духу "я ў сучасным мастацтве нічога не разумею, але нешта ў гэтым, пэўна, ёсць".

Раней у нас былі журналісты, якія жыва рэагавалі на свежыя ідэі, культуралагічны эпатаж, "вынас мозга". Іх чытаць было цікава не толькі маленькай купцы інсайдараў. Сёння ж тэма большасці матэрыялаў пра мастацтва (вядома, калі гэта не "скапіпэйшчаныя" прэс-рэлізы) — як прадаць, па якім кошце і чаму не прадаецца.

Цікава, для каго яны пішуцца? Бо шараговаму рэцыпіенту зусім не хочацца быць суб'ектам рынкавых адносінаў — у яго проста няма матывацыі прымерваць на сябе гэтую маску. Яму мала цікава, па чым сёння Хёрст, ён не ведае і ведаць не хоча, хто такі Гагасян, а твор Міхаіла Гуліна ён не купіў бы нават за 100 "у.а.", бо гэта ладная частка яго месячнага заробку.

Яму патрэбны зусім іншы, нярынкавы, фармат узаемадзеяння з мастацтвам — прасякацца новымі думкамі і эмоцыямі, ставіць нязручныя пытанні да сябе ці да аўтара, урэшце, шчыра абурацца, калі ўбачанае на выставе падаецца яму прафанацыяй.

Менавіта для такіх гледачоў прызначаны расійскія вэб-парталы культурнага профілю. Яны своечасова прыйшлі на змену спецыялізаваным арт-выданням, якія трэба было чытаць са слоўнікамі з усіх галінаў чалавечых ведаў. Магчыма, гэта адна з прычын таго, чаму буйныя выставы сучаснага мастацтва ў Маскве збіраюць натоўпы гледачоў. І нядзіўна, што сярод іх трапляюцца і прадстаўнікі "асвечанай буржуазіі".

Нагода для зларадства

Уласна кажучы, у такіх "круглых сталах" можна ўбачыць пэўны псіхатэрапеўтычны аспект, асабліва калі ад іх камусьці становіцца хоць трохі лягчэй. Але шкоды яны прыносяць у кожным разе больш, чым карысці.

Пра мастацтва раней было прынята гаварыць "з прыдыханнем" — як пра апрыёры вышэйшае за гэты свет. Цяпер такая танальнасць лічыцца маветонам. Мо яно і правільна, але… На змену прыходзіць іншая крайнасць: казаць пра мастацтва выключна з дапамогай эканамічнай тэрміналогіі.

У выніку, і без таго не надта прывабны вобраз сучаснага мастака ў грамадскай свядомасці спазнае непажаданую трансфармацыю. Яго пачынаюць успрымаць як недарэку, што прагне ўцюхаць поўнае "шыла", але нічога ў яго не атрымліваецца. Менавіта такім яго бачыць прадстаўнік той самай буржуазіі, які меціць сваю тэрыторыю на форумах папулярных парталаў. І ніякага жадання дапамагчы ў яго не ўзнікае — хіба пазлараднічаць.

Тое, як мы гаворым пра сучаснае мастацтва, — прынцыпова важна. Альбо як пра самадастатковую і самакаштоўную з'яву, што ў лічбах не вымяраецца (прынамсі, яны не першасныя), альбо як пра няўдалы бізнес-праект. Выстава "Усё было па-іншаму", без сумневаў, належыць да першай катэгорыі. Напэўна, і казаць пра яе трэба было па-іншаму.

Культ карга неэфектыўны хаця б па адной прычыне: жыццё можна палепшыць толькі канкрэтнымі намаганнямі. Упарта садзіць бамбук, лавіць кракадзілаў і з усяе моцы старацца не думаць пра тое, што табе собіла нарадзіцца "не на той" выспе. А разнастайныя магічныя практыкі проста не маюць сэнсу.

К

Выставай з рынкавым складнікам стаў леташні "Восеньскі салон..." / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

Напоўніць жэсты сэнсам

Людміла БРЖАЗОЎСКАЯ,
народная артыстка Беларусі, педагог-рэпетытар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета краіны

Калі дзяцей прымаюць у харэаграфічны каледж, звяртаюць увагу найперш на іх фізічныя даныя. Калі ж юныя танцоры дарастаюць да артыстаў, становіцца відавочна, што ўласна пластыка і прафесійныя ўменні — толькі падмурак, на якім ствараюцца балетныя вобразы. І што для паспяховай творчай дзейнасці трэба яшчэ вельмі і вельмі многа. Найперш — жыццёвага багажу, ведаў у самых розных сферах.

Здавалася б, цяперашняму пакаленню прасцей: праз інтэрнэт можна даведацца ўсё што заўгодна. Дый ездзяць яны куды больш, чым мы ў іх узросце. Але трэба яшчэ навучыцца ўсё ўбачанае асэнсоўваць — і складаць у гэткую "скарбоначку", папаўняючы яе ўсё жыццё.

Памятаю, ніяк не атрымліваўся ў мяне вобраз Каханай у "Карміне Буране". Трэба было крыўляцца, быць дзёрзкай і злой — усё тое, што мне зусім не ўласціва. І я не магла знайсці "ключык" да гэтай партыі, не магла зразумець і "апраўдаць" сваю гераіню, а без гэтага — як жа танцаваць? І раптам убачыла драматычны спектакль паводле п'есы Шэкспіра "Утаймаванне свавольніцы" з Алісай Фрэйндліх у галоўнай ролі. У яе гераіні было ўсё: прага кахання, крыўда, гонар, смеласць… А галоўнае — яна ўвесь час, літаральна кожную хвіліну змянялася. І я зразумела, што і як мне трэба рабіць. Лічу, гэта павінна быць адным з правілаў артыста балета: перш, чым штосьці танцаваць, шукаць свае падыходы — паглядзі, як гэта рабілі іншыя, хай і ў іншых відах мастацтва. Не для таго, каб паўтарыць, а каб не вынаходзіць веласіпед.

Калі ставілася цяперашняя версія "Спартака", мне вельмі дапамог не толькі харэограф-пастаноўшчык (а ім быў, зразумела, Валянцін Елізар'еў), але і мастак Яўген Лысік. У "Плачы Фрыгіі" ён падказаў мне: "Гэта не павінна быць рэалістычна. Тут важная "скульптурнасць", якая перанясе гісторыю праз стагоддзі і скажа: "Памятайце!" Паўплывала на мяне і Мая Плісецкая: тое, як яна ў аднайменным балеце Якабсона несла і давала Спартаку меч, паўтарыць немагчыма, — гэта вяршыня таленту! Я перачытала раман, пераглядзела ўсе фільмы на гэты сюжэт, і калі выходзіла на сцэну, дык бачыла не чорную кулісу, а тыя войскі ў даспехах, што быццам стаялі за ёй. Пазней мне давялося пабываць ля Калізея: вецер, зоркі, месяц — і само адчуванне таго, што па гэтай зямлі хадзілі героі нашага балета, далі вельмі многа. Праз усё гэта балетныя жэсты, рухі напаўняюцца сэнсам, становяцца адухоўленымі, нясуць у сабе эмацыйна афарбаваную інфармацыю, якая перадаецца гледачам.

Парадокс балетнай прафесіі ў тым, што веды прыходзяць з гадамі, а век артыстычнай кар'еры — кароткі. Таму імкнуся перадаць моладзі ўсё, чым валодаю. Так, з Аляксандрай Чыжык я рыхтавала "Анюту". З Янай Штангей — "Лебядзінае возера" і "Баядэрку". Для кожнай артысткі хочацца знайсці новыя фарбы, таму не толькі ўлічваеш яе магчымасці, імкнешся раскрыць яе патэнцыял, але і ўзгадваеш усё лепшае, што было назапашана мінулымі пакаленнямі: Нінай Младзінскай, Аляўцінай Карзянковай, Ірынай Савельевай, Нінай Давыдзенка, Кларай Малышавай і многімі-многімі іншымі. Але веды немагчыма проста перадаць, як нейкую рэч. Трэба, каб іх гатовы былі ўзяць. Тая ж Яна Штангей — зусім яшчэ маладзенькая, але шмат шукае і сама, усё спрабуе па некалькі разоў, вельмі дапытлівая, зацікаўленая. Так і павінна быць: хай маладыя артысты заўжды застаюцца ў пошуку, імкнуцца да абнаўлення — і да новай харэаграфіі таксама, але не забываюцца на тое, што існавала раней. Ну, а мы ім у гэтым дапаможам…

Занатавала Надзея БУНЦЭВІЧ

Сёння ў Людмілы Генрыхаўны — юбілей. Хай тая "шчаслівая сямёрка" нясе ёй далейшыя творчыя далягляды, шчасце, здароўе і такую ж аддачу з боку маладых артыстаў балета, якой яна падпітвае іх сама.

Напярэдадні сходу

Канстанцін КАРНЯЛЮК,
педагог

Лічу, што толькі сумеснымі намаганнямі мы зможам палепшыць наша жыццё — яго матэрыяльную і духоўную платформу. Як вядома, на Усебеларускі народны сход кожныя пяць гадоў выбіраюцца лепшыя з лепшых прадстаўнікоў народа — прадстаўнікі розных галін народнай гаспадаркі. І сімвалічна, што сход адбываецца ў адным са знакавых месцаў сучаснай Беларусі — у Палацы Рэспублікі.

Мне думаецца, што менавіта гэты сход — важная форма дэмакратыі беларускага народа. І таму нельга ставіцца да яго правядзення пасіўна і абыякава. Дарэчы, першы сход, у якім бралі ўдзел каля пяці тысяч дэлегатаў, адбыўся 19 — 20 кастрычніка 1996 года. Так што сёлетні год юбілейны — мы адзначаем 20-годдзе сучаснага беларускага веча.

Што ж змянілася за гэтыя два дзесяцігоддзі? Канешне, многае. Мы сталі сведкамі прагрэсіўных і красамоўных крокаў нашай Бацькаўшчыны наперад. Сярод дасягненняў папярэдняй пяцігодкі нельга не назваць інтэнсіўнае жыллёвае будаўніцтва, шырокамаштабнае развіццё сістэмы аховы здароўя, адукацыі і культуры. Пры ўсіх складанасцях галоўнай задачай застаецца мадэрнізацыя нацыянальнай вытворчасці на інавацыйнай аснове, стварэнне прамысловага кластара прадпрыемстваў і вытворчасцей, якія эфектыўна выкарыстоўвалі б танную электраэнергію. Насычэнне бюджэту за кошт высокатэхналагічных тавараў павінна стаць адной з важнейшых задач эканамічнага развіцця на будучую пяцігодку. Праблемы працаўладкавання, занятасці насельніцтва таксама з'яўляюцца надзённымі. Гэта тое, чым кіраўнікі на месцах павінны займацца штодзённа. Вынікам мае стаць паляпшэнне якасці жыцця беларусаў, павелічэнне дабрабыту.

Народны сход фактычна ўжо пачаўся, бо вылучэнне дэлегатаў — гэта таксама веча асобна ўзятага прадпрыемства. Гэта вызначэнне прызнаных лідараў, акрэсліванне праблемных пытанняў, якія трэба скрупулёзна абмеркаваць, а таксама тых прапаноў, якія дадуць магчымасць скарэктаваць стратэгію развіцця Беларусі. Традыцыя правядзення такіх форумаў давяла сваю эфектыўнасць. Такая форма стасункаў, рады з народам годна сябе апраўдала.

Зразумела, сход дасць магчымасць пачуць розныя пункты гледжання аб эканамічным развіцці краіны. Тут будзе прадастаўлена магчымасць выказацца прадстаўнікам розных сфер, прычым, як правіла, выяўляецца не асабісты пункт гледжання, а пазіцыя калектыву цэлага прадпрыемства. А пасля разгортваецца дыялог. Гэта і дапамагае абмеркаваць праблемныя моманты, намеціць шляхі іх вырашэння, а таксама абазначыць моцныя і слабыя бакі ў розных галінах.

Мяне як грамадзяніна Беларусі не можа не радаваць, што на сход прыедуць дасведчаныя людзі, якія паказалі сябе ў працы і добра ведаюць, чым жыве наша грамадства, той самы "маленькі" чалавек. Гэта сапраўды самыя яркія прадстаўнікі народа, якія не толькі выйшлі з самай яго гушчы, але і не паехалі па заморскі хлеб.

Канешне, наш народ вельмі мудры, ён бачыць і агрэхі, і недахопы. І не толькі бачыць, але штодзённа імкнецца іх выпраўляць. Сход — гэта адкрыты дыялог кіраўніцтва краіны са сваім народам. Народнае веча дае нам магчымасць рэалізаваць сваё канстытуцыйнае права ўдзельнічаць у абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця. Нельга не ганарыцца тым, што толькі ў адной дзяржаве постсавецкай прасторы кіраўніцтва ідзе на такі шчыры дыялог з народам.

Развіццё навукі, адукацыі і культуры павінна стаць адной з галоўных тэм сходу. Калі мы не будзем удзяляць гэтым галінам належнай увагі, то ў краіны не будзе эфектыўнага руху наперад, тэхнічнага і эканамічнага развіцця. А таленавітай моладзі ў нас хапае: штогод многа юнакоў і дзяўчат нашай краіны становяцца пераможцамі самых прэстыжных міжнародных алімпіяд і спаборніцтваў.

Быць дэлегатам на такім прадстаўнічым форуме — вялікі гонар, але разам з тым і вялікая адказнасць перад насельніцтвам рэгіёна, якое аказала такі высокі давер. Людзям, зразумела, патрэбны годныя лідары і паспяховыя арыенціры.

Нам усім разам трэба вучыцца адчуваць сябе часцінкай свайго народа. Мы самі творым сваю будучыню. Кастусь Каліноўскі сцвярджаў: "Не народ для ўрада, а ўрад для народа". Справядлівасць гэтага яшчэ і яшчэ раз даказвае традыцыя правядзення народных сходаў на зямлі Бацькаўшчыны.

Навошта новы фольк-фэст?

Ірэна КАТВІЦКАЯ,
спявачка, педагог

9 чэрвеня мы запрашаем на фестываль "Беларускі стыль". Праграма выступу "завязаная" на трох пунктах: Іван Кірчук прэзентуе традыцыйнае выкананне, "Port Mone" — радыкальны падыход да інтэрпрэтацыі фальклору, "Агата" — ф'южн. Спецыяльнымі гасцямі стануць Ягор Джэйгала з банцурамі (індыйскія флейты) і саўнд-дызайнер Уладзімір Патапенка.

Мы падаем "Беларускі стыль" як "фестываль", а не "канцэрт", бо маем намер зрабіць серыю мерапрыемстваў, аб'яднаных адзіным брэндам: выступ некалькіх гуртоў раз на 4 — 5 месяцаў, майстар-класы для маладых музыкантаў, адукацыйныя заняткі для дзяцей. Менавіта сучасны па форме беларускі стыль, у аснове якога — фольк.

Заняткі для моладзі плануем рабіць разам са школай электронных музыкаў "Аблетон". Там пачаткоўцы вучацца ствараць уласныя трэкі. Займаюцца гармоніямі і сальфеджыа, дзі-джэінгам (працуюць з вінілам). Педагогі разбіраюцца ў розных накірунках сучаснай музыкі: house, hip-hop, indie, chill out, dub…

З дзецьмі займаемся на базе музея Ваньковічаў, робім мерапрыемствы, прысвечаныя розным святам (Каляды, Масленка, Вялікдзень), каб малыя маглі дакрануцца да традыцыі. За мінулы год прайшло з восем сустрэч. Зараз — перапынак на лета, а ўвосень працягнем. Вядзем перамовы з іншымі музеямі, каб паказваць праграмы і там.

Выступ 9 чэрвеня будзе пробным. Калі добра пойдзе, то плануем запрашаць і аўтэнтычныя, і пост-фольк гурты, якія на добрым узроўні пераймаюць спеўную традыцыю. Паглядзім і на колькасць наведвальнікаў 9 чэрвеня ў зале "Атлант". Магчыма, некаторыя выступы будуць патрабаваць меншай залы, а іншыя, наадварот, большай. Як кажа мой калега Аляксей Варсоба, камусьці трэба open-air, а хтосьці ў камернай зале найлепш гучыць. Чым больш канцэртаў, фестываляў, руху ў гэтым кірунку наогул, тым лепш. Мы запаўняем нішы, імкнемся прывабіць больш людзей.

Фестываль "Беларускі стыль" плануем як самаакупны. Фінансавымі пытаннямі ў нашай камандзе займаецца Віталь Прастата. Ён ужо 15 гадоў у івэнт-бізнесе, мае ўласнае агенцтва. Білеты раскупаюцца добра, хаця, можа, і не настолькі, як нам хацелася б. Той жа Аляксей Варсоба, напрыклад, лічыць, што беларускі рынак перанасычаны адносна фінансавых здольнасцяў людзей, але неданасычаны канцэптуальна. З гэтым мы і працуем. І, дарэчы, мы адкрытыя для новых ідэй, і новых людзей гатовыя ў каманду ўзяць.

Разумеем, ёсць шэраг праверанных часам фольк-фестываляў — "Камяніца", "Вольнае паветра", "Купальскае кола", "Калядны фэст", мерапрыемствы ў Дудутках… Мы сябруем з арганізатарамі, выступалі на многіх з гэтых фэстаў з гуртамі "Рада" і "Агата". У нас вядучым будзе лідар "Палаца" Алег Хаменка, які ўжо стаў тварам "Камяніцы". Пры гэтым не плануем, што "Беларускі стыль" будзе заўсёды весці толькі ён. Наша адрозненне ад астатніх фестываляў — менавіта ў рэгулярнай дзейнасці і разнастайнасці імпрэз.

Занатавала Алена ЛЯШКЕВІЧ

Дзяжурны па нумары

Стогн, прэміі і кан'юнктура

Нацыянальнай музычнай прэміяй некаторых нашых творцаў не ўзнагароджвай, дай толькі слязу пусціць. І добра б нылі пачаткоўцы, маўляў, талент заціскаюць, не паказваюць па тэлевізары ды не бяруць у ратацыю на радыё, на "Еўрабачанне" не прымаюць або куды далей не пасылаюць, а канцэртаў раз-два — і ўсё. Дык галасіць кінуліся гранды.

Алег КЛІМАЎ

Спярша "вызначыўся" фронтмэн гурта "Крама" Ігар Варашкевіч, які заявіў аднаму з інтэрнэт-парталаў, што калі крайні альбом "Белая вада" яго калектыву халаднавата прыняла крытыка, што раз кліп на загалоўную кампазіцыю як бы не заўважылі, што калі музыка, якую выконвае ансамбль, на яго думку, сёння не запатрабаваная, то і новы поўнафарматнік ён запісваць наўрад ці стане. Маўляў, не бачыць сэнсу хадзіць з працягнутай рукой. Затым грунтоўны пост, у якім было шмат літар, апублікаваў на сваёй старонцы ў "Фэйсбуку" лідар "Нейра дзюбеля" Аляксандр Кулінковіч. Сутнасць звялася да таго, што музыкант у катэгарычнай форме адмаўляецца ў далейшым удзельнічаць у любых музычных прэміях — ні ў якасці іх саіскальніка, ні як член журы. У спробе аргументавана выкласці гэту пазіцыю не толькі я, але і многія каментатары гэтага "посту", убачылі крыўду Аляксандра на тое, што ў апошні час якімі-небудзь прызамі гурт адорваць перасталі. А яшчэ, аказваецца, паводле інфармацыі Кулінковіча з добра інфармаванай "крыніцы", не так даўно яго калектыў рэальна прэтэндаваў ткі на адзін з прызоў адной з малалікіх у нашай краіне рок-прэмій. Дык не! Падманулі, узнагародзілі ім хай і годны ансамбль, але не з прычыны яго дзікіх поспехаў за кантрольны перыяд, а ў гонар яго распаду: пра нябожчыка ж толькі добрае...

Усё гэта было б смешна, каб не аказалася так сумна. З Ігарам ды Аляксандрам я знаёмы бог ведае колькі. Людзі яны адэкватныя, якія добра ўсведамляюць, што кандовым рок-н-ролам у Беларусі калі дзе і можна колькі зарабіць, дык толькі ў кабаках, выконваючы там каверверсіі не ўласных песень. (Варашкевіч, дарэчы, падобнае практыкуе). Карма такая ў нашай краіне агарнула гэты кірунак. І рок-альбомы ўжо даўно мільённымі накладамі ў нас не разыходзяцца, як, зрэшты, і ў свеце — іншая кан'юнктура на музычным рынку. Прэтэнзіі да крытыкі з вуснаў мэтра беларускага року наогул выклікалі шок. Ужо хто-хто, але не Варашкевіч быў заклапочаны тым, наколькі спадабаецца ці не спадабаецца чарговы рэліз "Крамы" музыказнаўцам. А вось з прэміямі я дапамагчы не змагу, прабач, Аляксандр Міхайлавіч...

Напрыканцы выкажу асцярожную здагадку, што распусканне гэтых "нюняў" — з'ява звычайна-міжсезонная: натхненне звычайна восенню стукаецца ў дзверы. Адпачнуць нашы майстры рытм-энд-блюзу ды року, і зноў возьмуць яны ў студыі ў рукі мікрафон, гармонік, гітару. І складуць нятленкі, якія (тут ты не маеш рацыю, Ігар) людзям патрэбныя. А там, глядзіш, і Нацыянальную музычную ці якую іншую прэмію за іх усё ж такі возьмеце...

К

Вяртаючыся да надрукаванага

Фестывалю не будзе. А чаму?

Платна ці бясплатна: галоўнае пытанне "Ночы музеяў-2016"

Платна ці бясплатна-2:

галоўнае пытанне "Ночы музеяў—2016"

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Алена ЛЯШКОВІЧ,
дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы:

— На "Ноч музеяў" уваходны білет у нашу ўстанову каштаваў сімвалічную тысячу рублёў. Гэта наша прынцыповая пазіцыя: як я лічу, калі мы ўдзельнічаем у агульнаеўрапейскай акцыі, дык павінны адпавядаць тым жа крытэрыям і падыходам, што выкарыстоўваюць нашы калегі ў Еўропе. А там, як вядома, "Ноч музеяў" цалкам бясплатная для наведвання.

Па білетах да нас зайшло больш за 2 тысячы чалавек, хаця, як падаецца, у музейным двары, на вуліцы, было значна больш людзей. Мы арганізавалі выступленні чатырох творчых калектываў, а таксама ладзілі разнастайныя мерапрыемствы і майстар-класы. І, натуральна, былі экскурсіі па музеі. У гэтай працы нам вялікую дапамогу аказалі валанцёры. Яны, дарэчы, таксама дапамагалі рэгуляваць колькасць наведвальнікаў ва ўстанове: калі мы бачылі, што людзей у пэўны прамежак часу ў музеі шмат, дык часова перапынялі ўваход для новых гасцей. Але, падаецца, так рабілася і робіцца заўсёды пры вялікіх акцыях.

Для таго, каб аплаціць працу гукарэжысёра і двух калектываў, давялося выкарыстаць сродкі пазабюджэтнага фонду. Выступленні яшчэ двух калектываў аплаціў аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Цэнтральнага раёна Мінска, з якім мы сумесна і зладзілі "Ноч музеяў"… Нягледзячы на тое, што, такім чынам, мы аказаліся "ў мінусе" па грошах, у іміджы ды рэкламе мы, несумненна, "у плюсе". Нашу музейную ноч неаднаразова згадвалі добрым словам у інтэрнэце, мы займелі новых сяброў і далучылі да свайго музея дзясяткі і сотні наведвальнікаў. А гэта, мяркую, і ёсць тое, дзеля чаго варта ладзіць "Ноч музеяў"…

Алег РЫЖКОЎ,
дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь:

— Лічу, што высокая плата за ўваход не спужала наведвальнікаў: да нас па білетах прыйшло больш за тысячу чалавек, і ўстанова культуры, такім чынам, зарабіла больш за сто мільёнаў рублёў за адну толькі "Ноч музеяў". Але асноўныя мерапрыемствы міжнароднай акцыі ладзіліся ў музейным дворыку з 12-й дня да 1-й гадзіны ночы і былі абсалютна бясплатнымі. А гэта і канцэрты, і майстар-класы, і забаўляльная праграма для дзяцей, і продаж сувенірных вырабаў, і кухня. Усё гэта, да слова, адбывалася ў рамках арт-праекта "Сула. Непарыўнае". Па маіх падліках, на бясплатную пляцоўку завіталі тысячы мінчан і гасцей сталіцы, і што асабліва радуе — многа сямейных пар.

Я вельмі пазітыўна стаўлюся да таго, што ў Еўропе асноўныя мерапрыемствы "Ночы музеяў" — бясплатныя для наведвальнікаў. Мы таксама пайшлі гэтым шляхам: паўтаруся, асноўныя мерапрыемствы міжнароднай акцыі ў нас былі таксама з вольным уваходам для ўсіх, прычым як каля Нацыянальнага гістарычнага музея, так і каля нашых філіялаў. Адчыніць жа дзверы ў сам музей на бясплатнай аснове мы не можам з-за наяўных тэхнічных магчымасцяў: у нас няма кругавога праходу праз усе музейныя залы, і людзі, якія завітвалі б у нашу ўстанову, проста перашкаджалі адзін аднаму і атрымлівалі ад наведвання не пазітыўныя эмоцыі, а адзін дыскамфорт. Нам таксама трэба памятаць пра бяспеку наведвальнікаў.

Да слова, шмат гасцей прыйшло ў "Ноч музеяў" і ў нашы філіялы. Таму ў мяне з'явілася ідэя наконт таго, каб праз год паспрабаваць увесці адзіны білет, які прадастаўляў бы права ўваходу ва ўсе "кропкі" Нацыянальнага гістарычнага музея. Цяпер будзем думаць, як гэта лепш зрабіць тэхнічна. Што да транспарту, які б у музейную ноч дастаўляў наведвальнікаў ва ўпадабаныя імі музеі, дык гэта добрая прапанова. Адно што пытанне гэта не да мяне, а да гарадскіх улад: калі яны захочуць такім чынам паўдзельнічаць у "Ночы музеяў", думаю, усе сталічныя музейшчыкі будуць гэтаму толькі рады.

Пятро ЦАЛКА,
загадчык філіяла Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Фёдара Шклярава ў Гомелі:

— Сёлетняя "Ноч музеяў", як і папярэднія, была бясплатнай. Гэтаму ёсць адна прычына: у нашай установы ёсць мецэнат, былы жыхар Веткі, які цяпер жыве ў Гомелі і дапамагае нашаму музею. Дзякуючы ягонай падтрымцы ў 8 мільёнаў рублёў, мы змаглі сёлета запрасіць і калектывы, і замовіць банеры, і рэкламныя ўлёткі, а таксама набыць усе неабходныя матэрыялы для арганізацыі дзіцячай пляцоўкі: фламастары, фарбы, паперу, крэйду і шмат іншага.

У "Ноч музеяў" да нас завітала звыш 2 тысяч чалавек, і ўсе яны былі прыемна здзіўлены тым, што музейная праграма была бясплатнай. Але гэта наш імідж, які не вымяраецца грашыма. Названая акцыя, на мой погляд, дазволіла прыцягнуць да ўстановы культуры ўвагу тых людзей, якія зазвычай у яе не заходзілі або ўвогуле пра нас не ведалі. Так што мы атрымалі ад гэтай музейнай акцыі галоўнае: новых наведвальнікаў і сяброў.

Да слова, на ўваходзе ў нас заўсёды ляжыць сшытак, у якім можна запісаць сваю электронную пошту. Пасля робім для гэтых людзей сваю традыцыйную рассылку, паведамляючы пра новыя музейныя выставы і акцыі. Акрамя таго, пра свае мерапрыемствы распавядаем і ў сацыяльных сетках. Бо толькі дзякуючы рэкламе мы можам разлічваць на пастаянны прыток у музей як сталых, так і новых наведвальнікаў. І "Ноч музеяў" у гэтым таксама вельмі дапамагае…

Валянціна МАКАРАВА,
намеснік начальніка ўпраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь:

— "Ноч музеяў" запатрабаваная сярод жыхароў Беларусі. Я бачыла, што і ў Нацыянальным мастацкім музеі, і ў Нацыянальным гістарычным людзей было вельмі шмат. Усюды ладзіліся самыя разнастайныя акцыі і імпрэзы, на якіх прысутнічалі як людзі сталага, так і маладога веку, а таксама, канешне, дзеці.

Нагадаю, айчынныя музеі раз на месяц адкрываюць свае дзверы для вольнага ўваходу ўсім наведвальнікам на асноўную экспазіцыю, а 18 мая, у Міжнародны дзень музеяў, названыя ўстановы таксама працуюць бясплатна, у тым ліку і ладзячы шэраг мерапрыемстваў. У саму ж "Ноч музеяў" установам культуры трэба аплаціць працу гукарэжысёраў, запрошаных калектываў, выкарыстаныя матэрыялы і гэтак далей. Акрамя таго, натуральна, не трэба забывацца пра выкананне плана платных паслуг, які сёння даведзены кожнаму музею. Адсюль — і плата за ўваход на асноўныя мерапрыемствы "Ночы музеяў".

Але варта адзначыць і вось яшчэ што: ва ўсіх мінскіх музеях былі прадугледжаны бясплатныя пляцоўкі, ладзіліся агульнадаступныя мерапрыемствы для дзяцей і падлеткаў, дзейнічала сістэма зніжак... Таму кожны, на маю думку, мог выбраць для сябе тую падзею, якую яму хацелася наведаць…

К

Што галоўнае: увага або грошы?

Журналісты "К", натуральна, неаднаразова наведвалі і будуць наведваць мерапрыемствы "Ночы музеяў". Таму іх меркаванні — таксама своеасаблівы vox populi, які мы вырашылі сабраць на адной паласе разам з меркаваннямі спецыялістаў музейнай сферы.

Надзея БУНЦЭВІЧ:

— Думаю, справа тут не ў кошце білетаў і ўвогуле не ў грошах, а ў той мэце, якую пераследуе ўстанова культуры (у дадзеным выпадку — музеі). Што такое "Ноч музеяў" для арганізатараў: магчымасць прыцягнуць да сябе ўвагу наведвальнікаў ці дадатковы канал для выканання эканамічных паказчыкаў? Адпаведна, рознымі будуць і шляхі. Хаця… зарабляць грошы таксама можна па-рознаму! Можа, у таго ж Мастацкага музея разлік быў на параўнанне? Класічны прыклад: каб хутчэй што-небудзь прадаць, побач ставяць два прылаўкі з адным і тым жа таварам, але розным коштам. Параўнаўшы, пакупнікі літаральна "размятаюць" больш танны. А непамерны кошт на другім прылаўку — сродак прыцягнуць увагу менавіта да гэтага тавару. Перанёсшы гэту сітуацыю на музей, атрымаем наступнае. Убачыўшы астранамічныя лічбы, многія (і найперш тыя, хто тут ніколі не былі) падумаюць: цікава, што ж там такое, калі каштуе так дорага? І, параўнаўшы "начны" цэннік са звычайным, дружна рушаць у музей… крыху пазней.

Кошт, да ўсяго, яшчэ і моцны сацыяльны рэгулятар. Калі музей просіць за ўваход мінімальную суму, ён тым самым запрашае да сябе шырокія колы насельніцтва, — у тым ліку моладзі, студэнцтва, пенсіянераў, дзеячаў культуры. Калі ж выстаўляе на цэнніку значную "сумачку грошай", дык разлічвае на абмежаваную колькасць забяспечаных грамадзян, для якіх той "культпаход" стане своеасаблівым паказальнікам іх фінансавых магчымасцяў: маўляў, магу сабе дазволіць — у адрозненне ад некаторых. Пэўна, такім чынам можна пазнаёміцца з патэнцыйнымі спонсарамі. Але пашырыць кола зацікаўленых наведвальнікаў — наўрад ці. Для апошняга патрабуюцца дні адчыненых дзвярэй, якія музеі ўсяго свету і беларускія ў тым ліку практыкуюць раз на месяц.

Вольга РОПАТ:

— Канешне, добра, калі ўваход у музей на Міжнародную акцыю "Ноч музеяў" вольны. На мой погляд, так і павінна быць, тым больш што акцыя праводзіцца адзін раз на год. Але, як мне падаецца, не кожны музычны калектыў будзе некалькі гадзін працаваць за "дзякуй". Нават самае шчырае. І яшчэ адзін момант: не хочацца, каб "храмы мастацтва" пераўтвараліся ў месца забаў. Думаю, не зусім правільна ў сценах музея праводзіць, скажам, чэмпіянаты па камп'ютарных гульнях і тое, што не тычыцца асветы.

Алена ЛЯШКЕВІЧ:

— Як па мне, дык хай бы на "Ночы музеяў" выступалі маладыя гурты і малавядомыя лектары, што згодныя рабіць гэта задарма. Музей браў бы грошы за ўваход на экспазіцыю як звычайна, ці рабіў бы ўваход вольным. Тады гэта было б сапраўднае свята, даступнае ўсім. З іншага боку, трэба ж неяк рэгуляваць колькасць ахвотных трапіць у музей. Выйсцем маглі б з'яўляцца вулічныя імпрэзы. Але не ўсе музеі маюць адпаведную прастору. Таму палка, як заўжды, на два канцы.

Настасся ПАНКРАТАВА:

— Гэта міжнародная акцыя ўсё ж задумвалася дзеля своеасаблівага рэбрэндынгу музеяў: зрабіць установы моднымі, незвычайным спосабам прывесці ў залы моладзь, даказаць, што сучасная музейная прастора мае вялікі патэнцыял і рыхтуе для зацікаўленых шмат цікавостак. Добра, калі бясплатна альбо хаця б па адзіным білеце за сімвалічныя грошы можна ўсю ноч пераходзіць ад адной пляцоўкі да іншай, занурацца ў арыгінальныя праграмы і адкрываць адметнасці кожнага з музеяў. Сёлетняя акцыя адмоўна здзівіла мяне коштам на білеты… Я заўсёды любіла "паўночныя" акцыі ў Нацыянальным мастацкім, але аддаць за чацвярых 400 тысяч — немалыя грошы для сямейнага бюджэту. І адразу стала зразумела, што больш за адну пляцоўку мы не пацягнулі б…

Выратаваннем "Ночы…", якая для мяне ўжо магла б і не адбыцца, стала запрашэнне на бясплатную вечаровую экскурсію па Мінску ад радыё "Юністар". Краязнаўца Іван Сацукевіч так харызматычна, палымяна і на беларускай мове раскрываў сакрэты гістарычнага цэнтра сталіцы, што ў некалькі разоў павялічыў натоўп слухачоў — на пешаходнай экскурсіі да тых, хто запісаўся папярэдне, далучаліся і мінакі. Маё глыбокае перакананне: акцыя павінна быць даступная для розных слаёў насельніцтва. Тады сапраўды ў музеях павялічыцца колькасць наведвальнікаў і ў звычайныя дні.

Журналісты "К" пра неабходнасць платы ў час "Ночы музеяў"

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ:

— Я крытычна стаўлюся да самой ідэі "Ночы музеяў", таму пытанне, платным ці "халяўным" мусіць быць начны шпацыр па такой установе культуры, для мяне другаснае. Лепш, каб гэтага ўвогуле не было. Разумею, што сама ідэя нарадзілася невыпадкова: такім экзатычным чынам музейшчыкі хацелі пашырыць сваю аўдыторыю, распаўсюдзіць культурны ўплыў на тых, каму той музей па жыцці, бадай, увогуле непатрэбны. Зноў жа, як мне падаецца, ёсць у гэтай справе і прагматычны разлік на тое, што зазірне сярод ночы наведвальнік у музей задарма, зацікавіцца, і прыдбае карысную звычку рэгулярна хадзіць і надалей. Ужо за грошы.

Мастацтва, што ні кажы, гэта раскоша. А раскоша, паводле вызначэння, не можа быць "халяўнай". Таму я за тое, каб за наведванне мастацкіх музеяў плацілі заўсёды, хоць ноччу, хоць днём. Для іншых, немастацкіх, магчымыя варыянты.

А ўвогуле я лічу, што тыя музеі, што з'яўляюцца візітоўкай дзяржавы, не павінны займацца заробкам грошай, не трэба ім абавязкова быць прыбытковымі, рэнтабельнымі. Яны іншую функцыю маюць. Шырокавядомыя, брэндавыя музеі ўжо сваім існаваннем робяць прывабнымі горад, рэгіён, краіну. А вось на гэтай прывабнасці можна і трэба рабіць бізнес. Інакш кажучы, музей сам грошай не зарабляе, але спрыяе ў гэтай справе іншым.

Аліна САЎЧАНКА:

— "Ноч музеяў" — імпрэза, ужо ўпісаная ў сусветную гісторыю культуры. Праводзіцца яна з 1997 года — бясплатна і дзеля прасоўвання музеяў у грамадстве. Мне падаецца, тут можна было б паставіць кропку, бо гэту акцыю прыдумалі не мы, таму, пераняўшы, павінны выконваць яе ўмовы. У адваротным выпадку гэта будзе ўжо не "Ноч музеяў", а беларускае вынаходніцтва, якому трэба прыдумваць іншую назву.

Пры гэтым я не лічу, што платны ўваход, якім сёлета "грашылі" амаль усе ўстановы ў сталіцы і не толькі — такая ўжо і адмоўная з'ява. Платны ўваход — заканамерная рэакцыя на эканамічнае становішча, а не жаданне дырэктараў "азалаціцца" за кошт наведвальнікаў.

Таму лічу, што сапраўдная "Ноч музеяў", канешне, павінна праводзіцца па класічных правілах. А калі гэта матэрыяльна не атрымліваецца, ёсць некалькі альтэрнатыўных варыянтаў: рыхтавацца загадзя, прыдумваць бюджэтную версію ці не быць удзельнікам гэтай міжнароднай акцыі. Кропка.

К

300 майстроў у Лошыцы

У сталічным Лошыцкім парку было адчуванне, што вобласці прадстаўлены няроўна: шмат майстроў з Гомельшчыны, Віцебшчыны, трохі менш — з Брэстчыны. Міншчына, Магілёўшчына і Гродзеншчына, падалося, дэлегавалі менш майстроў.

Алена ЛЯШКЕВІЧ

Некаторыя раёны прывезлі выставы этнаграфічных рэчаў, некаторыя выставілі работы метадыстаў і дзяцей з гурткоў. Гандлявалі ж далёка не ўсе. Ад майстроў, якія прыехалі менавіта з мэтай нешта прадаць, чуліся нараканні, што людзей мала, ходзяць пераважна ўдзельнікі, нічога не купляюць. Так і было: колькасць наведвальнікаў "з горада" не перавышала звычайнай колькасці тых, хто выбраўся ў суботу ў парк. Сітуацыя была такой ці не заўсёды, нават у год правядзення ў Мінску Чэмпіянату свету па хакеі. Гэта пытанне, відаць, да ўсіх арганізатараў падзеі, чаму піяр годнага мерапрыемства менавіта такі.

Мне кірмаш бачыцца месцам, дзе магчыма набыць рэчы для дома. Ці "далучыцца да традыцый не выязджаючы з Мінска". Ці прыдбаць "вышыванку" (так у беларускіх вёсках не казалі, гэта інтэрнэт-новамова, але і яе варта скарыстаць). Мабыць, ад таго, што ў медыя стала гучаць тэма геаметрычнага арнаменту, на "Вясновым букеце", у параўнанні з мінулымі гадамі, паболела рэчаў, зробленых па аўтэнтычных узорах.

З рамёстваў са статусам нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі можна было пабачыць валожынскія паясы, віцебскія маляваныя дываны, бярозаўскую птушку-абярэг, неглюбскае ткацтва. Добра, што гэтыя элементы папулярызуюцца, майстры не сядзяць дома. Але ж хацелася б бачыць інфармацыю пра наяўнасць статусу на стэндах раёнаў. Для разгляду Радай па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры рыхтуюцца важкія папкі з інфармацыяй: дакументы, фота, копіі артыкулаў у СМІ. Хай бы госці "Вясновага букету" пагарталі тыя матэрыялы, ацанілі працу метадыстаў ды экспертаў.

Прадстаўніцы грамадскай арганізацыі "Студэнцкае этнаграфічнае таварыства" прадэманстравалі рэгіянальныя строі, зробленыя ўласнаруч у навучальных гуртках. Яскравыя строі былі на ўдзельніках з рэгіёнаў, праўда, часта стылізаваныя.

"Вясновы букет" — бадай адзіны міжнародны рамесны фестываль у Беларусі, куды прыязджаюць прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў краіны. Ён, безумоўна, патрэбны, але з умовай хоць нейкага піяру, каб не атрымлівалася мерапрыемства для ўдзельнікаў ды мінакоў.

Хіба ж яна фантомная?

Букет — гэта кампазіцыя, дзе ўсё падпарадкавана пэўнаму рытму і кожная дэталь гарманічна дапаўняе адна адну. Мне бачыцца гэты вясновы фестываль народнай культуры менавіта такім — кампазіцыйна ўдалым. У Лошыцкім палацава-паркавым комплексе 28 мая супала галоўнае: прыезд лепшых носьбітаў традыцыйных рамёстваў з розных куткоў краіны, шматлікія ўзоры працы, якія смела можна аднесці да матэрыяльнай каштоўнасці, прырода ў якасці дэкарацыі да дзеі і цудоўнае летняе надвор'е.

Аліна САЎЧАНКА

"Вясновы букет" нельга недаацэньваць, бо ён ладзіцца, у першую чаргу, для мінчан, а тутэйшая публіка, як ніякая іншая, знаходзіцца ў адрыве ад традыцый продкаў. Рэгіянальная культура бачыцца з Мінску нярэдка местачковай, нязначнай, нават фантомнай. Тым жа часам дамы рамёстваў і фальклору ў рэгіёнах поўняцца таленавітымі людзьмі, якім ёсць што паказаць і чаму навучыць.

Таму вельмі засмучае адсутнасць годнай рэкламы напярэдадні фэсту. Многія так і не даведаліся пра імпрэзу амаль у цэнтры сталіцы і не наведалі яе (а ў Сеціве можна лёгка і бясплатна прарэкламаваць усё, што заўгодна). Але тыя, хто былі, упэўнена, ацанілі маштаб і якасць фестывалю.

Хацелася б акрэсліць спрэчныя моманты. Не для таго, каб нашкодзіць іміджу "Вясновага букета", а хутчэй наадварот, каб па магчымасці выправіць пэўныя нюансы. Гэта толькі маё меркаванне, але на фестывалі традыцыйнай культуры павінна гучаць выключна народная музыка (не важна, аўтэнтычная ці апрацаваная). Часцяком жа чулася нешта "з іншай оперы". Хаця збольшага было прыемна слухаць і глядзець выступленні калектываў. Зноў жа сярод майстроў сустракаліся і звычайныя аматары хэнд-мэйда. Нічога супраць іх не маю, але фестываль прысвечаны зусім не завушніцам з бісеру ці фэйкавым "вышыванкам". Ну і апошняе: мне падаецца, на такіх імпрэзах вельмі дарэчнай глядзелася б беларуская кухня, а не шашлыкі, марожанае і піва на разліў. Некалькі кропак з дранікамі, гарбатай, садавінай і гароднінай маглі б разбавіць гэты шэраг і прапанаваць людзям альтэрнатыву.

Майстар-класы сталі аднім з кампанентаў свята. / Фота Аліны САЎЧАНКА

Для каго "...Букет"?

Гомельскі майстар Канстанцін Шаўцоў.

Тавары ад беларускіх рамеснікаў: ільняная вопратка, музычныя інструменты, драўляны посуд і шмат іншага...

З ухілам у... старасветчыну?

Паездзіўшы па фэстах у розныя гарады Беларусі, магу сказаць, што і рэжысура, і структурныя складнікі святаў у агульных рысах супадаюць паўсюль.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Гэта звычайна адкрытая пляцоўка, на якой прафесійныя ці самадзейныя гурты шчыруюць дзеля добрага настрою публікі, гандаль сувенірамі, работамі народных майстроў і зручнымі побытавымі прыладамі, кавярні і кіёскі з прысмакамі, атракцыёны. І патрэбны творчы падыход, немалое майстэрства і арганізацыйны талент, каб з гэтых стандартных кампанентаў зладзіць свята з рысамі ўнікальнасці. Свята, якое запомніцца, вылучыцца з шэрагу падобных. І тут адзін з галоўных, вызначальных, чыннікаў поспеху — фон, на якім разгортваецца свята. Адна і тая ж дзея будзе ўспрымацца па-рознаму на тле дэпрэсіўнага прамысловага ландшафту і ў маляўнічым парку, з якога паўсюдны цяпер хай-тэк яшчэ не выцясніў рамантычныя прывіды старасветчыны.

Лошыцкі парк у гэтым сэнсе — проста знаходка. Сёння, калі ён добраўпарадкаваны, сядзібны комплекс адрэстаўраваны, створана інфраструктура шпацыру (пехатой і на роварах) і ўсялякія зручнасці для адпачынку, сюды прыемна патрапіць і без дай прычыны, а тым больш — дзеля нейкай адмысловай праграмы. Дадам, што хоць да парка яшчэ не дацягнулі метро, гэты раён не ўспрымаецца далёкай ускраінай: дабрацца ад чыгуначнага вакзала да Лошыцы можна за якіх-небудзь 15-20 хвілін. Ды і ўвогуле, тут улюбёнае месца адпачынку мінчан, якое па папулярнасці дасягае іншых, больш вядомых, паркаў сталіцы.

Прыехаўшы на фэст, я наведаў цудоўны парк і ўжо праз адно гэта не лічу час змарнаваным. Што да самога свята, дык ягоную рэжысуру, на маю думку, варта было б прыстасаваць да месца правядзення. Каб быў не проста кірмаш сувеніраў, падобны на іншыя, а з тэматычным ухілам у беларускую старасветчыну. Адраджаць гістарычную спадчыну і выхоўваць патрыятызм можна не толькі на звыклых саломцы і кераміцы, але і на ўзорах матэрыяльнай культуры сацыяльнай эліты — беларускай шляхты.

К

Тактыка культурнага развіцця

Праблемы? Варыянты?

Прыстасаванне індустрыяльных пабудоваў мінулых стагоддзяў і дзесяцігоддзяў да сучасных патрэбаў — такому пытанню быў прысвечаны "круглы стол" з удзелам архітэктараў і жыхароў сталіцы, зладжаны грамадскай арганізацыяй "Экаград" .

Кірунак дойлідства, звязаны з індустрыяльнай архітэктурай, паўсюдна актыўна развіваецца. У шмат якіх краінах свету ў сталіцах і буйных гарадах з'явіліся і з'яўляюцца раёны на месцы былых прадпрыемстваў. Гэта тэрыторыі — добраўпарадкаваныя, з камфортнай, сучаснай інфраструктурай, з цікавымі музеямі, кавярнямі, спартыўнымі заламі, адрэстаўраванымі гістарычнымі будынкамі.

З канцэпцыяй такіх раёнаў — створаных і тых, што ствараюцца, пазнаёміў гасцей "круглага стала" даследчык Цэнтра сацыяльна-эканамічных даследаванняў "Case Беларусь" Дзмітрый Бабіцкі. Ён прывёў прыклады ўдалых праектаў, якія ў эканамічным, сацыяльным і культурным планах садзейнічаюць развіццю гарадоў і краінаў, станаўленню іх сучаснага іміджу. Цікава працуюць, у прыватнасці, нашы суседзі ў Польшчы. У Варшаве на месцы былога прадпрыемства XIX стагоддзя, падобнага да мінскага "Крышталю", з'явіўся сучасны раён, дзе пабудаваныя камфортныя дамы, шматлікія культурніцкія пляцоўкі. У выніку польскія горадабудаўнікі вырашылі шмат праблемаў, адна з якіх — удалае размеркаванне і выкарыстанне гарадской зямлі.

Дадзеная праблематыка асабліва актуальная для Мінска. Наша сталіца згодна статыстыкі — адзін з самых шчыльна забудаваных гарадоў у Еўропе. І менавіта такі сучасны падыход, як прыстасаванне шматлікіх прамысловых зон пад патрэбы вялікіх мегаполісаў, здолее вырашаць, на думку Дзмітрыя Бабіцкага, мноства наспелых горадабудаўнічых пытанняў.

Прамысловая спадчына Мінска — праблема альбо новыя магчымасці? Такім пытаннем задаўся архітэктар Беларускага навукова-даследчага інстытута горадабудаўніцтва Дзмітрый Бібікаў. Распавёўшы пра вопыт забудовы на месцы старой прамысловай тэрыторыі ў іспанскім горадзе Більбао з удзелам сусветнавядомага архітэктара Нормана Фостара сучаснай крэатыўнай зоны з рэстаранам у былым цэху, адметных музеяў найсучаснай інфраструктуры, якая стварыла новы імідж горада, зрабіла яго вядомым у свеце, даследчык падкрэсліў, што дадзены падыход — найбольш аптымальны і перспектыўны. Такіх прыкладаў у свеце шмат. Гэта і Калвер-Сіці ў раёне Лос-Анджэлеса, і сучасна асэнсаваныя тэрыторыі Рурскага басейну ў Германіі. Беларускія архітэктары таксама спрабуюць працаваць у дадзеным кірунку. Цікавымі з'яўляюцца, на думку Дзмітрыя Бібікава, архітэктурныя пошукі, годныя ўвагі і падтрымкі, у раёне вуліцы Кастрычніцкай у Мінску — на месцы збудаванняў XIX стагоддзя, помнікаў прамысловай архітэктуры.

Наталія АЛЕСЯЕЎСКАЯ

Мастыхін

Мастацкая выстава “Пяро з выбітым зубам…” доўжыцца з часу святкавання Міжнароднага дня музеяў і з’явілася прэамбулай да акцыі з нагоды “Ночы музеяў” пад назвай “Бюро сюррэалістычных паслуг”. Кампануючы жывапісныя палотны, графічныя творы, скульптуру, умоўныя пластычныя кампазіцыі, аўтары экспазіцыі ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі пастараліся дасягнуць яе канцэптуальнай скіраванасці да ўспрыняцця свету на ўзроўні падсвядомага, да эстэтыкі сюррэалізму — аднаго з самых значных і даўгавечных мастацкіх кірункаў еўрапейскага авангарднага мастацтва ХХ стагоддзя, які, узнікшы ў Францыі напачатку 1920-х і, паступова зліваючыся з масавай культурай, стаў неад’емнай часткай постмадэрнізму.

Фрагмент экспазіцыі ў Гродна.

Над-рэалізм “выбітага зуба…”

Вобразы “Пяра з выбітым зубам” з верша англійскага паэта-сюррэаліста Хью Сайкса Дэвіса скіраваны ў сваім шырокім разуменні да свабодных асацыяцый і ўнутрана суадносяцца з вобразамі твораў на выставе. Аўтары, імкнучыся паглыбіцца ў філасофскія таямніцы быцця, усё ж успрымаюць больш знешнія праявы эстэтычнай свабоды ад маральнага прымусу, сцвярджаючы, што гармонія і розум — гэта падман. Таму ў Сяргея Сялецкага алагічна вырастаюць кветкі з яблыкаў, у Анатоля Скамарошчанкі стары буфет ціха згадвае іпастасі свайго лёсу, у Івана Русачака моцныя рукі падтрымліваюць у паветры старажытны карабель. Атмасфера непрадказальнасці пранізвае цыкл работ Уладзіміра Голуба, дзе фантомы жаночых мараў плаўна перацякаюць у хаатычнасць канструяванай прасторы, а вар’яцтва ўмоўна-раслінных людзей таго ж Сяргея Сялецкага як бы трансфармуецца ў абсурднасць сціснутага наваколля. Красамоўнае танга выконваецца касметычнымі флаконамі разам з аўтарам сюжэта Аляксандрам Балдаковым. Прарочыя сны таемнай асобы, схаванай Сяргеем Асапрылкам пад белы саван, узмацняюцца мроямі імператара, якія адпускаюцца на волю Сяргеем Грыневічам і падхопліваюцца разважлівай загадкавасцю перажыванняў Жанны Чыстай. Узлятаючы ў вышыню з сонечнасцю дня Пятра Янушкевіча, спантанныя думкі вянчаюцца каронай дзённага свяціла Валянціны Шобы. Зменлівыя ў сваіх настроях і паводзінах цацачныя фігуркі Вікторыі Ільіной ладзяць асабісты спектакль на падаконніку сусвету.

Арцём Мядзведзеў. “Дом”.


Аляксандр Бабянкоў. “Сальвадор Далі”.

Творцы прадстаўляюць гледачу свой погляд на арганічныя суадносіны рэальнасці і ілюзій, розуму і парадоксаў у існаванні чалавека. Палатно Валерыя Мартынчука “Масей”, якое асацыюецца з вядомым творам Зігмунда Фрэйда, партрэт Сальвадора Далі работы Аляксандра Бабянкова прымушаюць гледача апеляваць да ўстойлівых сусветных архетыпаў і асобаў. Містыфікацыйная вобразнасць Юрыя Якавенкі сімвалічна ўзыходзіць да магнетызму сярэднявечча, запрашаючы гледача ўвайсці ў краіну ілюзій. Па перыметры знешняга свету вандруюць вычварныя па сваіх пластычных канфігурацыях постаці, віртуозна зробленыя з металу Юрыем Мацко, з керамікі і металу — Валерыем Мартынчуком, з дрэва — Уладзімірам Панцялеевым. “Малекулярныя сувязі” з шамоту Яўгена Адзіночанкі асацыятыўна ўзнаўляюць унутраныя стасункі сучаснага мастацтва са стылістычнымі дасягненнямі еўрапейскай эстэтыкі.

У аснове канцэпцыі ляжыць ідэя сцвярджэння неабмежаваных духоўных магчымасцей чалавека ў неабсяжнай жыццёвай прасторы.

Марына ЗАГІДУЛІНА,
мастацтвазнаўца
Гродна

Тэатральная плошча

У рамках абменных гастроляў з Тэатрам юнага гледача Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы прывёз у Мінск дзве камедыі пра адвечны канфлікт бацькоў і дзяцей і два дзіцячыя спектаклі пра пазнавальных літаратурных персанажаў. Пра тое, як класічныя тэмы і новыя формы прыцягвалі гледачоў у залу, разважаюць рэдактар аддзела “К” Надзея БУНЦЭВІЧ і аглядальнік рэдакцыі Настасся ПАНКРАТАВА.

Абменныя гастролі: па якім курсе?

Брэст: варыяцыі на тэму бацькоў і дзяцей

Н.П.: — Гастролі распачынаў спектакль Цімафея Ільеўскага “Маладая сям’я здыме кватэру”. Мне падаецца, абраўшы сямейна-бытавую п’есу Міхаіла Рошчына, брэсцкі рэжысёр на 100 % патрапіў у сугучча з публікай. Людзям часта не хапае простай і нязмушанай размовы пра звыклыя рэчы, прычым у такім фармаце, калі над пралікамі іранізуюць, але за тыя памылкі не дакараюць і не асуджаюць. Цімафей Ільеўскі прапануе аўдыторыі паразважаць пра актуальны ва ўсе часы канфлікт бацькоў і дзяцей. Пасля вяселля ўсім трэба прывыкаць да існавання ў новых умовах: маладым вучыцца самастойна рабіць выбар, разумеючы наступствы кожнага кроку, бацькам — адпусціць пасталелых сыноў і дачок, дазволіць ім нават рабіць свае памылкі. І усім — да такой высновы прыходзіць галоўная гераіня Алена — вучыцца любіць і праз гэта ўзнімацца.

Н.Б.: — Рэжысёр прызнаўся, што вельмі доўга шукаў добрую сучасную п’есу на гэту тэму, але так і не знайшоў. У выніку звярнуўся да савецкай класікі, убачыўшы ў ёй сучасным не толькі змест, але і форму. І зрабіў папраўдзе філігранную працу з літаратурным тэкстам: калі не ведаць арыгінал, дык складзецца ўражанне, што яго ўвогуле не рэдагавалі.

Н.П.: — Рошчын распачынаў сваю п’есу з кароткага апісання: “Сучасная аднапакаёвая кватэра. Шмат фатаграфій”. Мяркуючы па ўбачаным, Цімафей Ільеўскі разам з мастаком Аляксандрам Балдаковым адштурхнуліся менавіта ад гэтых радкоў, калі стваралі сцэнічную прастору: аздабленне складаецца з прамавугольных экранаў розных памераў, на якія ўвесь час транслююцца фотаздымкі з умоўнага сямейнага альбома. Тут “справаздачы” з вяселляў (часам нават занадта стракатыя, што сваёй яркасцю адцягваюць увагу ад мізансцэн), стыльныя чорна-белыя фотапалотны, выявы дзяцей і закаханых, а таксама сэлфі, што робяць персанажы цягам усяго дзеяння.

Заяўленае пастаноўшчыкам азначэнне жанру “фотакамедыя кахання” вырашаецца вельмі проста: праз дзве камеры, размешчаныя на авансцэне, якія становяцца паўнавартаснымі ўдзельнікамі пастаноўкі. Праз відэатрансляцыю, што адразу вядзецца на экраны (з іх канструююць кожнае новае жыллё галоўных герояў), з маладымі размаўляюць іх родзічы і блізкія, праз відэатэлефанаванне галоўныя героі Алёша (Міхаіл Ілыч) і Алена (Таццяна Строк) імкнуцца данесці адзін да аднаго свае думкі, а то і проста разабрацца ў сабе. Сэлфі і відэаперамовы амаль фізічна сціскаюць кола вакол маладой сям’і, разрываючы герояў паміж абавязкам перад усімі (бацькамі, інстытутам, начальнікам на рабоце) і адказнасцю за сваю другую палову. Сцэнічная геаметрыя задае рытм дзеянню, як і закладзеная яшчэ ў п’есе хуткая змена часавых і геаграфічных кропак.

Н.Б.: — Відэакамеры ў сучасным тэатры выкарыстоўваюцца і куды больш “крута”, выклікаючы дыскусіі пра тое, ці варта замяняць тэатральныя прыёмы кінамастацтвам. Брэсцкі тэатр робіць тут хіба першы крок у бок тых жа польскіх эксперыментаў, прычым робіць яго вельмі “па-беларуску”, шукаючы “апраўданне” выкарыстанаму прыёму ў самой п’есе: героі займаюцца фатаграфаваннем.

Н.П.: — П’еса сярэдзіны 1970-х наблізана да сучаснасці і праз музычнае аздабленне Аляксандра Панасюка: драма адной сям’і разгортваецца пад хіты апошніх дзесяцігоддзяў. Спектакль заканчваецца хэпі-эндам, але выбраная для паклонаў кампазіцыя рок-гурта “Наўцілус-Пампіліус” не дае забыць, што колы кахання могуць любога расплюшчыць у блін.

Н.Б.: — Ну, сам гэты гурт сыходзіць каранямі таксама дзесьці ў канец 1970-х, хаця вядомым стаў толькі праз дзесяцігоддзе. Ды ўсё ж музыка, на мой погляд, дае больш шырокія асацыятыўныя шэрагі, бо выкарыстаны фрагменты і акадэмічных твораў — класічных і сучасных. Але ўся тая полістылістыка не пакідае ўражання эклектычнага “вінегрэта”, цытаты вельмі натуральна пераходзяць адна ў адну, нават на “стыках”, і працуюць на стварэнне адпаведнага эмацыйнага строю, выводзячы гісторыю на ўзровень вечных міфалагізаваных тэм: невыпадкова раптам гучыць мелодыя Глюка з оперы “Арфей і Эўрыдыка”.

Н.П.: — Расповед пра барацьбу за сваё асабістае шчасце працягнуўся ў спектаклі для дзяцей “Папялушка”. Рэжысёр-пастаноўшчык Дзяніс Фёдараў прапанаваў свой погляд на класічную казку Шарля Перо.

Н.Б.: — І пачаў з таго, што звярнуўся да нядаўняй п’есы рускамоўнага драматурга Таццяны Баевай з Казахстана, зрабіўшы сваю рэдакцыю тэкста.

Н.П.: — Ён вырашыў на першы план вывесці новых герояў. Удалым эксперыментам сталася бясслоўная роля каралеўскага ката Труфеля ў выкананні Багдана Хоміка.

Н.Б.: — Так, паводле п’есы кот — усяго толькі цацка, якую носяць героі. А тут ён “ажыў”, хаця штосьці іншае — скарацілася, а то і ўвогуле знікла. Самы запамінальны ход ва ўсім спектаклі — вялізны каціны хвост, які неаднаразова выкарыстоўваецца замест скакалкі.

Н.П.: — Такія персанажы-фрыкі актыўна выкарыстоўваюцца ў сусветнай поўнаметражнай анімацыі. Назіраючы за ўсім дзеяннем, герой, які перыядычна трапляе ў смешныя сітуацыі, на падмостках таксама выглядае цалкам арганічна. А вось увод у казку манернага Барбера (Вячаслаў Цыцкоўскі), правобразам якога відавочна стаў скандальны стыліст Сяргей Звераў, падаўся мне даволі спрэчным рашэннем.

Н.Б.: — Цырульнік-стыліст-візажыст ёсць і ў Баевай, але навошта было рабіць яго з намёкам на нетрадыцыйнасць — дзеля моды? З-за гэтага дзіўнавата выглядаюць і Кароль, і Прынц.

Н.П.: — Відавочна, Дзяніс Фёдараў рабіў стаўку на стварэнне шоу, і яно, бясспрэчна, удалося. Навідавоку ўсе чыннікі камерцыйна паспяховай пастаноўкі: маляўнічыя касцюмы, выкарыстанне спецэфектаў, тэкст, перасыпаны сучасным гумарам, шмат песень. Мастаку Таццяне Карвяковай удалося ўразіць дзяцей не сталася Мачаха. Цудоўная характарная актрыса Яніна Малінчык (яе моцная ігра не пакінула нікога абыякавым яшчэ ў папярэднім спектаклі па Рошчыну) надала шалапутнай Мачысе яркія фарбы, зрабіўшы вобраз не столькі адмоўным, колькі эксцэнтрычным і забаўным.

Н.Б.: — Дык я ў ролі “злога” крытыка? Ці проста глядзела той жа склад, але ў другі дзень, і таму ўсё іначай? Бо для мяне “Папялушка” атрымалася адбіткам “мыльных” расійскіх серыялаў з незразумелымі, пазбаўленымі логікі паводзінамі галоўнай гераіні. Пры настолькі жудасна парадыйных, проста-такі агрэсіўных мачысе і сёстрах, распараджэнні якіх пазбаўлены сэнсу, Папялушка паўстае… пазбаўленай не толькі характару, але і ўнутранага адчування чалавечай годнасці. Бо адна справа, калі яна баіцца ім пярэчыць, каб не нашкодзіць бацьку, каб не выгналі з дому і да таго падобнага, іншая — калі “проста так”. Складаецца ўражанне, нібы артысты не ведаюць, што ім рабіць, і “акварэльныя” фарбы абрысаў дамоў, скіраванне глядацкага позірку знізу ўверх, а не наадварот, функцыянальнасць кожнай дробязі. Можа, “пераказ сюжэта” быў наўмысны “фішкай”, але Малыш і Карлсан быццам змяняюцца месцамі: першы — “маленькі стары”, другі — “вялікае дзіця”. Ніякай філасафічнасці, тэмы скразной адзіноты. Фрэкен Бок — зусім не “домамучыцелька”, а модная, яшчэ даволі маладая (і, дарэчы, добрая па сваёй сутнасці) прыгажуня, у якой бываюць хіба незразумелыя “прыступы злосці”. Нягледзячы на моманты інтэрактыву і некаторыя акцёрскія выкрунтасы (зноў уражанне, што артысты прадастаўлены самім сабе), спектакль хіба выконвае функцыю летніх выязных паказаў (гэтак жа, як і “Папялушка” пасуе для навагодніх ранішнікаў). І ў чарговы раз пацвярджаецца даўно вядомая ісціна: добры дзіцячы спектакль — справа найскладаная, куды цяжэйшая за ўсе дарослыя.

Зусім іншы ўзровень — “Гульня кахання і выпадку” і іх бацькоў шыкоўнымі дэкарацыямі: аб’ёмным камінам з амаль сапраўдным агнём, казачнай карэтай з моднай падсветкай, што выязджала на сцэну на паваротным коле, каралеўскімі жырандолямі. Пастаноўшчыкам было прыдумана шмат цікавостак. Так, Хросная Фея (Таццяна Юрык) прылятала да Папялушкі на арэлях, кот шукаў мышэй у глядзельнай зале, служанку Жаржэту ў адной з мізансцэн ператварылі ў мыш, якая насілася па сцэне, быццам машынка з пультам кіравання.

Сцэна са спектакля “Маладая сям’я здыме кватэру”.

Але за знешнімі эфектамі гублялася кранальнасць галоўнага вобразу казкі. Тэма дабрыні, міласэрнасці, абавязковага здзяйснення запаветнай мары прыглушылася пад напорам стракатасці і палкасці астатніх герояў. Можа таму самым запамінальным персанажам для мя-

кожны паасобку шукае штосьці для свайго персанажа, не ўлічваючы агульны кантэкст. Сцэнічныя строі — хіба з прэтэнзіяй на “шык-бляск”, але таксама “ніякаватыя”, пазбаўленыя сапраўднага палёту фантазіі. Таму галоўнай дзейнай асобай становіцца… сцэнаграфія. І нават не згаданая карэта, а рознакаляровавузорыстыя шырмы, што падобныя да вітражоў у касцёлах і па сваіх абрысах нагадваюць свечкі. У адным гэтым — сапраўдны сэнс казкі Шарля Перо, у арыгінале прызначанай для дарослых: любіце хросных, якія заменяць вам бацькоў і стануць “добрымі феямі”. А ўсё астатняе — ні пра што.

Тое ж уласцівае і спектаклю “Малыш і Карлсан”, які пастаўлены Валянцінай Янавец. Зноў “руліць” сцэнограф Таццяна Карвякова са сваім удала знойдзеным творчым почыркам:

ў пастаноўцы генеральнага дырэктара — мастацкага кіраўніка тэатра, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Аляксандра Козака. Звярнуўшыся да камедыі французскага драматурга і празаіка XVIII стагоддзя П’ера дэ Марыво, з пастаноўкі якой і пачынаўся брэсцкі тэатр 70 гадоў таму, ён прапанаваў такі запатрабаваны сёння сінтэз мастацтваў. Дзеянне ўвесь час “мадулюе” да розных музычных жанраў: ад рэпа і эстраднай “папсы” да оперы, балета, меладрамы (у яе першасным сэнсе — як драматычнага дзеяння, размоўных маналогаў-дыялогаў на фоне музыкі). Гэты ўдалы ход, які надае спектаклю адметнасць, запісамі музычных нумароў не паляпшаецца: спевы пад “плюс” (а такія запісы тэатр выкарыстоўвае і ў іншых сваіх спектаклях) ствараюць рэзкі гукавы дысбаланс, парушаюць фонасферу. Дый артысты не ўмеюць “падстройваць” тэмбр свайго голасу пры пераходзе да “запісаных спеваў”, як гэта робіцца, да прыкладу, у тэлеверсіях аперэт, дзе граюць — адны, спяваюць — іншыя.

Сцэна са спектакля “Гульня кахання і выпадку”.

Сцэна са спектакля “Малыш і Карлсан”.


Яніна Малінчык у спектаклі “Папялушка”.

Н.П.: — Падводзячы вынікі, яшчэ раз павіншуем брэстчан з добрым “абменным курсам”.

Н.Б.: — Чатыры прывезеныя спектаклі склалі адзіную тэматычную лінію, надзвычай актуальную для такой пляцоўкі, як сцэна ТЮГа: бацькі і дзеці, паразуменне паміж імі. Пры ўсёй рознасці спектакляў, гастролі прадэманстравалі і такія асаблівасці тэатра, як добрая сцэнаграфія, але часам дзіўнаватыя сцэнічныя строі; імкненне да сучасных прыёмаў, але часам адсутнасць неабходнай матэрыяльнай базы, каб напоўніцу іх рэалізаваць; неабходнасць вытрымліваць мастацкі густ, не сыходзячы да пародыі на яго. Варта і надалей працаваць над маўленнем і пасылам голасу, каб не было бубнення сабе пад нос ці пераходу на крык, залішняга знешняга пафасу замест унутранай энергетыкі і эмацыйна-сэнсавай напоўненасці. Нарэшце, пошукаў (а ў палове выпадкаў — і рэальных знаходак) цікавых рэжысёрскіх “ключыкаў” да абранага драматургічнага матэрыялу. Відавочна, што тэатр развіваецца (у тым ліку, пад уплывам прыдуманага і ўжо колькі гадоў запар арганізаванага ім Міжнароднага тэатральнага фестывалю “Белая Вежа”) — і развіваецца ў актуальным еўрапейскім кірунку, нават звяртаючыся да “нефестывальных” спектакляў, разлічаных на самую шырокую публіку. K

Раскадроўка

Пакаленне прагматыкаў?

Новая карціна беларускага дакументаліста Андрэя Куцілы “25” прысвечана моладзі, якая нарадзілася ў час атрымання незалежнасці Рэспублікай Беларусь — 1990 — 1991 гады. Стужка спрабуе схапіць і зафіксаваць пэўны стан маладой краіны праз лёсы 25-гадовых герояў.

Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ

Кадр з фільма “25”.

Іх — характараў — дарэчы, у фільме пяць. І кожны — галоўны. Рэжысёр прызнаўся: “Перш, чым абраў гэтых персанажаў, пераглядзеў у сацыяльных сетках больш за сотню чалавек. Ведаў, хто мне патрэбны, і, адпаведна, шукаў падобных людзей”. З гэтай умоўнай сотні (у тым ліку тых, хто спачатку пагаджаўся, а потым адмовіўся) і “выкрышталізавалася” пяць партрэтаў-тыпажоў. Гамяльчанін, які працуе гастарбайтарам у Маскве, магілёўчанка, якая чакае дзіця, юнак з Баранавічаў, што збіраецца з’язджаць за мяжу, вясковы гаспадар з-пад Салігорска і дзяўчына-“развядзёнка” з двума дзецьмі з Мінска. Такая прадстаўнічая геаграфічная выбарка — выдатная асаблівасць рэжысёра, позірк якога пераважна скіраваны на жыццё па-за сталіцай. Але якое тое жыццё? Вось гэта пытанне і ставіць аўтар, скарыстоўваючы пэўную дыстанцыю і метад адхіленага назіральніка, каб урэшце разабрацца з тым, што адбываецца з намі, з краінай не толькі на побытавым, але і на сацыяльным ды метафізічным узроўні.

Ды прыкладу, гісторыя Крысціны. Дзяўчына — сірата, чые прыёмныя бацькі жывуць у Бельгіі. Яна аддала перавагу жыццю на радзіме, у Мінску. Выйшла замуж і нарадзіла першае дзіця ў 19 гадоў, другое — яшчэ праз паўтара года. Развялася. У яе ёсць кватэра, якую ёй прадаставіла дзяржава, яна водзіць дзяцей у садок. Сёння Крысціна падпрацоўвае нарошчваннем веек, але хоча паступіць на юрыста-міжнародніка.

Ілья з Гомеля. Яго скарацілі на мясцовай працы, але ён знайшоў падпрацоўку ў Маскве. Справы пайшлі добра: герой ужо набыў машыну, сёння займаецца тым, што набірае людзей, часам нашмат за яго старэйшых, на вахтавую працу ў суседнюю дзяржаву. “Пакуль гэта часова”, — абяцае ён сваёй дзяўчыне, каментуючы пастаянныя ад’езды.

Саша з вёскі Чапялі, што пад Салігорскам. Хлопец жыве на гаспадарцы, гадуе жывёлу, прадае малако дзяржаве. Рэжысёр дае паглядзець нам і на тое, як герой “апрацоўвае” забітага “кабанчыка”, як балюе з той нагоды. Гэты характар — дакладна ўпэўнены ў сваім наступным дні. Ён не адзін; яго жонка займае ў сям’і нібыта незаўважную, але адчувальную пазіцыю.

Цікава, што, здавалася б, розныя героі маюць у сваіх дамах амаль аднолькавы еўрарамонт; кватэры, лічы, пазбаўленыя індывідуальнасці. Нават мінчанка Крысціна — яе дом недзе ў адным са шматлікіх мікрараёнаў, якія могуць быць, лічы, у любой постсавецкай краіне. Пра такую прастору звычайна кажуць “спальныя раёны”.

Выключэнне, бадай, — Дзіма з Баранавічаў, які працуе інжынерам на заводзе і ў вольны час грае ў метал-гурце. У яго пакоі мы яшчэ заўважаем праявы субкультуры. Але менавіта гэты персанаж атрымлівае візу ў ЗША, каб паспрабаваць сябе на новым кантыненце, і з’язджае. Цікава, што Дзіму, здаецца, амаль усё задавальняла і на радзіме.

Апошні характар — Яна з Магілёва, якая чакае дзіця. На кухні той жа знаёмы еўрарамонт, простая вячэра з мужам — макароны і сасіскі. Дзяўчына прасуе адзенне для будучага малога. На першы погляд, аніякіх праблем, але “позірк” камеры на вясельнае фота Яны выдае нам будучую праблему: партнёр занадта маладзейшы за дзяўчыну на ментальным узроўні. Яго турботы пакуль — зарабіць грошай, а вось абавязкі бацькі — зусім не ў прыярытэце.

Перад намі — сённяшні маладыя сярэдні клас, прадстаўнікі большасці, якая звычайна не трапляе ў фокус увагі аўтараў, зацікаўленых у пасіянарыях. Але тым больш каштоўным тады становіцца кіно Куцілы, якое перамяшчае цэнтр увагі на гэту прадстаўнічую большасць, з якой таксама складаецца грамадства. Ці не?

Трэба аддаць належнае рэжысёру: яго камера — вельмі далікатны, але пільны інструмент, які “разразае” рэчаіснасць з хірургічнай дакладнасцю. Гісторыі яго герояў — дрэнныя ці нармальныя? Моладзь — актыўная ці пасіўная? Глядач дакладна сутыкаецца з адчуваннем няпэўнасці, збянтэжанасці — што ж адбудзецца потым з гэтай пяцёркай дваццаціпяцігадовых? Якімі будуць іх лёсы?

Мяркую, адказы на прапанаваныя пытанні кожны з гледачоў мусіць знайсці сам. Але, думаецца, гэты “надрэз” паўсядзённасці — важны досвед, які дазваляе ўсвядоміць (ці хаця б паспрабаваць тое зрабіць) сучаснасць “без прыкрас”. Перад намі, усё ж, пакаленне празаікаў, а не паэтаў. Пакаленне прагматыкаў, а не ідэалістаў. Яны глядзяць не ў неба, як у 1960-х, не наперад, як пакаленне 1990-х, — яны глядзяць пад ногі. “Я не раблю прагнозы адносна таго, што адбудзецца з гэтымі людзьмі потым, — адказвае Андрэй. — Я фіксую іх жыццё на дадзеным этапе. Урэшце, хто я такі, каб ведаць, што будзе далей?”. Так, прысуду тут няма, але ёсць адчуванне. Магчыма, прыземленасць “пакалення 25” — гэта тое, што ім і застаецца. K

Экспрэс-тур з V.I.P.-земляком: Салігорск

Набор вышыні, або За высокі

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Аляксей і паступіў. Праўда, у салігорскае вучылішча, якое рыхтавала шахцёраў, на спецыяльнасць "Машыніст горных выемачных машин". "Сасватаў" яго туды тата. Ён на сваім прыкладзе ведаў, што такое — хлеб музыканта, таму і вырашыў: няхай сын спачатку атрымае нармальную рабочую прафесію, якая прыносіць стабільны, а ў Салігорску яшчэ і высокі, даход, а ўжо потым... Тое "потым" наступіла праз год, у 2006-м. Скарыстаўшыся ад'ездам таты ў камандзіроўку, Аляксей забраў дакументы ды рвануў у Мінск, загадзя дамовіўшыся з адміністрацыяй вучылішча, што ў выпадку правалу яго прымуць назад. Правалу не адбылося, тата ўсё зразумеў і нават узрадаваўся...

За пару дзён да нашага прыезду ў Салігорск у Палацы культуры прайшоў вечар памяці Маі Хоміч, згаданай на пачатку. Аляксей не забыўся на яе ўрокі, і пакуль я гутарыў з нядаўна прызначаным дырэктарам ПК Наталляй Ільюшчыц, ён пад маленні тэлевізійнікаў стараўся адлюстраваць на сцэне якое-небудзь танцавальнае па. Атрымлівалася.

— Я прыйшла ў вельмі добрую ды дружную каманду з даўнімі моцнымі традыцыямі, — кажа Наталля Леанідаўна. — Галоўная мая задача — развіццё закладзенага раней.

А створана 20 калектываў, 8 з якіх носяць званні "ўзорны" ды "народны". Калі вы хочаце займацца харэаграфіяй, харавымі спевамі, музыкай вакальна-інструментальнай ды духавой, мастацтвам тэатральным або выяўленчым, то вам — сюды. Колькі б вам ні было (кіраўніку студыі выяўленчага мастацтва 75 гадоў, а самым маленькім "гурткоўцам" — па тры). Практычна ўсе групы — бясплатныя. Выкладаюць у іх людзі вопытныя, мясцовыя. Маладыя спецыялісты, адпрацаваўшы належны тэрмін, стараюцца вярнуцца на радзіму ці замацавацца ў Мінску або ў іншых "цэнтравых" гарадах — справа зразумелая па цяперашнім часе. Не вабіць іх нават "асаблівы статус" Салігорска — у разуменні многіх беларусаў населенага пункта вельмі "грашовага".

— Яны нам патрэбныя хаця б праз тое, што з'яўляюцца носьбітамі новых павеваў у мастацтвах, — тлумачыць Наталля Леанідаўна. — У выкладчыках вакалу мы зацікаўленыя. Мару ўсё ж прывабіць да нас "бальніка", якіх і так выпускаецца вельмі мала, ды стварыць калектыў бальнага танца.

Спадарыня Ільюшчыц распавяла, што і матэрыяльна-тэхнічную базу палаца можна было б палепшыць. Распрацоўваецца пытанне па перабасталяванні яго сучаснай гукавой ды светлавой тэхнікай.

Ну а што да мерапрыемстваў, дык Палац загружаны: мімаходзь азнаёміўшыся з афішамі, убачыў анонсы канцэртаў Беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры" ды Сяргея Скачкова — саліста "залатога" складу пецярбургскага гурта "Зямляне".

Не толькі "па джазу"

Вяртаемся ў Дзіцячую школу мастацтваў. Грос у свой час збіраўся навучацца тут ігры на гітары, аднак, з-за даўжыні пальцаў на дагалонях ды яшчэ і з прычыны асаблівай любові да ўдарных іх сакрэты Аляксей і стаў спасцігаць. У ДШМ ён правучыўся 6 гадоў, да таго ж, па меры ўзрастання ўласнага майстэрства, граючы і ў яе ансамблі. Майстэрства Аляксей паднабіраўся і ў Мінску, прыязджаючы разам з навучэнцамі школы на джазавыя фестывалі, якія арганізоўваў Міхаіл Фінберг, слухаючы барабаншчыкаў — беларускіх ды замежных. Вынесенае адтуль і выпрацаванае ўжо ім самім Грос дэманстраваў на канцэртах у Салігорску.

— У перспектыве бачыў сябе бубначом-спеваком, — прызнаецца Грос. — І не пакідаю сваёй мары дагэтуль: магчыма, у якім-небудзь сольным канцэрце і спалучу ігру на ўдарных са спевам.

Пра Салігорскую дзіцячую школу мастацтваў сёння існуе два меркаванні: хтосьці лічыць яе адной з лепшых у краіне ў сваім сегменце, хтосьці — проста лепшай. Да апошняга, натуральна, схіляецца і яе дырэктар Алег Шчэрбаў, які ўзначальвае ўстанову больш за 10 гадоў:

— Пра эксклюзіўнасць сведчыць хаця б той факт, што тут праходзіць адзіны ў краіне Міжнародны конкурс джазавай і эстраднай музыкі "Jazz-Time", у якім спаборнічаюць дзеці (*пра тэхналогію яго правядзення — у "К" № 21.* — **А.К.**). І наогул аналагаў нам у Беларусі няма: мы самая рознабаковая, падрыхтаваная ды эфектыўная школа. Колькі за год можа зарабіць такая ўстанова, як наша? Мы летась зарабілі мільярд рублёў, у асноўным — канцэртнай дзейнасцю. У год заваёўваем парадку 70 — 80 узнагарод на разнастайных фестывалях ды конкурсах, якія праводзяцца як у краіне, так і за мяжой.

У школе займаецца 590 чалавек за кошт сродкаў бюджэту (пры закладзенай лічбе ў 350) ды больш як сто асоб, якія аплачваюць навучанне. Спраўляюцца з такой "гвардыяй" з дапамогай групавых заняткаў ды іншых хітрых камбінацый: а што рабіць, калі дзеці так імкнуцца ў ДШМ?! Да іх паслуг харавое, харэаграфічнае, тэатральнае, струнна-смычковае, фартэпіяннае (класіка ды джаз), эстраднае (розныя інструменты ды вакал), народнае (фольк ды этна) аддзяленні. Ва ўстанове ёсць уласны швейны цэх, майстэрня па вырабе дэкарацый.

А цяпер набярыце паболь паветра ў лёгкія... Максімальная заработная плата дасведчанага выкладчыка

"Тэст" барабаннай устаноўкі ў Салігорскай дзіцячай школе мастацтваў.

Дырэктар кінатэатра "Зорка Венера" Іна Герасімава.

Дырэктар Дзіцячай школы мастацтваў Алег Шчэрбаў.

Дырэктар Палаца культуры Наталля Ільюшчыц.

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Шаркаўшчына /

Усе музыкі ды паэты

У адзін дзень супалі два святы: па праваслаўным календары — святы Мікола, а па каталіцкім — найсвяцейшая Троіца. Менавіта гэту дату і выбралі для сустрэчы два народныя творчыя калектывы раёна: літаратурна-музычнае аб'яднанне "Світанак" з Шаркаўшчыны і фальклорны гурт "Купалінка" з Каўшэлеўскага дома фальклору.

Выступленне "Купалінкі", дарэчы, немагчыма ўявіць без віртуознасці баяніста-самародка Леаніда Адамёнка. Дый сам Дом фальклору — нестандартны. Сабраны тут прадметы мясцовага побыту, да прыкладу, шлюбны вэлюм, зроблены па ўспамінах каўшэлеўскіх бабуль.

Загадчык Дома фальклору Надзея Вайцюль дае мне слова, як кіраўніку народнага літаратурна-музычнага аб'яднання "Світанак". Знаёмлю прысутных са "світанкаўцамі", якія прыбылі на сустрэчу: літаратары Міледзій Кукуць, Уладзімір Мілянцей, Віктар Лагун, Людміла Ардынская, Надзея Паляк, Ірына Тарбецкая, вучаніца Святлана Клімза, спявачка і паэтка Ала Міхайлава. Вакальная група "Купалінкі" тым часам выканала песню на словы і музыку Людмілы Ардынскай. Потым Святлана Клімза і Ала Міхайлава выканалі гімн "Світанка", які напісалі ўдзельнікі аб'яднання.

Зацікавіўся вершамі мясцовых паэтаў удзельнік мастацкай самадзейнасці раёна Іван Гарбачонак. Ён спецыяльна прыехаў на свята, каб падшукаць верш для сваёй наступнай песні. А перад гэтым праспяваў адну з ранейшых на словы Міледзія Кукуця. Актыўна выступалі і ўдзельнікі фальклорнага калектыву Лідзія Верашчака, Наталля Руць, Ядвіга Туронак, Лёля і Барыс Руткоўскія. Дарэчы, Барыс выдаў сваю кнігу ўспамінаў пра службу на падводнай лодцы.

Напрыканцы дзеі, за кубачкам гарбаты, выступіла намеснік кіраўніка ААТ "Жвіранка" па ідэалагічнай рабоце Ганна Бездзель. Дарэчы, гаспадарка аказала спонсарскую дапамогу згаданаму мерапрыемству.

Кацярына СОСНА,
паэтка, кіраўнік народнага літаратурна-музычнага аб'яднання "Світанак"

Масты / Гарбата ад Элізы

Сёлета мы адзначаем 175-годдзе з дня нараджэння Элізы Ажэшка. Творчую спадчыну сусветна вядомай пісьменніцы складаюць шматлікія раманы, аповесці, апавяданні. Многія творы Ажэшка напісала на мастоўскай зямлі: "Над Нёманам", "Хам", "Дзюрдзі".

У нарысе "Людзі і кветкі над Нёманам", дзе апісаны лекавыя зёлкі, а таксама дадзены прыклады вуснай народнай творчасці, гераіняй з'яўляецца знахарка з вёскі Глядавічы. У Лунненскім касцёле Святой Ганны захавалася ложа Элізы Ажэшка.

Мастоўская раённая бібліятэка распачала цыкл мерапрыемстваў, прымеркаваных да юбілейнай даты. Праект быў добра прарэкламаваны. А месцам рэалізацыі задуманага стала пляцоўка пад дубам ля бібліятэкі. Падчас тэатралізацыі шматлікіх гасцей сустрэла аніматар у вобразе гаспадыні свята — Элізы Ажэшка. Гучалі ўрыўкі яе прозы, вершаў. Іх выконвалі беларускія і польскія літаратары, а таксама члены гродзенскага Клуба сяброў Элізы Ажэшка.

Знайшлася справа і для дзяцей: на вуліцы дзейнічала гульнявая пляцоўка. З музычным нумарам выступілі выхаванцы мясцовага Цэнтра карэкцыйнага развіцця і рэабілітацыі. А тым часам у літаратурнай гасцёўні бібліятэкі школьнікам быў прапанаваны відэафільм. (Ажэшка, дарэчы, любіла дзяцей, якія цягнуліся да яе, асабліва сіраты і беспрытульныя.) Падтрымалі свята і ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Мастоўскага раённага цэнтра культуры. Працавалі кніжныя выставы. А фітабар з духмянымі напоямі называўся "Гарбата ад Элізы".

Сяргей ДЗЕЙКАЛО,
начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мастоўскага райвыканкама

Падчас фестывалю "Танцавальны колазварот".

Ліда / Каб чыталі дзеці больш

У Лідскай раённай бібліятэцы імя Янкі Купалы прайшоў "круглы стол" пад назвай "Бібліятэка, школа і сям'я: вопыт, ідэі і падыходы". Яго арганізаваў аддзел бібліятэчнага маркетынгу. Мерапрыемства прымеркавана да рэспубліканскай акцыі "Сямейнае чытанне".

Адзін з найістотных фактараў развіцця дзіцяці і ўзбагачэння духоўнага свету сям'і — чытанне. Як зрабіць яго нефармальным, нязмушаным і жаданым? Менавіта пра гэта і вялася гаворка, у якой бралі ўдзел бацькі юных чытачоў, педагогі і бібліятэкары горада.

Напярэдадні аддзел маркетынгу падрыхтаваў відэафільм "Сямейнае чытанне вачыма дзяцей і бацькоў", дзе былі абагульнены вынікі апытання сярод 30 навучэнцаў 1 — 4 класаў і ста бацькоў. Удзельнікі "круглага стала" пераканаліся, што 2 % бацькоў (з агульнай колькасці

“культурны” заробак трэба...

Па Салігорску з Аляксеем Гросам — беларускім удзельнікам конкурсу “Славянскага базару...”

дасягае тут 10 мільёнаў рублёў, малады (“нулявы”) спецыяліст атрымлівае 3 — 5 мільёнаў. Але за гэтыя грошы трэба пра-ца-ваць! Выконваючы, акрамя сваёй асноўнай працы, і дадатковую. Выпадковых людзей у школе не трымаюць, а не выпадковыя, якія прайшлі нешта накшталт унутранага прафесійнага адбору, “аруць” — з раніцы да позняга вечара.

— Гэта значыць, усё ў вас у ажуры, Алег Аляксандравіч?

— Калі б!.. Музычныя інструменты зношаныя на 90 %. Баяны ў нас у краіне выпускаюцца? Віяланчэлі, фартэпіяна? Не. На ўсю школу ёсць толькі адзін раяль. А вы ведаеце, у колькі абыдуцца новыя інструменты, калі іх набываць за мяжой, а потым афармляць увоз? Ніякіх мільярдаў не хопіць. Таму набываем усё “былое ў карыстанні”. Конкурс “Jazz-Time” грыміць далёка за межамі Беларусі. Але светлавога ды гукавога абсталявання, адпаведнага яго ўзроўню, узроўню запрошаных гасцей (часам з сусветна вядомымі імёнамі), у школе няма. Праўда, лічбавы канцэртны пульт мы набылі.

Мае патрэбу ДШМ ва ўласным транспарце. Выкручваюцца арэндай, якую часам аплачваюць і бацькі вучняў, што часткова фінансуюць і замежныя паездкі сваіх дзяцей. Але, пералічваючы праблемы, галоўную з іх спадар Шчэрбаў бачыць у наступным. Неардынарная школа, на яго думку, патрабуе неардынарных адносінаў да сябе. Прасцей кажучы, яна павінна быць цалкам укамплектаваная неабходнымі ёй гукарэжысёрамі, святлотэхнікамі, работнікамі сцэны, мастаком-афармляльнікам, мастаком-дэкаратарам, мастаком-сцэнографам. Але тыпавы штатны расклад, які распаўсюджваецца на такія ўстановы, іх мець не дазваляе.

Чаго замала?..

Найважнейшым з мастацтваў для маленькага Лёшы з’яўлялася не толькі кіно, але і спадарожныя яму велізарныя яркія афішы, што ананасавалі сеансы ў кінатэатры “Зорка Венера”. На мульцікі ды фільмы яго вадзілі мама, тата ды бабуля, якая жыве побач.

— Да гэтага часу памятаю надзвычайны смак марожанага ў кавярні кінатэатра, — дзеліцца Аляксей. — Толькі з-за яго аднаго можна было хадзіць у кіно. А яшчэ там праходзілі выставы жывёл, разбівалася нешта кшталту маленькага заапарка — з малпачкамі, птушачкамі. Калі я падрос, скончыў 8 клас, стаў “тусіць” на дыскатэках, што праводзіліся ў “Зорка Венера”. Так для мяне адкрылася акно ў дарослы свет — першае запрашэнне дзяўчынкі на павольны танец (я нярэдка запрашаў дзяўчынак, якія былі за мяне вышэйшыя ды на 2 — 3 гады старэйшыя), новыя закаханасці (я такі!). Трапятанне, перажыванні — усяго ставала.

І ўсё ж: сярод жанраў будучы беларускі ўдзельнік конкурсу “Славянскага базару...” аддаваў перавагу камедыі накшталт хітоў “Маска”, “Адзін дома”. Натуральна, падабаліся музычныя фільмы, напрыклад, “Сабор Парыжскай Божай Маці”.

Дыскатэкі сёння ў кінатэатры не праходзяць: яны атабарыліся ў забаўляльных цэнтрах. Затое ў «Зорцы...” ёсць кафэ-бар, якое дае важкую грашовую прыбаўку да агульнай выручкі (яе забяспечваюць 2 залы — вялікая на 700 месцаў ды малая (з V.I.P.-крэсламі ды V.I.P.-канапамі) на 50 месцаў, 5D-атракцыён, аэрахакей).

— Іна Міхайлаўна, — запрашаю да гутаркі дырэктара кінатэатра Іну Герасімаву, — беларускі кінапракат у 2015 годзе не далічыўся амаль мільёна гледачоў. А як справы ў вас?

— Пра адток казаць не даводзіцца. А вось сама публіка змянілася: раней аўдыторыя была пераважна сямейнай, цяпер жа актыўна ходзіць моладзь. У будні дзень, у сярэднім, нас наведвае 75 — 100 чалавек, а пачынаючы з пятніцы, вядома, больш.

Асноўную касу прыносіць масавае кіно, на беларускае гледачы маглі б ісці лепш. Кінатэатр увесь час арганізуе для іх сустрэчы са здымачнымі групамі нашых новых фільмаў у дні прэм’ерных паказаў, але... Пытанне ў якасці прадукцыі? “Думаю, так, — згаджаецца спадарыня Герасімава. — Гэта адносіцца нават да “Мы, браты…”, які з ідэалагічнага пункту гледжання мяне задавальняе, у астатнім жа...”

Пры тым, што тэндэнцыі да адтоку гледачоў у “Зорцы Венеры” не назіраецца, у кінатэатры пра наведвальнасць турбуюцца. Так, некалі перад пачаткам дзіцячых сеансаў у ім ладзілі міні-спектаклі з удзелам артыстаў беларускіх тэатраў, праходзілі акцыі “Ноч вялікага кіно” — з віктарынамі ды розыгрышамі падарункаў. Займаецца ўстанова і дабрачыннасцю, калі з нагоды ўрачыстых дзён ветэраны могуць паглядзець кіно бясплатна, гэткія ж дабрачынныя сеансы праводзяцца для дзяцей-інвалідаў ды дзяцей-сірот.

Цяпер кінатэатр знаходзіцца на стадыі рамонту ды абнаўлення. Ідучы насустрач пажаданням наведвальнікаў, залы стануць больш камфортнымі, у іх усталююць больш элегантныя крэслы, пашырацца праходы паміж радамі, з’явіцца падсветка. Праектная дакументацыя амаль гатовая, і ў верасні павінна стартаваць рэканструкцыя вялікай залы.

— Пры ўсёй любові да гледача, хвалюе агульны культурны ўзровень публікі, — зазначае дырэктар установы. — Жавальная гумка, налепленая на крэслы ды канапы, — з’ява штодзённая.

Можа, у Год культуры фанаты “Wrigley’s Spearmint” прыслухаюцца да гэтых словаў Іны Герасімавай?..



Сяргей Андрыянаў і Аляксей Грос: сэлфі на памяць ля кінатэатра “Зорка Венера” ў Салігорску.

Бывай, Салігорск!.. І добры дзень!

Пасля адбыцця ў сярэдзіне “нулявых” у Мінск, дзе Аляксей не першы год з’яўляецца артыстам прадзюсарскага цэнтра “Спамаш”, ні ў Палацы культуры, ні ў ДШМ, ні ў адзіным у горадзе кінатэатры ён не бываў. Таму спатканне з імі ўсхвалявала нашага героя. Прыязджаючы ў Салігорск, спявак увесь кароткі час знаходжання ў ім выкарыстоўвае для сустрэч са сваякамі.

— Яшчэ нядаўна мяне ўвесь час запрашалі выступіць дзе-небудзь у Салігорску, а я, выбачаючыся ўсімі магчымымі спосабамі, адмаўляўся, спасылаючыся (і гэта сапраўды так) на занятасць, — гучыць новае прызнанне Гроса. — Цяпер ужо не клічуць. Хаця не: мой настаўнік па ўдарных Аляксандр Трафімовіч нядаўна зазначыў у інтэрв’ю аднаму з тэлеканалаў, што Дзіцячая школа мастацтваў чакае мяне. Гэта было б вельмі адказным рашэннем — выступіць у сваім горадзе... Вось я зараз пра гэта кажу і ўжо хвалююся... Але як толькі падрыхтую сольную праграму, абавязкова сюды прыеду з канцэртам. А як артыст, магчыма, і раней!

— Па якім Салігорску ты сумуеш? — пытаюся напрыканцы Гроса.

— Па тым, калі “на фантане” ў цэнтры горада, штовыхадныя граў “жывы” аркестр. Людзі прыходзілі, слухалі, танцавалі, мы — маладыя, таксама там “тузаліся” па-свойму. Цяпер, здаецца, такога ўжо і няма, прынамсі, у ранейшых маштабах...

Сапраўды, зараз на гэтым месцы штогод, кожныя выхадныя з мая па верасень па жаданні гараджан ды гасцей Салігорска праходзяць бясплатныя вечары танцаў “У парку чатырох стыхій”, арганізаваныя Палацам культуры. Прычым, да “жывой” музыкі дадалася дыскатэка, так што маштабы, атрымліваецца, нават павялічыліся!

Ну і скончу гэты артыкул на ноце вясёлкавай, праўда, спачатку Аляксей выдаў руладу песімістычную:

— Сумна, што з беларускай культуры, з краіны паранейшаму з’язджаюць прафесіяналы. У першую чаргу, вядома, маю на ўвазе музыкантаў — ведаю, пра што кажу. Але ў цэлым на айчынную культуру я гляджу з аптымізмам. Яна развіваецца, чаму пацвярджэннем служыць, да прыкладу, тое, што сёння адбываецца з беларускай мовай, якая відавочна знаходзіцца ў трэндзе. Хацелася б большай “дзвіжухі”, па ўсіх кірунках культуры, але станоўчыя тэндэнцыі асабіста я бачу. Зараз у іх ідуць нейкія акуратныя перастраенні, змены арыенціраў, вектараў, калі нацыянальнае пачынае браць верх усё больш выразна. Я б пазначыў гэтыя працэсы як падманлівае зацішша, набор вышыні перад прарывам. Веру ў будучыню нашай культуры, у хуткія яркія поспехі ды ўдачы тых, хто яе творыць!

Фота аўтара

К

Аніматар у вобразе Элізы Ажэшка.

Падчас акцыі-віншавання ў Шчучыне.

апытаных) не чытаюць увогуле, а дзесяць працэнтаў дзяцей не імкнуцца падзяліцца з бацькамі ўражаннямі аб прачытаным.

Дык як паправіць становішча? Агульнымі намаганнямі настаўнікаў, бібліятэкараў і бацькоў, якія актыўна чытаюць, была выпрацавана праграма далейшых дзеянняў. У адпаведнасці з ёй павялічыцца колькасць школьных бацькоўскіх сходаў з адпаведнай тэматыкай, больш насычанымі і прывабнымі стануць бібліятэчныя мерапрыемствы, індывідуальныя гутаркі з бацькамі. Вырашана таксама зрабіць традыцыйнымі святы так званага громкага чытання, калі з літаратурнымі творамі перад грамадствам будуць выступаць вядомыя ў раёне асобы.

Дар’я МАРЦІНКЕВІЧ,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Лідскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы

Полацк / Вершы open-air

Завяршыўся творчы іміджавы праект — Паэтычны open-air “Вершы над горадам”, арганізаваны раённай ЦБС. З красавіка цягам нядзельных дзён доўжыліся міні-спектаклі, флэшмобы, выставы, выступленні пісьменнікаў, скіраваныя на прапаганду кнігі і чытання.

На гэтым літаратурныя акцыі не скончыліся. З 2 па 5 чэрвеня падчас Дня горада, 1154-годдзя Полацка, праходзіць III Міжнародны форум “Славянская ліра”. У цэнтры яго ўвагі — мастацтва слова і літаратура. З Украіны, Венгрыі, Расіі, Фінляндыі, Латвіі, Літвы, Францыі, Казахстана, Вялікабрытаніі ды іншых краін прыехалі не толькі літаратары, але і бібліятэкары, рэжысёры, сцэнарысты.

Адбываюцца конкурсы ў намінацыях “Паэзія”, “Філасофская лірыка”, “Малая проза”, “Мастацкі пераклад”, “Драматургія”, а таксама — майстар-класы, скажам, па вершаскладанні…

Праведзена канферэнцыя па пераемнасці класікаў і літаратараў-пачаткоўцаў. Пісьменнікі выступалі перад полацкай грамадой на гарадскіх вуліцах і плошчах. Бібліятэка-філіял № 9 Полацкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы (установе прысвоена імя пісьменніка і ганаровага грамадзяніна Полацка Алеся Савіцкага) займее на сваім фасадзе мемарыяльную дошку. Будзе ўручана літаратурная прэмія імя творцы… Асноўная ж мэта форуму — захаванне і развіццё беларускай і рускай моў, умацаванне творчых стасункаў паміж краінамі. Арганізавалі “Славянскую ліру" Полацкі райвыканкам, мясцовая РЦБС, літаратурны саюз “Полацкая галіна”.

Андрэй СТАРЖЫНСКІ

Гродзеншчына / Колазварот... у танцы

29 мая ў аграгарадку Верцялішкі Гродзенскага раёна адбыўся рэгіянальны фестываль танца “Танцавальны колазварот”. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел творцы раёна і госці з Літвы.

Акцыя распачалася шэсцем харэаграфічных калектываў, пасля чаго ўсе прысутныя маглі пабачыць выступленні шматлікіх танцавальных калектываў раёна. Сваімі самабытнымі танцамі ўсіх парадаваў народны ансамбль танца “Лаздзія” з літоўскага Лаздзіяя.

Акрамя таго, падчас мерапрыемства Верцялішкаўская сельская бібліятэка прапанавала ўдзельнікам і гасцям фестывалю паглядзець мабільную выставу, прысвечаную выдатным танцавальным калектывам не толькі нашага Цэнтра культуры, але і ўсяго раёна. А напрыканцы святочнай імпрэзы адбылася конкурсна-забаўляльная праграма “Танцавальны батл” ды дыскатэка.

Ганна СІМАНЕНКА,
намеснік дырэктара Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра

Шчучыншчына / Дзе Бімка, там і Бомка

У Шчучыне адбылася традыцыйная акцыя-віншаванне, прысвечаная Міжнароднаму дню абароны дзяцей.

Супрацоўнікі Шчучынскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці падарылі свята тым дзецям, якія знаходзяцца на стацыянарным лячэнні ў дзіцячым і інфекцыйным аддзяленнях раённай бальніцы, а таксама наведалі ў радзільным доме жанчын, якія ўжо сталіся мамамі. Дзяцей чакаў сапраўдны сюрпрыз: іх наведалі клоўны Бімка і Бомка, якія правялі для іх цікавую забаўляльную праграму. Дзякуючы клоўнам, дзеці выправіліся ў казачную вандроўку на паравозе, што спыняўся на вясёлых і пазнавальных станцыях.

Мерапрыемства завяршылася віншаваннем маленькіх пацыентаў з Днём абароны дзяцей. Удзельнікі акцыі ўручылі дзецям салодкія падарункі, а таксама пажадалі хуткага выздараўлення і цікавага летняга адпачынку.

Асіят ХАЙБУЛАЕВА,
загадчык сектара па нестацыянарным абслугоўванні насельніцтва Шчучынскага РЦКіНТ
Фота Алены БАРЭЛЬ

Як у дарослых, але больш шчыра

Сталічная галерэя "Універсітэт культуры" спрычынілася да мерапрыемстваў Міжнароднага тыдня мастацкай адукацыі UNESCO выставай работ навучэнцаў мінскіх дзіцячых школ мастацтва "Палітра талентаў". Экспазіцыю склалі ўзоры жывапісу, малюнку, скульптурнай пластыкі і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва выхаванцаў Дзіцячай мастацкай школы №1 імя Віталя Цвіркі, Дзіцячай музычна-мастацкай школы №1, Дзіцячых мастацкіх школ №2 і №3 сталіцы.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ



Уладзімір Баран. "Навагодняя вечарынка".

Надзея Хмялыніцкая. Частка трыпціху "Выратаванне. Думкі. Ачышчэнне".

Лізавета Бязносік. "Я і час".

Ужо тое, што работы, перш чым трапіць на выставу, прайшлі некалькі стадый адбору — спачатку ў родных сценах, потым у галерэі, — сведчыць, што яны лепшыя паводле крытэрыяў навучальнага працэсу. Гэта свайго кшталту рэклама згаданых школ, дэманстрацыя творчага патэнцыялу не толькі вучняў, але і настаўнікаў.

З пабачанага я зрабіў выснову, што стасункі паміж тымі, хто вучыць, і тымі, хто вучыцца, даволі дэмакратычныя. Выкладчыкі не ставяць за мэту загнаць вучняў у жорсткія рамкі стандарту. Хутчэй наадварот — спрыяюць раскрыццю іх здольнасцей у тым напрамку, які вучні праз спробы і памылкі, асэнсавана ці спантанна самі ж і абралі. Так вучыць цяжэй, аднак вынік навучання праз гэта значна лепшы. Вучні ж у якасці эстэтычных арыенціраў абіраюць сабе не тое адносна шчыльнае кола твораў і творцаў, на якіх ужо не адно стагоддзе трымаецца рэалістычная школа, а бадай увесь даступны нам досвед выяўленчага мастацтва. На выставе пераважаюць работы, дзе сюжэт раскрываецца праз звыклую апавядальнасць. Аднак шэраг аўтараў, прадстаўленых у экспазіцыі, рэалізуюць у жывапісе, малюнку і ўзорах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва сваю цікавасць да містыкі і міфалогіі.

Тыя праявы візуальнай культуры, што для бацькоў сённяшніх школьнікаў былі з пэўных прычын увогуле недасягальнымі альбо ўяўлялі экзотыку, зараз наша рэчаіснасць. Інфармацыйны выбух змяніў культурныя прыярытэты, якія дзесяцігоддзямі здаваліся непахіснымі. Пры гэтым у мастацтве неймаверна пашырылася кола ўзораў для запазычанняў і кампіляцый. Прынята лічыць, што першым штуршком да творчасці з'яўляецца ўсведамленне прыгажосці навакольнага свету — наіўнае, але шчырае. Напачатку чалавек не імкнецца інтэрпрэтаваць свет, а толькі намаляваць як ёсць, як бачыць. І гэта, мяркую, абавязковая стадыя ў станаўленні таленту. Але сёння ў нашай рэчаіснасці значна пашырыўся віртуальны чыннік. У выяўленчым мастацтве гэта азначае наступнае: для чалавека з творчымі схільнасцямі становіцца натуральным звяртацца не да ўласных уражанняў і пачуццяў, але да ўжо вядомых інтэрпрэтацый. Карціна на сцяне ці рэпрадукцыя ў альбоме замяняе яму візуальны і эмацыйны кантакт з рэчаіснасцю. І гэта не толькі ў творах сталых мастакоў бачна, але і ў работах дзяцей, што ўпершыню бяруць у рукі пэндзаль ці аловак. Я маю на ўвазе якраз выставу "Палітра талентаў".

Як па мне, дык няцяжка скласці каталог стылёвых запазычанняў у работах згаданай экспазіцыі. Але ў гэтым няма патрэбы. Хопіць канстатацыі таго, што навучэнцы мастацкіх школ у сваім юным узросце ўжо арыентуюцца ў гістарычных выяўленчых брэндах і могуць, у межах сваёй дасведчанасці і пачатковых прафесійных навыкаў, інтэрпрэтаваць іх для ўласных патрэб. Многае робіцца на падсвядомым узроўні, аднак ёсць і асэнсаваны зварот да тых ці іншых чыннікаў візуальнай культуры. Увогуле выстава адлюстроўвае як стан, так і тэндэнцыі нашага мастацтва не ў меншай ступені, чым экспазіцыі дарослых мастакоў. Хіба што дзеці, у адрозненне ад дарослых, рэагуюць на рэчаіснасць больш эмацыйна і шчыра. Да таго ж, дзіцячая свядомасць не прымае псіхалагічных адценняў.

Міні-габелены "Тэатр". Калектыўная работа

Часта можна пачуць, што сёння ў Беларусі сюжэтная станковая карціна перажывае крызіс, і хутка папросту не застанецца мастакоў, здольных прафесійна закампанаваць на палатне дзве-тры фігуры. Але, мяркуючы па тым, як шмат надаецца ўвагі сюжэтнай кампазіцыі ў праграме мастацкіх школ (а гэта першая ступень галіновай адукацыі), такі жанр будзе мець у нашым мастацтве працяг. Сюжэты юныя мастакі бяруць як са сваёй рэчаіснасці, так і з кніг. Вартым увагі падаўся мне пейзажны жывапіс, прадстаўлены ў экспазіцыі. Пераважаюць гарадскія матывы, канкрэтна — Мінск. Разам з тым, знак часу, знак адкрытасці свету — краявіды далёкага замежжа, маляваныя з натуры. Скульптура прадстаўлена сціпла, але работамі даволі выразнымі. Яны глядзяцца як эскізы будучых грунтоўных твораў.

Найбольш эфектна глядзіцца раздзел дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Тут дамінуюць прыродныя матывы, увасабленне пор году, вобразы стыхій — вады, зямлі, паветра. Увесь той набор, да якога мы прызвычаіліся на выставах дарослых мастакоў. Цікавым для навучальнай практыкі ўяўляюцца тут вопыт калектыўнай работы, узоры якой прадстаўлены ў экспазіцыі. Цэламу класу выдавалася адна тэма і загадзя агаворваўся фармат, каб зробленае рознымі аўтарамі можна было сумясціць у адзінай кампазіцыі. Атрымаліся даволі эфектныя працы, што вельмі пасуюць выставачнаму кантэксту. Асабліва ў гэтым сэнсе мне спадабалася ткацтва: скампанаваныя разам шэраг міні-габеленаў. Ткацтва — гэта вельмі цяжкая праца і для сталага майстра, не гаворачы ўжо пра падлетка, які толькі распачаў нялёгкі шлях у прафесійнае мастацтва.

Пра большасць удзельнікаў выставы можна сказаць, што яны ўжо маюць веды і навыкі, каб бавіць мастацтвам вольны час і ўдзельнічаць у выставах аматараў. У некаторых жа адчуваецца накіраванасць на далейшую вучобу. Магчыма, праз пэўны час мы пабачым іх сярод студэнтаў нашай мастацкай акадэміі. Пры гэтым яны непазбежна страцяць тую наіўную шчырасць, што вабіць у іх работах дарослых гледачоў, якія ўжо забыліся, што калісьці былі дзецьмі.

К

Імідж бібліятэчнай прасторы

Хмарачос у аграгарадку і "Ліфт у дэтэктыў-клуб"

Хто пра што, а я пра творчы складнік бібліятэкарскай прафесіі, якая абавязвае генераваць навацыі, крэатыў. Нядаўна вярнулася з калегамі пасля чарговага наведвання філіялаў, у асноўным аграгарадоцкіх, і прывезла ў рабочым нататніку не толькі запісы: рэкамендацыі, заўвагі, — але і сапраўднае задавальненне ад убачанага, у прыватнасці, ад імідж-давай эстэтыкі бібліятэчнай прасторы.

Кожная ўстанова мае аблічча, якое сфармавалася дзе з улікам прыярытэтнага накірунку дзейнасці ці прасторавых магчымасцей, дзе ў адпаведнасці з гісторыяй альбо месцазнаходжаннем. І разумееш, што для стварэння гэткай прыгажосці спатрэбіліся і "мазгавы штурм" метадыстаў, і густ мастака-афармляльніка, і ўменне самога бібліятэкара трапна "разгарнуць" кніжны фонд.

Як можа, напрыклад, чытач-старшакласнік Нарутавіцкай бібліятэкі прайсці міма "Чытай-хмарачоса", да якога яго прываблівае маляўнічыя "Энцыклапедычная вітрына", "Акно ў вялікую гісторыю", "Адчыненыя дзверы ў свет навукі і тэхнікі", "Святло залатой паліцы класікі", "Ліфт у дэтэктыў-клуб", "Лабірынты рамантычных гісторый". Універсальнасць экспазіцыі ў тым, што яна задавальняе разнастайныя інтарэсы маладых чытачоў і раскрывае ўсе магчымасці фондавай калекцыі.

Для маленькіх кнігалюбаў звычайная скрынка выбару кніг пераўтварылася ў "Вежу кнігазнаек". Дзеці ведаюць звычайна назву казкі, апавядання, а вось аўтара не заўсёды запамінаюць. У нашым выпадку, перш чым нырнуць у "вежу" па кніжкі гістарычнай тэматыкі, пра сяброўства, прыроду, вясёлыя гульні, іх позірк і памяць затрымліваюцца на імёнах пісьменнікаў.

Велізарная кніжная экспазіцыя інфармацыйна-дасугавага цэнтра "Калі жадаеш быць здаровай і гарманічнай асобай" вызначае прыярытэтны кірунак установы. Экалагічны куток і шыкоўны аазіс хатніх кветак больш як пяцідзесяці найменняў — улюбёнае дзецішча бібліятэкара Людмілы Хвядчэні. Берагіня кніжна-кветкавага раю прывабіла ўжо не адно пакаленне кнігалюбаў, якія вырастаюць сярод прыгажосці навыперадкі з трохметровым фікусам і ружовым кустом у квецені, ажурным смарагдава-зялёным плюшчом і велічнай манстэрай.

А вось чытачы Сялецкай сельскай бібліятэкі і яе гаспадыня Таццяна Ліннік ганарацца літаратурна-краязнаўчай гасцёўняй "Вытокі Башты", сімвалічна названай імем маленькай рачулкі. Гасцёўня раскрывае велізарны краязнаўчы патэнцыял дакументнага фонду па 619-гадовай гісторыі вёскі, прываблівае наведвальнікаў галасамі літаратараў-землякоў Алеся Разанава, Віктара Супрунчука, Міколы Арахоўскага, Восіпа Здановіча... Бібліятэчная ўстанова стала і аб'ектам турыстычнага інтарэсу.

Падчас "Літаратурных дзён-2012" Алесь Разанаў прывёз у бібліятэку, актыўным чытачом якой быў сам у 1950-я, шведскіх літаратараў і будучага нобелеўскага лаўрэата Святлану Алексіевіч. Тут пастаянна бываюць наведвальнікі аздараўленчых летнікаў, беларусазнаўцы, удзельнікі краязнаўчых клубаў, пошукавых экспедыцый. Таму што толькі тут можна ўбачыць арыгіналы дзясятка п'ес і мастацкія палотны Міколы Арахоўскага, унікальны зборнік "Народныя песні мястэчка Сялец", кнігі, падораныя літаратарамі-землякамі, даследчыя манаграфіі мясцовага краязнаўцы Мікалая Пейгана, калекцыю рэдкіх фотаздымкаў мясцовых жыхароў розных часоў.

У дзень нашых адведзін бібліятэка падзялілася цікавымі знаходкамі па гісторыі самой кніжніцы, якая сёлета адзначае 80-годдзе.

Бібліятэкар Вайцяшынскай сельскай бібліятэкі Лідзія Рудзьман праводзіць экскурсію.

Гісторыі з чамадана для чытачоў музейнай Вайцяшынскай сельскай бібліятэкі.

Балетны “Прывал...”: перайсці перавал

Штогадовыя справаздачныя канцэрты навучэнцаў Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа здаўна прыцягваюць увагу не толькі спецыялістаў, але і шырокай публікі. Не сталася выключэннем і сёлетняя вечарына “Малады балет Беларусі”. Паводле добрай традыцыі, яна прайшла на сцэне нашага Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, дзе з новага сезона мы ўбачым лепшых выпускнікоў гэтай навучальнай установы ў якасці артыстаў.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Мяжа, што аддзяляе “пакуль яшчэ” вучняў ад “сапраўдных” артыстаў, незаўважная: некаторыя з іх і цяпер удзельнічаюць у шэрагу спектакляў. У творчых прафесіях, калі вучоба перацякае ў працу па спецыяльнасці, увогуле не бывае адчування “пераходу праз перавал” — наадварот, абедзве стадыі максімальна збліжаны. А слова “прывал”, якое ў кагосьці можа асацыявацца з гэткай “вылазкай на прыроду”, паходам у час летніх канікулаў, у балеце мае абсалютна дакладнага адрасата — аднаактовы камічны “Прывал кавалерыі”.

Калісьці гэты спектакль упрыгожваў афішу тэатра, нязменна прыносячы гледачам мора пазітыву, усмешак, зачараванне прыгажосцю танцоўшчыкаў і дасканаласцю класічных па. Але ж ці справіцца моладзь?

Насамрэч, сумневаў у апошнім не было: выкладчыкі ў харэаграфічным каледжы могуць, здаецца, навучыць танцаваць нават шафу. А каб з’явілася магчымасць паставіць паўнавартасны спектакль, далучыўся спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Дэкарацыі — традыцыйныя, але вельмі стыльныя, без пылу, нафталіну, — намалявалі адораныя навучэнцы яшчэ адной профільнай установы — Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя Аляксея Глебава. Сцэнічныя строі — ад Тэатральных майстэрняў. Дый ішоў спектакль не пад фанаграму, а пад аркестр на чале з дырыжорам Іванам Касцяхіным. І хаця ў гучанні раз-пораз праслізгвалі інтанацыйныя недакладнасці ды іншыя хібы, жывое суправаджэнне надавала класічнаму балету, пастаўленаму Нінай Дзьячэнка, яшчэ большае адчуванне прэм’еры, значнай падзеі. Гэты настрой узмацняла і публіка — дасведчаная, з непасрэднай рэакцыяй на кожны ўдала выкананы складаны рух (такую, на жаль, апошнім часам сустрэнеш на балетах нячаста).

Сярод салістаў вылучалася цэнтральная пара і асабліва вельмі шчыры, з добрай палётнасцю і кранальнай натуральнасцю вярчэнняў трэцякурснік Андрэй Лагуненка. Выканаўцам характарных партый было больш складана: у іх былі такія яркія, запамінальныя папярэднікі, што пераўзыйсці іх уяўляецца немагчымым. Да таго ж, раней камічныя партыі Карнета, Ротмістра і Палкоўніка выконвалі на нашай сцэне надзвычай каларытныя салісты, вельмі адрозныя не толькі паводле свайго ўзросту, але і ўласна па росце, канстытуцыі, манерах. Цяпер гэтая “тройка”, ужо ў сілу аб’ектыўных абставінаў, паўстала гэткай больш цэласнай, але таму і крыху абязлічанай “камандай”, дзе кожны хоча быць “як усе” — так, як гэта бывае ўласціва моладзі. Чым, дарэчы, не новае прачытанне вядомай балетнай калізіі?

Але гэты спектакль, заўважым, толькі завяршаў вечарыну, першае аддзяленне ў якой склала надзвычай адметная канцэртная праграма, складзеная з рознастылявых нумароў у выкананні юных артыстаў розных курсаў і класаў — ад пачаткоўцаў да выпускнікоў. Тут было ўсё: класіка, неакласіка, народны танец (ад цыганскага і яўрэйскага да знакамітай “Лявоніхі” з харэаграфіяй Валянціна Дудкевіча), нават элементы мадэрна. Тое, што ў каледжы цяпер нароўні з класікай актыўна засвойваюць найноўшыя балетныя стылістыкі (і нават штогод робяць асобны “ўнутраны” канцэрт сучасных харэаграфічных кампазіцый), яшчэ больш сведчыць пра ўзровень падрыхтаванасці навучэнцаў да вялікай сцэны, іх гатоўнасць працаваць і складаць добрую канкурэнцыю ў любых пластычна-харэаграфічных кірунках.

Кожны нумар меў сваю адметнасць, удала знойдзеную лексіку, што ўтрымлівала ад аднаго-двух да безлічы цікавых элементаў: “Харэаграфічныя свавольствы” ўсё той жа Ніны Дзьячэнка, якая ўмее знаходзіць “новую прастату” са “сваім тварам”, кранальна гуллівы “Вальс на тысячу тактаў” Вольгі Лапо (гэты нумар некаторы час таму пачынаў своеасаблівае “балетнае прынашэнне” Валянціну Елізар’еву, узнагароджанаму медалём ЮНЕСКА “Пяць кантынентаў”), “Яўрэйскі танец” Юрыя Лапшы са “скульптурным” атачэннем застылых “фотакадраў”. А яшчэ — пастаноўкі лаўрэатаў міжнародных конкурсаў, маладых харэографаў, якія працуюць у каледжы: “Тата, або той, каго я буду чакаць заўсёды” Дзмітрыя Залескага (адзначым і вельмі эмацыйна насычанае выкананне сямікласніцы Алесі Асташонак), “Тая, што сайшла з карцін Клімта” Сяргея Мікеля (сёлетні выпускнік Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі па класе прафесара Валянціна Елізар’ева, ён меў нядаўна на яе сцэне свой першы аўтарскі вечар). Раптам падумалася: чаму ж сучасную харэаграфію такога ўзроўню мы не бачым у нашым тэатры на сталай аснове?.. Мяркую, варта пра тое падумаць усур’ёз. К

Падчас справаздачнага канцэрта. / Фота прадастаўлена Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіяй-каледжам.

Вежа кнігазнаек і чытайнебаскроб у Нарутавіцкай бібліятэцы аграгарадка.



Нашчадкі рода хлебароба Васіля Сідаравіча Барушкі каля экспазіцыі свайго продка ў Здзітаўскай бібліятэцы аграгарадка.

Заўсёды вабіць і здзіўляе госця бярозаўскай зямлі прастора Вайцяшынскай сельскай бібліятэкі, дзе кніга суседнічае з музейным экспанатам — ручніком, беларускім строем, выцінанкай, вышытай карцінай, старажытнымі лапцямі, даваеннай радыёлай. Стары чамадан з падборкай пазнавальнай літаратуры і глобусам дапамагае дзяўчынкам і хлопчыкам вандраваць па неспазнаных краінах, марах і акіянах. Хатняя этажэрка запоўнена кнігамі па дамаводстве, заслана ажурнай сурвэткай і ўпрыгожана каралямі з саломкі, выпадкова пакінутымі незнаёмкай з далёкіх стагоддзяў… Ідзе чалавек у бібліятэку, а трапляе ў атмасферу народнага музея. Дзякуй Вам, паважаная Лідзія Рудзьман, апантаная захавальніца рукачыннага хараства грамадскага музея этнаграфіі і сялянскага побыту з 15-гадовай гісторыяй, за незабыўныя сеансы бібліятэрапіі. Нават знакаміты вандроўнік-”дылетант” Юрый Жыгамонт у свой час здзівіўся багаццю прадметаў “музейнай” бібліятэкі (звыш адной тысячы хай невялікіх, але скарбаў!) і адшукаў рэдкія экспанаты для ўласнай тэлепраграмы, напрыклад, скураныя жаночыя боцікі, так званыя “румынкі”. Музей сапраўды народны (і званне пацверджана дакументальна), таму што ніводнай капейкі на набыццё экспанатаў не выдаткавана. Неабыякавыя жыхары Пескаўскага сельсавета аддаюць “сваёй Лідзе” старыя прылады сялянскай працы, адзежу, сямейныя фотаздымкі, друкаваную прадукцыю мінуўшчыны, дакументы часоў Вялікай Айчыннай вайны…

У інтэр’ер “музейнай чытальні” гарманічна ўпісаўся камп’ютар, які дапамагае бібліятэкару ствараць уласныя электронныя рэтрафотаальбомы, мультымедыяэнцыклапедыі, прэзентацыйныя “ролікі”. Зусім нядаўна Лідзія Іванаўна асвоіла яшчэ і іншую тэхнічную прыладу — касавы апарат, каб камерцыяй займацца.

Калі казаць аб прасторы вясковага жыцця ў колеры, перанесенай у фармат выставы, то раней яна ажывала, у асноўным, ручнікамі, вышыўкамі, вязанымі альбо саламянымі рэчамі. Сёння бібліятэкары і чытачы праз кнігу, часопіс, інтэрнэт асвоілі іншыя, нават “заморскія”, віды прыкладнога мастацтва і працуюць з пацеркамі, стужкамі, рознакаляровымі каменьчыкамі, птушыным пер’ем, папяровай лазой, нават абгорткамі ад цукерак. Прыемна, што сярод умельцаў шмат моладзі, чые работы з аўтарскай індывідуальнасцю, мастацкім густам, палётам фантазіі дэманструюцца на выставах у Малецкай, Светацкай, Пескаўскай, Вайцяшынскай, Першамайскай бібліятэках. Вынікі сумеснай творчасці не толькі прыдаюць эстэтычную эксклюзіўнасць кніжнай прасторы, але і знаходзяць практычнае выкарыстанне. Так у бібліятэкара Алены Бандалет самаробная падлогавая ваза з кветкамі стала святочным элементам выставы да Дня Перамогі. Яе калега Алена Літвінчук прыладзіла вясёлае сланяня-кашпо пад хатнюю кветку, казачны куфар з газетных трубачак захаваў падборку кніжак-малышак, плеценая скрынка спатрэбілася для калекцыі CD-дыскаў. І ўсё зроблена з густам.

Імідж — рэч дынамічная, увесь час патрабуе развіцця. І калі мы распавядаем грамадскасці пра ўнікальныя асаблівасці той ці іншай бібліятэкі, дык не толькі працуем над іміджам, але і пашыраем магчымасці. Здзітаўская бібліятэка абслугоўвае звыш 300 чытачоў і спрыяе сямейнаму чытанню, паколькі на тэрыторыі сельскага савета пражывае шмат маладых сем’яў, у тым ліку мнагадзетных. Дадзенай спецыялізацыяй абумоўлена афармленне візуальнай прасторы, дзе працуе інфармацыйны цэнтр “Сям’я і кніга — сусвет духоўнасці”. Толькі тут вы ўбачыце ўнікальную насценную экспазіцыю “Усе мы — радня” з дваццаці васьмі чорна-белых фотаздымкаў 1920—30-х, прысвечаную радаводу хлебароба Васіля Барушкі з трыццаццю адным спадчыннікам. Толькі ў гэтай бібліятэцы дзейнічае куток ушанавання маці “Любоў нябёсы над табой трымае”, геранямі якога сталі дзесяць аднавясковак бібліятэкара, мнагадзетнай маці Таццяны Юрковіч.

Ала ДРАГАН,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Бярозаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

Чалавек без пашпарту, які паспрыяў Багдановічу

Яшчэ стагоддзе таму знаёмства са знакамітай і паважанай асобай складана было пачаць без рэкамендацыйнага ліста. У сваю чаргу, такія лісты можна было атрымаць таксама толькі за пэўныя заслугі, праз свой аўтарытэт. У выніку будаваліся цікавыя стасункавыя ланцугі, разблытваць якія займальна і сёння.

Аліна САЎЧАНКА

Днямі кандыдат архітэктуры, дацэнт кафедры архітэктуры жылых і грамадскіх будынкаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Яўген Чырыкаў прэзентаваў у рамках выставы сваю кнігу — "Час, які спыніўся". Пісаў ён каля 20 гадоў, а прысвечана выданне дзядулю аўтара — Яўгену Мікалаевічу Чырыкаву, прадстаўніку эпохі Сярэбранага веку, літаратурную спадчыну якога савецкая ўлада старанна хавала ад публікі цягам многіх гадоў. Сёння ж "чырыкаведы" сустракаюцца і ў Маскве, і ў Чарнігаве, і ў Сімферопалі. І, канешне ж, у Мінску, бо гэты горад стаў пэўнай вехай у біяграфіі Чырыкава.

Мінск у шэрагу пераездаў

Пісьменнік, драматург, публіцыст Яўген Чырыкаў нарадзіўся ў Казані ў 1864 годзе ў сям'і адстаўнога армейскага афіцэра дваранскага паходжання. У снежні 1887 года ён першы раз арыштаваны як адзін з арганізатараў студэнцкай стачкі і высланы ў Ніжні Ноўгарад без права пражывання ва ўніверсітэцкіх гарадах. Амаль адразу ж Чырыкаў зноў трапляе ў вязніцу: ім публічна была прачытана антыманархічная "Ода імператару Аляксандру III". Па рашэнні суда малады чалавек быў высланы на 3 гады ў Царыцын, дзе ён пазнаёміўся з Аляксеем Пешкавым, што служыў там на чыгунцы. Затым Чырыкава чакае яшчэ некалькі пераездаў, арышт, вызваленне з умовай "жыць без умяшання ў палітыку" (гэтае правіла ён працягне парушаць), вяселле з будучай актрысай Валянцінай Грыгор'евай. Увесь гэты час Яўген Чырыкаў актыўна публікуецца ў газетах і часопісах, у тым ліку сталічных, са сваімі артыкуламі, вершамі, апавяданнямі, фельетонамі, аповесцямі.

У 1895 годзе сям'я накіроўваецца на шэсць гадоў у Мінск, дзе Чырыкаў атрымаў пасаду на кантролі Лібава-Роменскай чыгункі (паралельна піша раманы "Інваліды", "Чужаземцы" і іншыя). А потым зноў пераезды — у Яраслаўль, Ніжні Ноўгарад і ў 1904-м у Маскву, аб чым пісьменнік доўга марыў, затым — у Пецярбург. Працуе ваенкарам падчас першай Балканскай вайны і Першай сусветнай. З пэўнымі чаканнямі сустрэў Яўген Чырыкаў Лютаўскую рэвалюцыю, але яе наступствы былі ім асуджаны. У 1920-м сям'я Чырыкавых была вымушана пакінуць сваю радзіму: шлях пралёг спярша ў Канстанцінопаль, Сафію, а потым — у Чэхаславакію. Еўрапейскі спакой і павага з боку рускай дыяспары і чэшскіх уладаў дазволілі Яўгену Чырыкаву цалкам прысвяціць сябе творчасці: з-пад яго пяра выходзяць тры раманы "Звер з Бездані", "Мой раман. Нататкі бежанца" і "Бацькоўскі дом", а таксама каля 35 апавяданняў. Адышоў аўтар у 1932 годзе і быў з пашанаю пахаваны ў Празе.

Вярнуўся ў Беларусь… драматургам

Асобнае месца ў творчасці Яўгена Чырыкава займае драматургія. Існуе легенда, што штуршок да захаплення ёй атрымаў наш герой на спектаклі Маскоўскага мастацкага акадэмічнага тэатра "Дзядзька Ваня", седзячы ў зале разам з Чэхавым і Горкім і бачачы рэакцыю публікі на дзею. Менавіта тады, у свой кароткі візіт у Маскву з Мінску, Чырыкаў зразумеў, як прыемна бачыць свой твор увасобленым на сцэне. З 1900 года ў яго пачалі выходзіць адна за адной п'есы: "На двары ва флігелі", "Іван Міроныч", "Мужыкі"… Самай сцэнічнай, гучнай і ўдалай па праве лічыцца драма "Яўрэі". Збор матэрыялу і падрыхтоўка да напісання адбываліся ў Мінску, як і дзея самой п'есы. Максім Горкі, даўні сябра Чырыкава, адгукнуўся на тэкст наступным чынам: "… Першы раз у рускай літаратуры з'яўляецца твор, які так слаўна, трапна, дакладна выяўляе адносіны да яўрэяў. Яўген закрануў усё: і адносіны рускіх да яўрэяў і ўзаемаадносіны яўрэяў сацыял-дэмакратаў, сіяністаў, артадаксальных і асімілятараў. І ўсё гэта зроблена — добра, вельмі добра! П'еса заканчваецца трагічнай карцінай пагрому, але і без гэтага яна наўрад ці прайшла б у Расіі праз агульную цэнзуру". Нягледзячы на перашкоды з боку ўладаў, драма стала ў 1905-1906 гадах адной з самых рэпертуарных п'ес, яна ішла ў 40 гарадах, праўда, з цэнзурнымі праўкамі. Аднак поўны тэкст тэатралы маглі пачуць у Берліне на сцэне тэатра Дэ Вэстэнс", а таксама ў Злучаных Штатах Амерыкі. Самай яркай расійскай пастаноўкай была версія Усевалада Меерхольда, які не толькі паставіў драму, але і выканаў там галоўную ролю.

Гісторыя сведчыць, што распрацоўка твора так моцна захапіла Яўгена Чырыкава, што ён вымушаны быў парушаць строгія мінскія парадкі таго часу. Справа ў тым, што ён, чалавек без пашпарту, не мог жыць у гатэлі разам са сваёй жонкай. Таму ён прыходзіў да яе ўпотай, каб абмеркаваць другую, трэцюю, чацвертую дзеі п'есы. Аднойчы ім у дзверы пагрукала паліцыя: Чырыкаву давялося тлумачыць сваю сітуацыю ў самога губернатара. На шчасце, усё скончылася жартам.

"Горкаму ад Салодкага"

Знаходжанне ў Мінску хоць і было для Чырыкава вымушаным, але гэтыя гады ён правёў плённа. Чырыкаў заўсёды ўмеў заводзіць "правільныя знаёмствы". Менавіта тут ён ацаніў творчасць Лесі Украінкі (яна прыязджала ў Мінск, каб наведаць свайго каханага, аднаго з першых марксістаў на Беларусі, ужо цяжка хворага Сяргея Мяржынскага). Лічыцца, што Яўген Чырыкаў увёў Украінку ў вялікую літаратуру. Пасябраваў пісьменнік і са сваім беларускім калегам — Адамам Багдановічам. І вельмі дапамог яму ў адной справе. У 1896 годзе, пасля смерці сваёй жонкі, Адам Багдановіч вырашае пакінуць Гродна, каб перабрацца ў Ніжні Ноўгарад. Ён звярнуўся да Чырыкава з просьбай напісаць рэкамендацыйны ліст Максіму Горкаму. Ліст быў складзены з гумарам: Чырыкаў падпісаў яго "Горкаму ад Салодкага". Гэтыя некалькі радкоў Чырыкава павярнулі, як вядома, жыццё сям'і Багдановічаў і скіравалі па пэўным шляху. Адам Ягоравіч вельмі хутка ўвайшоў не толькі ў кола наўгародскай інтэлігенцыі, але і ў сям'ю Горкага, з якім яны пазней нават сталі сваякамі, бо Адам ажаніўся з роднай сястрой жонкі рускага літаратара.


Партрэт Яўгена Чырыкава аўтарства Ільі Рэпіна.

У фондах Літаратурнага музея Максіма Багдановіча захоўваецца чарнавік ліста Адама Ягоравіча да Максіма Горкага, дзе ён просіць сябра дапамагчы мінскаму рэвалюцыянеру Івану Метліну атрымаць пенсію, бо ён не мае сродкаў для існавання. Як потым высветлілі супрацоўнікі музея, Метлін з'яўляўся хросным бацькам Яўгена Чырыкава-малодшага — сына Яўгена Мікалаевіча. Таму гэты колабег стасункаў не аказаўся выпадковым ні для аднаго з удзельнікаў.

Пасля Чырыкава

Прыемна ўсведамляць, што аўтар 17-томнага збору твораў, блізкі сябра Івана Білібіна, Марыны Цвятаевай, Леаніда Андрэева, Яўген Чырыкаў з павагай ставіўся да беларускага краю. Менавіта з яго дапамогай у Мінску было заснавана Таварыства аматараў вытанчаных мастацтваў у 1899 годзе, а ў 1902 — бібліятэка імя Пушкіна, якая існуе і ў наш час.

Яшчэ адна акалічнасць: нашчадкі Чырыкава па лініі яго сына Яўгена ў пасляваенны час вярнуліся вярнуцца ў Савецкі Саюз, а калі больш дакладна — то ў Мінск. І сёння ўнук Чырыкава Яўген Яўгенавіч — адзін са старэйшых выкладчыкаў БНТУ, а яго дачка Алена Яўгенаўна Ніціеўская — намеснік дэкана архітэктурнага факультэта.

К

Алена Ніціеўская (першая злева) і Яўген Чырыкаў (другі злева) на адкрыцці мінскай выставы.

Прыжыццёвыя выданні Яўгена Чырыкава.

Яўген Чырыкаў, або Сярэбраны век у Мінску

Руслан

Мастак і літаратар Адам Глобус піша пра мастака Руслана Вашкевіча, які зусім нядаўна адзначыўся маштабным праектам "Канал "Культура" ў сталічнай галерэі "Дом карцін".

Руслан Вашкевіч рыхтуе свой праект "Культпралёт" у Віцебскай Арт-прасторы. / Фота Аліны САЎЧАНКА

Блытаніна

У жыцці шмат запамінальных выпадковасцяў. Аднойчы падобная выпадковасць здарылася ў мяне з Шаранговічам. Бег я ў майстэрню да Вашкевіча, а забег да Шаранговіча. Майстэрні Косці Шаранговіча і Руслана Вашкевіча былі ў суседніх двухпавярховых і вельмі падобных жоўтых дамках. Я бег, думаў пра нешта сваё і патрапіў у адчыненую наросхрыст майстэрню Шаранговіча. Косця быў у сподніх і падмятаў падлогу. Я ледзь не спытаў, чаму гэта Шаранговіч мяце падлогу ў Вашкевіча. Не спытаў, сумеўся і прызнаўся, што паблытаў дамкі. Кастусь прапанаваў выпіць моцнай гарбаткі. Я адмовіўся і пайшоў у майстэрню да Руслана. Даўно тое здарылася, а Косця з венікам пасярод майстэрні, асветленай цёплым вечаровым сонцам, помніцца добра, помніцца да драбніц, да пылінак, што плывуць і плывуць у слупах святла.

Запрашэнне

Хадзіў з Вовам маляваць Мінск. Шукалі пазнавальныя архітэктурныя сілуэты. Сустрэлі мастака, які запрасіў нас у сваю майстэрню на каву. Я паабяцаў, што абавязкова зайду пасля вяртання з Барселоны. Прывязу невялічкі падарунак і заскочу. За вячэрай я папрасіў Вову расказаць пра нашу сустрэчу з мастаком і пра запрашэнне на каву. Унук сказаў, што нас запрасіў мастак Ванькоўіч. Калі я засмяяўся, Вова паспрабаваў выправіць памылку і сказаў, што мы атрымалі запрашэнне ад Пашкевіча. Толькі трэцяя спроба атрымалася ўдалай, і ўсе даведаліся пра запрашэнне ад мастака Руслана Вашкевіча.

Сыс

Мастак Вашкевіч расказаў, як аднаго разу прапіў з паэтам Анатолем Сысам цэлы тыдзень. У самым пачатку таго п'янога тыдня ён падарыў Анатолю сваю карціну "Каўчэг". Працверазеўшы, Вашкевіч пайшоў да Сыса забіраць карціну. Думаў, Анатоль абурыцца і будзе перажываць з-за страты "Каўчэга". Толя не перажываў, наадварот: ён падзякаваў Руслану, што тыдзень пражыў побач з выдатнай карцінай. Каб не трапіць у падобныя варункі, я ніколі не браў у захмялелага Вашкевіча карціны. Ён іх дарыў, а я не браў, бо ведаў — працверазее, прыйдзе забіраць, і будзе няёмка абодвум. Праз тую няўтульную няёмкасць нам захочацца зноў панапівацца… І ўсё пойдзе па другому, а то і па трэцяму колу.

Легендарнасць

Мастак Вашкевіч — асоба легендарная. Ён яшчэ толькі пачынае рабіць новы праект, а пра яго ўжо гавораць, яго абмяркоўваюць і нават крытыкуюць. Напрыклад… Ходзяць чуткі, што Руслану прапанавалі зрабіць грандыёзную выставу ў Санкт-Пецярбургу. Сам Рускі музей прапанаваў! Каб зрабіць выставу ў Рускім, Руслану патрэбна трыста тысяч даляраў. У Вашкевіча такіх сродкаў пакуль што няма, таму пецярбургскія аматары сучаснага мастацтва вымушаны чакаць… У гісторыі з Рускім музеем мяне зацікавіла не праўдзівасць фактаў, а легендарнасць мастака. Пра каго іншага такога і не расказваюць, бо што расказваць, калі ў расказанае нельга паверыць.

Марачок, Цярэшка, стары трубач…

З Бабруйска ў Гродна: лёс артыста, які дакранаўся душой

“Я — одессит, я из Одессы, здрасьте”, — прыкладна так прадставіўся Яша Кімберг, вяртаючыся з фронту ў бабруйскі тэатр. Пра гэтага акцёра і педагога, майго настаўніка, і павяду сваю гаворку.

Улюбёнец у бушлаце

Вось як узгадвае гэты знамянальны момант у жыцці артыста Святлана Міхарская-Кавязіна: “Памятаю, мне было 8 гадоў у 1945-м, калі прыйшоў на сцэну бабруйскага тэатра Якаў Мікалаевіч Кімберг. У той час мы з сястрой жылі ў тэатры, і мне запомніўся бравы марачок у бушлаце. Ён увесь час жартаваў, быў лёгкі на ўздым, вельмі адкрыты. Мой тата Мікалай Кавязін, у той час — галоўны рэжысёр у Бабруйску, паставіў спектакль “Праўда добра, а шчасце лепш”, у якім працаваў Якаў Мікалаевіч. Пасля гэтага спектакля ён стаў папіным улюбёным артыстам, а ў 1947 годзе мы пераехалі ў Гродна і тата забраў Кімберга ў новы тэатр”.

Абаяльны, як сонейка

Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Тамара Мікалаева шэсць гадоў прапрацавала з Кімбергам на сцэне Гродзенскага аблдрамтэатра і з гонарам кажа пра тое, што гэта быў бліскучы артыст. “Я прыехала ў Гродна ў 1966-м годзе, а ў 1967-м Якаву Мікалаевічу Кімбергу далі званне народнага. Я бачыла яго ў спектаклі “Раскінулася мора шырока”. Гэта такая лёгкасць, рухомасць, надзвычайны голас, слых, гэта такое абаянне і дабрыня. Да акцёраў, сваіх калег у яго ніколі не было злавання — ні ў твары, ні ў вачах. Вы ж былі яго вучнем, таму павінны гэта памятаць!.. Мой муж Мікалай Аліёк прыехаў у Гродна на 2 гады раней за мяне мастаком-пастаноўшчыкам у тэатр (сем гадоў ён прапрацаваў там, а потым пайшоў у жывапіс). А характар — светлы, цудоўны. Карацей, абаяльны чалавек і выдатны акцёр! Мы ж у адным доме з ім жылі на вуліцы Крупскай — там, дзе гастраном побач з гатэлем “Нёман”. Ідзём на рэпетыцыю, а ён: “Томачка, як справы? Як Наташанька?” (Гэта мая дачка, яна зараз скульптар у Маскве). Вось і згадваеш яго як яснае сонейка. І да маладых ён ставіўся цудоўна…

— Уладзімір Мішчанчук згадвае, як сам іграў Валодзьку ў спектаклі “Трыбунал” паводле п’есы Андрэя Макаёнка, а Якаў Мікалаевіч — Цярэшку…

— Я таксама грала ў гэтым спектаклі Надзею, нявестку… Кімберг быў разнапланавы артыст, як купалаўцы Платонаў і Глебаў… Ён Леніна іграў, Карла Маркса і ў той жа час “Раскінулася мора шырока”… І так спяваў і плясаў… Такі чароўны, лёгкі, рухомы, цудоўны: і драматычны акцёр добры, і камедыйны…

— Падчас вайны ён быў мараком і распавядаў мне, як у 1945-м прыйшоў на сцэну бабруйскага тэатра і танчыў чачотку. Гэта ж трэба, каб прайшло 30 гадоў, і ў 1975-м ён мне пра гэта казаў у Гродзенскім культасветвучылішчы, а яшчэ праз трыццаць, у 2005-м, я сам, яго вучань, прыязджаю ў Бабруйск на месца Настаўніка, стаўлю “Бездань” на той сцэне, дзе ён чачотку танчыў!

— Так, гэта ўсё цудоўна. Я сама мінчанка, а прыехала ў Гродна маладой актрысай у 1966-м і адпрацавала тут 6 гадоў, атрымала званне заслужанай артысткі БССР. Толькі ўбачыўшы мяне, Кімберг сказаў: “Я зразумеў, каго гэты прыгажун (пра майго мужа тыя словы) чакаў — сваю прыгажуню, выбранніцу! Тамарка, ты ж цуд!” А які быў выдатны галоўны рэжысёр Аляксандр Струнін! Як ён давяраў маладым! Лічы, у побытавым плане быў бацькам для нас. Шмат добрых парад па жыцці даваў. Мой муж мастак з ім раіўся, і ён сапраўды шмат падказваў. Адкрытым быў, наросхрыст. Адным словам, адэсіт!

— Я памятаю вашу ролю Раксаны ў спектаклі Струніна “Сірано дэ Бержарак”…

— А ён жа даў мне сыграць Кацярыну ў “Навальніцы” Астроўскага! Мне тады было гадоў 26. І ўсе яму казалі: “Яна маладая, можа не выцягнуць!” А Кімберг (ён іграў ролю Дзікога), калі пачуў, як я чытаю маналог Кацярыны, падтрымаў, зазначыўшы Струніну: “Яна выцягне!” За гэта вельмі яму ўдзячная! І вось, у гэтым годзе — паўстагоддзя на сцэне (з 1972-га Тамара Іванаўна служыць на сцэне Купалаўскага тэатра ў Мінску). І Валодзя Мішчанчук таксама добра пайшоў пасля Гродна, ён там таксама атрымаў званне. Як і Кімберг, ён быў маім партнёрам у “Акіяне”, а таксама ў “Бездані”.



Якаў Кімберг. / Фота з архіваў Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра

Атмасфера Кімберга

А я зноў згадваю ўрокі Кімберга, народнага артыста Беларусі, у Гродзенскім культасветвучылішчы ў 1975-м. І ягоныя словы: “Сярожа! Будзь асцярожны ў рабоце з акцёрамі! З імі заўсёды патрэбныя пуга і пернік! А калі страціш ініцыятыву, дык загрызуць! Акцёры як дзеці, але гэта — сукіны дзеці!”

На апошнім Фестывалі нацыянальнай драматургіі ў Бабруйску, калі мы ехалі ў аўтобусе на радзіму Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, я размаўляў з яшчэ адным сваім настаўнікам па тэатры, дэканам тэатральнага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзімірам Мішчанчуком, які быў Кімбергу сынам не толькі ў п’есе “Трыбунал”, але і, лічы, па жыцці: “Памятаю, як нам на вяселле з Людмілай Пятроўнай (Кучарэнка) Якаў Мікалаевіч і яго жонка Ганна Купрыянаўна Панкрат падарылі абажур і радыёпрыёмнік. Яны ж былі вельмі гасцінныя. А Ганна Купрыянаўна пякла піражкі, частавала імі нас, маладых артыстаў, падкормлівала. І клопат Кімберга пра іншых мяне заўсёды ўражваў. Ён ствараў на рэпетыцыі цудоўную атмасферу, сам быў увесь час падрыхтаваны да работы, спагадлівы і добразычлівы”.

Я слухаю майстра і думаю, што, мабыць, у Гродне нехта і не памятае Кімберга, але тыя, да каго дакраналася яго душа, для каго білася яго сэрца, не забыліся на яго.

Адзіны вобраз у кіно

З сумам думаю пра тое, што герой майго аповеду зняўся ўсяго ў адной мастацкай стужцы на мінскім “Тэлефільме”. Называецца яна “Трубач ваеннага аркестра”. Тэлефаную рэжысёру-пастаноўшчыку Уладзіміру Міхарскаму. (Дзякуй Віктару Васільеву, які нас скантактаваў).

— Я, канешне, паспрабаваў некалькі акцёраў, — зазначае мой візаві. — Але Кімберг — чалавек абавязковы і адказны. Гэта роля без адзінага слова, і тое накладвала адбітак на ўвасабленне ім характару, на разуменне акцёрам прафесіі старога трубача, які з цяжкасцю развітваецца са справай усяго жыцця, але застаецца пры гэтым “у форме”. Працаваў Кімберг паслухмяна, але і свае прапановы рабіў. Ён не быў чалавекам, які адразу слепа ўсё выконваў, не, хутчэй абдумваў і выдаваў сваё рашэнне. Здымалі мы на колішняй Нямізе, а выгарадку кватэры трубача-Кімберга выбудоўвалі ў двары кінакомплексу на старой студыі. Мастаком быў Канецкі, і запомнілася, што Якаў Мікалаевіч заўсёды вельмі паважліва ставіўся да прадстаўнікоў гэтай прафесіі, размаўляў з імі, прапанаваў нават свой рэквізіт. Аператарам працаваў Уладзімір Пранько. Ведаеце, Якаў Мікалаевіч вельмі нагадваў мне майго бацьку: выпраўкай, целаскладам. І вось падчас здымак яго не стала…

— У мяне была падобная гісторыя: у 1997 годзе заканчваў у Мінску здымкі тэлепраграмы “Усе мы родам з дзяцінства”, а ў Гродне памерла маці. Але скончыў працу, і толькі потым паехаў на пахаванне...

— Дык вы з Гродна? Я некалі працаваў артыстам у тамтэйшым тэатры і бачыў Кімберга ў ролі Шмагі. А мой цесць Мікалай Кавязін быў блізкім сябрам Якава Мікалаевіча, цешча жыла ў доме на Крупскай, што выходзіць і на Савецкую плошчу.

— Гэта дом майго дзяцінства!.. Падаецца, Якаў Мікалаевіч капрызлівым акцёрам ніколі не быў. Але магу ўявіць, наколькі цяжка гралася роля менавіта бясслоўная, якія думкі, пачуцці, перажыванні апаноўвалі…

— Я вельмі добра ведаў Кімберга па Гродне, таму і запрасіў яго на гэтую ролю. Мяркую, не памыліўся…

— Вы адзіны захавалі вобраз Якава Кімберга на кінастужцы — нізкі вам за гэта паклон!

■ ■ ■

Апошнія кадры фільма. Адзінокая труба гучыць над Нямігай, але тут яе падхопліваe ваенны аркестр — унукі старога трубача. Так і вашы вучні падхапілі ваш сцяг служэння мастацтву, Якаў Мікалаевіч…

Сяргей КАРБОЎСКІ,
рэжысёр Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча

У зорку Руслана Вашкевіча шмат хто верыць, таму чуткі пра яго і бягуць паперадзе падзей.

Сюррэалізм

Займацца сюррэалізмам даволі проста. Бярэш дзве рэальныя рэчы і складаеш з іх рэч фантастычную. Бярэш галаву рыбіны, прыкладаеш да жаночага безгаловага ды бязрукага цела і атрымліваеш новы від русалкі. Кентаўры, русалкі, цмокі — вобразы ўзорнага сюррэалізму, вобразы новай рэальнасці. Каб быць паспяховым у гэтым кірунку, трэба валодаць пераканаўчым малюнкам. Пажадана, каб глядач не толькі пазнаў намаляваныя элементы, але і паверыў у натуральнасць новай канструкцыі, складзенай з гэтых элементаў. Самы лёгкі шлях у сюррэалізм — ляпіць фотакалажы. Але ў фотакалажах ён выглядае другасна і танна. Іншая справа — жывапіс, выкананы алейнымі фарбамі на льняным палатне, такі сюррэалізм усё яшчэ самы пераканаўчы. У Беларусі, як і ва ўсім свеце, заўсёды хапала сюррэалістаў і сюррэалістычных твораў мастацтва. Савіцкі і Селяшчук, Войчанка і Цэслер шмат сваіх прац зрабілі ў гэтым стылі. Ёсць сярод іх вельмі ўдалыя творы, але найлепш тутэйшы сюррэалізм выявіўся ў творчасці Руслана Вашкевіча, бо для Савіцкага і Селяшчука ён не быў асновай іх творчасці, а для Цэслера і Войчанкі карціна заўсёды саступала першынство актуальнаму плакату.

Маляванне

Мастакі падзяляюцца на два лагеры: фарбавальшчыкі і малявальшчыкі. Для фарбавальшчыкаў найгалоўнейшым у выяве з’яўляецца колер, для малявальшчыкаў — графічнасць формы. У фарбавальшчыкаў формы і абрысы вельмі прыблізныя і не вельмі дакладныя, у малявальшчыкаў колеры спрошчаныя і фарбы не перамяшаныя. Руслан Вашкевіч па прыродзе сваёй — узорны малявальшчык. Колеры на ягоных палотнах пакліканы толькі абагульніць малюнак. Часам Руслан спасылаецца на беларускае наваколле, маўляў, яно ў нас шэрае, яно ў нас малаколернае і нават манахромнае. Рацыя ў гэткіх словах Вашкевіча, безумоўна, ёсць. Але сутнасць не ў гэтым, бо можна нарадзіцца і ў сонечнай Іспаніі, як Пікаса, і застацца ўзорным малявальшчыкам, нават калі большую частку жыцця прапрацаваць у шматколернай Францыі, зноў жа як Пабла Пікаса.

Цяжкія пытанні

Руслан прыходзіў да мяне з цяжкімі пытаннямі. Можа, ён і да іншых хадзіў з такімі ж пытаннямі. Можа, некаму падобныя пытанні і цяжкімі не падаюцца. Атрымаў пытанне, адказаў абы-як і жывеш сабе далей. У мяне так лёгка не атрымліваецца. Аднаго разу Руслан абняў мяне па-сяброўску, нават па-інтэрнацку, і спытаў: “Праўда, што ў свеце мастацтва кіруюць геі?” Пытанне загнала мяне ў кут, бо я ніколі не задумваўся над тым, што ў мастацтве нехта можа па-сапраўднаму кіраваць. Хіба нехта кіраваў Ван Гогам? Кіравалі і кіруюць продажамі ягоных твораў. Ці шмат сярод гандляроў мастацтвам геяў? Ці дамінуюць яны ў галерэях? Мабыць, не... Так я Руслану і сказаў. Можна быць і шэрым, і брунатным, і вохрыстым... Другое пытанне было яшчэ цяжэйшае за першае. Мы шмат выпілі. Наша размова з Русланам выглядала гранічна шчырай і ён спытаў: “Ці магу я ўсім чыста ахвяраваць дзеля мастацтва? Ці магу я ахвяраваць часам, грашыма, жанчынамі, дзецьмі?” На гэтае пытанне я паспрабаваў адказаць пытаннем: “Ці пагражалі Руслану забойствам ягоных дзяцей?” — “Не пагражалі!” — сказаў Руслан. Чалавек не ведае, як будзе сябе паводзіць у падобным стане. Сам я на такую пагрозу адказаў падобнай пагрозай. Але ахвяраваць дзецьмі дзеля мастацтва я не стаў бы. Для мяне мастацтва — форма паводзінаў, якая не вымагае крывавых ахвяраприношэнняў. Яна вымагае працавітасці, шчырасці, разумнасці, пэўнай эратычнасці і нават пэўнай рэлігійнасці, але страшных ахвяраў не вымагае. Руслан са мной катэгарычна не пагадзіўся. Ён вырашыў ісці ў мастацтва праз ахвяры.

Паспяховасць

Паспяховасць у Руслане Вашкевічы была заўжды. Колькі яго памятаю, ён заўсёды быў упэўнены ў выключнасці сваіх праектаў, і не беспадстаўна, што важна. Цікава яшчэ і тое, што ў Руслане той паспяховасці больш чым патрэбна аднаму мастаку. Ён сваю паспяховасць спрабуе раздаваць. Збірае вакол сябе творцаў і робіць групавыя выставы. Праўда, на тых выставах Руслан застаецца верхаводам. Ён любіць выступаць салістам з вялікім хорам. Нічога кепскага ў такіх выступах няма. Можна сказаць, што выступы Руслана заўжды ўдалыя. Праўда, ён не ўлічвае, што падзяліцца творчым поспехам немагчыма. Добра дзяліцца спрытам і паспяховасцю халтуршчыка. Усе зарабілі, і праз добры заробак сталі шчаслівыя. З творчасцю інакш... Усе зрабілі, усе зрабілі добра і нават выдатна, але ўсе так і засталіся на сваіх узроўнях паспяховасці. У кожнага, як у народзе кажуць, — свая столь. У Руслана яна высокая, бо ён мае поспех.

Адам ГЛОБУС,
мастак, літаратар

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.".
(У рамках экспазіцыі дзейнічае выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.

Выставы:

■ Выстава са збору музея **"Плынь часу". Графіка з цыкла "Нашы калекцыі"**, дзе будзе прадстаўлена больш за 60 твораў 37 мастакоў Беларусі — юбіляраў 2016 года, ад 70 да 130 гадоў, — з 4 да 20 чэрвеня.
■ Выстава **"Рэпліка прыгожага"** (злепкі скульптуры, створаныя ў майстэрні-атэльле Луўра) — да 1 верасня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
■ Выстава **"Жыццё і творчасць Мельхіёра Ваньковіча"** — да 30 жніўня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Давыд-гарадоцкі роспіс"** з прыватнага збору А.М. Арлова, аднаго з першых даследчыкаў феномену "цікетак" — з 8 чэрвеня да 4 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выставы:

■ Выставачны праект **"Гандаль Беларусі на шалях гісторыі"** — да 1 чэрвеня.
■ Выстава **"Баявыя нагалоўі засцерагальнага ўзбраення і харугвы беларускіх зямель XI — XVII стст."** — да 10 чэрвеня.
■ Інавацыйны выставачны праект 3D карцін **"Ілюзорыум"** — да 3 ліпеня.
■ Выстава **"ЭКСПІРЫмЕНТуС"** — экспазіцыя незвычайных прыбораў і прылад — да 3 ліпеня.
■ Выстава фотамастачкі Марыны Бацюковай **"Сула. Непарыўнае"** — да 11 верасня (у дворыку музея).
■ Фотавыстава **"Палацы і замкі Латвіі"** — да 19 чэрвеня.
■ Персанальная выстава шведскай мастачкі Людмілы Хрысцесевай **«Sustainidentity»** — да 3 ліпеня.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".
■ Інтэрактыўная выстава **"Вар'яцкая лабараторыя"** — да 3 ліпеня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Выстава твораў Алісы Папунідзі **"Чароўныя сны Алісы"** — да 28 чэрвеня.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

■ Выстава **"Лукамор'е"** (фігуры, якія рухаюцца) — да 1 ліпеня.
■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 5 верасня.
■ Незвычайны атракцыён **"Стужкавы лабірынт"** — да 31 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."
■ Выстава **"Беларускія землі на геаграфічных картах XVI — пач. XXI стст.".**

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выстава:

■ Выстава **"Аўтамабіль на далоні"**.
■ Выстава дзіцячай творчасці **"Свет вакол нас"** навучэнцаў школы ранняга развіцця "Бураціна" — да 12 чэрвеня.

У рамках выставы — майстар-класы па бісерапляценні, шыццю з фетру, лепцы з пластыліну.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
■ Выстава **"Таямніцы часу XVIII-XIX стст."** (гадзіннікі ў інтэр'еры) — да 5 чэрвеня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
сер. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Сляды вайны..."** (збор прадметаў ваеннага абмундзіравання і амуніцыі з фондавых калекцый музея і ўзоры рарытэтнай тэхнікі з унікальнай калекцыі Аляксея Цікунова) — да 18 ліпеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Археалагічныя знаходкі палаца вялікіх князёў літоўскіх. Штодзённасць Віленскага двара"** з фондаў Музея-палаца вялікіх князёў літоўскіх (Вільня) — да 11 верасня.
■ Выстава **"Гарады і мястэчкі Беларусі на паштоўках пачатку XX ст."** — да 12 чэрвеня.

Ратуша

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Уецца веер акрылены"** — да 5 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
■ Стацыянарная выстава **"У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа"**.
■ У дні летніх канікул музей запрашае на праграму культурна-адукацыйных мерапрыемстваў **"Канікулы ў Доме Коласа"** (па папярэднім запісе).

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
■ Выстава **"Ісці супольна праз усё жыццё"** (да 100-гадовага юбілею вянчання Янкі Купалы і Уладзіславы Станкевіч) — да 18 чэрвеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**
■ Выстава малюнка **"Дзіўны свет Паліны Касцюкевіч"** (прадстаўлена больш за 50 малюнкаў адной з вучаніц Маргарыты Шчамялёвай) — да 19 чэрвеня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку СССР і Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ Рэканструкцыя інтэр'ераў былога сядзібнага дома **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**

Выставы:

■ Выстава **"Год скульптуры"** Беларускага саюза мастакоў — да 5 чэрвеня.
■ Выстава **"9. Трыенале Польскай Графікі"** (будуць прадстаўлены каля 80 найлепшых прац конкурсу, які ўяўляе сабой цыклічны прагляд польскай сучаснай графікі) — з 8 да 30 чэрвеня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі".**

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Нараджэнне гуказапісу"** — да 9 ліпеня.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX - пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея".**
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**
■ Адкрытае захоўванне археалагічнай калекцыі музея.
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выставы:

■ Інтэрактыўная выстава з Рыміні (Італія) **"Усё жыццё ў адным ровары"** — да 6 чэрвеня.
■ Выстава жывапісных работ Вольгі Капачовай **"Гарадская архітэктура"** — да 7 ліпеня.
■ Выстава **"Скрыня Пандоры. Фантастычны свет Сяргея Парцянкова"** — да 17 ліпеня.
■ Выстава **"Ад класікі да фэнтэзі"** — да 31 ліпеня.
■ Выстава **"Паралельны свет, або Міфы пра дамавікоў і лесавікоў"** — да 31 ліпеня.

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстава:

■ **"Родны край, навек любімы"** — мастацка-адукацыйны праект, прысвечаны творчасці гомельскіх мастакоў (з фондаў музея), — да 31 ліпеня.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстава:

■ Выстава **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад

■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл".**

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Па праве Памяці"**, прысвечаная Чырвонай арміі, з фондаў музея.
■ Выстава **"Зброя для моцных духам".**

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:

■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі".**
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны".**
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ

г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл. (8-01597) 2-32-67

■ Пастаянная экспазіцыя **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.

Выставы:

■ Выстава **"Святло кухні Міцкевічаў"**.
■ Выстава **"Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.
■ Выстава **"Паўночная Італія: землятрус 2012 г."**.

НАВАГРУДСКІ ГІСТАРЫЧНА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ

г.Навагрудак, вул. Гродзенская, 2. тэл.(8-01597) 2-14-70

■ Пастаянная экспазіцыя: **"Гісторыя Навагрудчыны са старажытных часоў да Вялікай Айчыннай вайны".**

г.Навагрудак, вул.Мінская, 64-66.

■ Экспазіцыя: **"Музей яўрэйскага супраціўлення на Навагрудчыне".**

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

■ **7 — "Каханне, здрада, каварства і жарсць"** — канцэрт салісткі оперы, лаўрэата міжнароднага конкурсу Марыны Ліхашэрст.
■ **11 — "Каханне і Смерць"** (балет у 2-х дзеях) П.Бюльбюль аглы. Прэм'ерны паказ у рамках трэцяга штогадовага фестывалю **"Балетнае лета ў Вялікім".**

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

■ **6 — "Развітанцы"** (6 гісторый пра каханне; інтэрактыўны спектакль).
■ **9 — "Гісторыя двух сабак"** (спектакль для дзяцей і дарослых) Я.Конева. Пачатак аб 11-й.
■ **9 — "Гульня без правілаў і з невядомай мэтай"** А.Андрэева (прэм'ера).
■ **10 — "Два чароўныя парасоны"** Г.Х. Андэрсэна. Пачатак аб 11-й.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

■ **9, 10 — "Клеапатра"** (балет у 2-х дзеях) Г. Шайдулавай (прэм'ера).

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **4 — "Брэменскія музыкі"** (спектакль для дзяцей ад 5 год) В.Ліванава і Ю.Энціна. Пачатак аб 11-й.

Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура" звяртайцеся па тэлефоне **+ 375 17 286 07 97** і па тэлефоне/факсе **+375 17 334 57 41,** альбо пішыце на электронны адрас **kultura@tut.by!**

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстава твораў навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў Мінска **"Палітра талентаў"** — да 15 чэрвеня.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.

■ Выстава **"Таму што..."** (арт-аб'екты і інсталяцыі, створаныя беларускімі мастакамі, дызайнерамі, архітэктарамі) — да 8 чэрвеня.
■ Выстава інтэрактыўных сюжэтаў — **3D карцін** — да 28 чэрвеня.